**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**

**Кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу**

ВАСІЛЬЕВА
Вераніка Пятроўна

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-ТЭХНІЧНАЙ ШКОЛЫ Ў БССР (1920 – 1930-Я ГГ.)

Дыпломная работа

Навуковы кіраўнік:
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт Л. А. Осіпава

Дапушчана да абароны

<<___>> ____________2016 г.
Заг. кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
доктар гістарычных навук, прафесар А. Г. Каханоўскі

___________________________

Мінск, 2016 г.

# ЗМЕСТ

**Пералік умоўных абазначэнняў**……………………………………………..3
**Рэферат**……………………………………………………………………….4
**Реферат**……………………………………………………………………….5
**Abstract**……………………………………………………………………….6
**Уводзіны**……………………………………………………………………..7
**Глава 1.** Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання…..…………………12
**Глава 2.** Арганізацыя і структура прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР
**2.1.** Стварэнне заканадаўчай і матэрыяльнай базы ў галіне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі……………………………………………………………28
**2.2.** Фарміраванне кадраў прафесіянальна-тэхнічнага навучання……...…...40
**2.3.** Станаўленне структуры прафесіянальна-тэхнічнай школы……………55
**Глава 3.** Развіццё сеткі прафесіянальна-тэхнічных школ
**3.1.** Заснаванне школ фабрычна-завадскога вучнёўства і дзейнасць вучэбна-практычных майстэрняў ……..…………………………….……………………..65
**3.2.** Утварэнне прафесіянальных школ і курсаў…………..…………………72
**3.3.** Арганізацыя працы тэхнікумаў….…………………………………….78
**Заключэнне**…………………………………………………………………...87
**Спіс літаратуры і крыніц**……………………………..………………89
**Дадаткі**……………………………………………………………………104

# ПЕРАЛІК УМОЎНЫХ АБАЗНАЧЭННЯЎ

ВРТ – вячэрнія тэхнікумы.

ГПТА – Галоўпрафадукацыі – Галоўны камітэт прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

Губпрафадукацыі – Губернскі камітэт прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

КП(б)Б – Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

КСМБ – Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі.

НКА – Наркамат асветы – Народны Камісарыят асветы.

НЭП – новая эканамічная палітыка.

Прафшкола – прафесіянальная школа.

СНК – Савет Народных Камісараў.

УСНГ – Усесаюзны савет народнай гаспадаркі.

УЦВК – Усесаюзны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт.

УЦСПС – Усесаюзны цэнтральны савет прафесіянальных саюзаў.

ЦВК – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт.

Школы ФЗВ – школы фабрычна-завадскога вучнёўства.

ШУМП – школы вучнёўства масавых прафесіяў.

# РЭФЕРАТ

## Васільевай Веранікі Пятроўны

**Тэма:** Станаўленне і развіццё прафесіянальна-тэхнічнай школы ў БССР у 1920-1930-я гг.

**Ключавыя словы:** сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, Народны Камісарыят асветы, Галоўнае ўпраўленне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй, прафесіянальныя школы, тэхнікумы, школы фабрычна-завадскога вучнёўства, прафесіянальныя курсы, вучэбна-практычныя майстэрні.

**Актуальнасць.** Працэсы рэфармавання сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якія адбываюцца ў грамадстве, актуалізуюць зварот да педагагічнай думкі і досведу мінулага. Для ўдасканалення сучаснай адукацыйнай сістэмы ўяўляецца значным гісторыка-педагагічнае даследаванне, якое дазваляе асэнсаваць назапашаны вопыт, ацаніць вартасці і недахопы айчыннай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, вызначыць асноўныя этапы і перспектыўныя тэндэнцыі яе развіцця.

**Мэта дыпломнай работы** - даследаваць дзейнасць і стан прафесіянальна-тэхнічных навучальных установ, якія садзейнічалі стварэнню савецкіх кваліфікаваных кадраў. **Аб'ект работы** – адукацыйная сістэма БССР у 1920-1930-я гг., **прадмет** - прафесіянальна-тэхнічная школа БССР у 20-30-я гг. XX ст. **Метадалагічнай асновай** дыпломнай работы сталі прынцыпы аб'ектыўнасці, гістарызму, сістэмнасці і каштоўнаснага падыходу.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону**. Дзейнасць Народнага Камісарыята асветы і Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй была накіравана на рэфармаванне сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай асветы: на пашырэнне сеткі прафтэхнічных школ, ўдасканаленне педагагічнай асветы, ліквідацыю саслоўнага прынцыпу адукацыі і на стварэнне рабочай бясплатнай адукацыйнай сістэмы. Аднак, не ўсе гэтыя задачы былі рэалізаваныя ў 20-30-я гг. XX ст. Лік прафесіянальна-тэхнічных навучальных установ і вучняў у іх няўхільна рос, што спрыяла павелічэнню колькасці кваліфікаваных кадраў, неабходных для функцыянавання прамысловасці, аднак, у канцы 1930-х гг. іх колькасць так і не дасягнула неабходнай вытворчасці адзнакі. Педагагічная адукацыйная сістэма мела мэтай не толькі падрыхтоўку кваліфікаваных педкадраў для працы ў навучальных установах розных тыпаў, але і выхаванне рабочых савецкага тыпу. Для значнай часткі насельніцтва адукацыя была платнай, прынцыпы сацыяльнага адбору і сістэма льгот для рабоча-сялянскіх колаў зачынялі дарогу да прафесіянальна-тэхнічнай і педагагічнай адукацыі прадстаўнікам іншых сацыяльных груп.

**Структура і аб'ём дыпломнай работы**. Дыпломная работа складаецца з уводзінаў, трох главаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і літаратуры, дадаткаў. Агульны аб'ём работы – 88 старонак. З іх: спіс крыніц і літаратуры - 15 (169 найменняў), рэферат на беларускай, рускай і англійскай мовах - 3, дадаткі - 7 старонак.

# РЕФЕРАТ
## Васильевой Вероники Петровны

**Тема:** Становление и развитие профессионально-технической школы в БССР в 1920-30-е гг.

**Ключевые слова:** система профессионально-технического образования, Народный Комиссариат образования, Главное управление профессионально-техническим образованием, профессиональные школы, техникумы, школы фабрично-заводского ученичества, профессиональные курсы, учебно-практические мастерские.

**Актуальность.** Происходящие в обществе процессы реформирования системы профессионально-технического образования актуализируют обращение к педагогической мысли и опыту прошлого. Для совершенствования современной образовательной системы представляется значимым историко-педагогическое исследование, позволяющее осмыслить накопленный опыт, оценить достоинства и недостатки отечественного профессионально-технического образования, определить основные этапы и перспективные тенденции его развития.

**Цель дипломной работы** — исследовать деятельность и состояние профессионально-технических учебных заведений, которые способствовали созданию советских квалифицированных кадров. **Объект работы** — государственная политика в области профессионально-технического образования в БССР в 1920-1930-е гг., **предмет** — профессионально-техническая школа БССР в 20-30-е гг. XX в. **Методологической основой** дипломной работы стали принципы объективности, историзма, системности и ценностного подхода.

**Основные положения, выносимые на защиту**. Основным направлением преобразований в области советского просвещения была ликвидация сословного принципа образования и создание рабочей бесплатной образовательной системы. Однако, в своем большинстве эти задачи не были реализованы в 20-30-е гг. XX в. Между отдельными звеньями образовательной системы существовал разрыв, работали тупиковые учебные заведения. Для значительной части населения образование было платным, принципы социального отбора и система льгот для рабоче-крестьянских кругов закрывали дорогу к профессионально-техническому образованию представителям других социальных групп. Число профессионально-технических учебных учреждений и учащихся в них неуклонно росло, что способствовало увеличению числа квалифицированных кадров, необходимых для функционирования промышленности. Хотя за 1920-30-е гг. их численность так и не достигла необходимой отметки.

**Структура и объем дипломной работы.** Дипломная работа состоит из введения, трёх глав, заключения, списка использованных источников и литературы, приложений. Общий объем работы — 88 страниц. Из них: список источников и литературы — 15 (169 наименований), реферат на белорусском, русском и английском языках— 3, приложения — 7 страниц.

# ABSTRACT

**Veranika Petrovna Vasilyeva**

**Subject:** Formation and development of vocational and technical schools in the Byelorussian SSR in 1920-30-ies.

**Key words:** the system of vocational education, the People's Commissariat of Education, General Directorate of vocational education, professional schools, technical schools, schools factory training, professional courses, training and practical workshops.

**Relevance.** Occurring in society reform process of vocational education actualize appeal to educational thought and experience of the past. To improve the current educational system seems important historical and pedagogical research, allowing the experience to comprehend, evaluate the strengths and weaknesses of the national vocational education and training, to define milestones and future trends of its development.

**The aim of the thesis** - to investigate the activity and status of vocational education institutions that contributed the creation of the Soviet of qualified personnel. **Object of work** - state policy in the Byelorussian SSR vocational education in 1920-1930-ies, **the subject** - BSSR vocational school in the 20-30-ies. Twentieth century. **The methodological basis** of the thesis became the principles of objectivity, historicism, and systematic value approach.

**The main provisions for the defense**. The activities of the People's Commissariat of Education and the Main Department of vocational education was aimed at reforming the vocational education system: the expansion of the network proftehnicheskim schools, improving teacher education, the elimination of caste principle of education and to create a free working of the education system. However, not all these tasks have been implemented in the 20-30-ies. Twentieth century. The number of them have grown steadily in vocational schools and students, which helped to increase the number of qualified personnel necessary for the functioning of the industry, however, at the end of the 1930s. their number has not reached the required production evaluation. Pedagogical educational system was designed to not only train qualified pedkadrav to work in educational institutions of different types, but also the education of the workers of the Soviet type. For a large part of the population education has been paid, the principles of social selection and the system of benefits for the worker and peasant communities closed road to vocational teacher education and representatives of other social groups.

**The structure and scope of the thesis**. Thesis consists of an introduction, three chapters, conclusion, list of used sources and literature, applications. The total amount of work - 87 pages. Among them: a list of sources and literature - 15 (169 items), abstract in Belarusian, Russian and English – 3, app - 7 pages.

# УВОДЗІНЫ

Працэс станаўлення прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы асветы быў доўгім і складаным. Першыя прафтэхнічныя школы ў выглядзе прафесіянальных вучылішч і рамесных школ узніклі ў сярэдзіне XIX ст. Развіццё прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў Расійскай імперыя адбывалася павольнымі тэмпамі. Фінансаванне сістэмы асветы было нязначным, у сувязі з чым прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы будаваліся толькі ў буйных прамысловых ці сельскагаспадарчых цэнтрах, такія як Мінск, Горкі, Гомель і інш. Высокая плата за навучанне і саслоўныя абмежаванні пры прыёме ў адукацыйныя ўстановы перакрывалі шлях да прафесіянальна-тэхнічнай адукацыя для большай часткі насельніцтва беларускіх губерняў, што ўваходзілі ў склад Расійскай Імперыі. У лепшы бок сітуацыя змянілася пасля Кастрычніцкага рэвалюцыі 1917 г. у сувязі з тым, што ў 1920-я гг. у Савецкай Беларусі паўстала патрэба ў новых кваліфікаваных кадрах для народнай гаспадаркі і прамысловасці. Менавіта дзякуючы пераўтварэнням, праведзеным Народным Камісарыятам асветы БССР у прафесіянальна-тэхнічнай сістэме адукацыі краіны, стала магчымым павысіць узровень адукаванасці грамадства Беларускай ССР, ахапіць прафесіянальна-тэхнічнай школай большую частку працоўнага насельніцтва, падрыхтаваць кваліфікаваныя кадры для гаспадаркі і прамысловасці БССР, а таксама рэфармаваць педагагічныя ўстановы, павысіць якасць адукацыі настаўніцтва. Такім чынам, перабудова савецкай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай асветы ў 1920-1930-я гг. была адной з пераходных прыступак да стварэння новай прафесіянальна-тэхнічнай савецкай школы, якая была пакладзена ў аснову сучаснай беларускай, бо распад СССР і абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь не прывялі да хуткай змены адукацыйнай сістэмы, пэўныя моманты старой прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы засталіся і па сённяшні дзень, таму гэтая тэма з'яўляецца актуальнай і ў наш час.

Трэба заўважыць, што савецкая прафесіянальна-тэхнічная школа перажыла не адну рэформу, прычым многія перабудовачныя пачынанні не мелі поспеху, праводзіліся без глыбокага аналізу як замежнага, так і ўласнага вопыту. Таму даследаванне гісторыі адукацыі дае магчымасць не толькі падсумаваць назапашаныя веды, але і зрабіць прагноз будучага адукацыйнай сістэмы, вылучыць найбольш перспектыўныя накірункі яе далейшага развіцця. Да таго ж, любая сістэма адукацыі выконвае сацыяльную замову і выхоўвае такога чалавека, які патрэбен дзяржаве і грамадству. Савецкая школа была праваднікам камуністычных ідэй і асноўнай сваёй задачай ставіла стварэнне сацыялістычнага грамадства. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у навучэнцаў фарміравалі пэўныя ідэалы і каштоўнасці, якія адпавядалі тагачаснаму

грамадска-палітычнаму ладу, а таму на сённяшні дзень стаіць відавочная неабходнасць іх пераасэнсавання ў адпаведнасці з сучаснай сітуацыяй у краіне.

**Тэма дыпломнай работы**: Станаўленне і развіццё прафесіянальна-тэхнічнай школы ў БССР (1920-1930-я гг.). Пытанне ўсталявання на беларускіх землях савецкай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы мела вялікае значэнне для грамадства Беларусі таго часу, бо менавіта рэфармаванне народнай адукацыі дало магчымасць атрымаць дадатковыя веды значнай частцы рабочага насельніцтва БССР, пашырыла ахоп падлеткаў і некваліфікаваных рабочых прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі, а таксама зрабіла прафесіянальна-тэхнічную адукацыю даступнай для дзяцей рабочых, сялян і беднаты, хаця так і не дамаглося паўсюднага скасавання платы за навучанне. Акрамя таго, рэформа адукацыі 1920-1930-х гг. прывяла да ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі: былі пераведзены на беларускую мову навучання большасць прафесіянальных школ і курсы, навучальных майстэрняў, школ фабрычна-завадской моладзі і тэхнікумаў. Таксама была зменена і сістэма педагагічнай асветы, што прывяло да павышэння якасці адукацыі і ўзроўню ведаў настаўнікаў і выкладчыкаў, праўда, праблема недахопу кваліфікаваных кадраў так вырашана і не была.

**Мэта дыпломнага праекту** – прааналізаваць змены, якія адбыліся з прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі, іх праграмамі і зместам навучання, даследаваць дзейнасць і стан прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, якія садзейнічалі стварэнню савецкіх кваліфікаваных кадраў.

Для дасягнення пастаўленай мэты трэба выканаць наступныя задачы:

- прасачыць за развіццём гістарычнай думкі вакол пытання рэфармавання прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі ў БССР у 1920-1930-я гг.;
- прааналізаваць дзейнасць Савет Народных Камісараў БССР, Народнага Камісарыята асветы і Галоўнага ўпраўлення прафесіянальнай адукацыяй, накіраваную на стварэнне новай савецкай прафесіянальна-тэхнічнай школы, разгледзець дэкрэты і пастановы, якія яны прымалі;
- раскрыць дзейнасць савецкіх педагагічных устаноў, якія рыхтавалі выкладчыкаў прафесіянальна-тэхнічных школ, пазначыць станоўчыя і адмоўныя рысы ў сістэме падрыхтоўкі педагогаў;
- вызначыць удзел настаўнікаў у грамадска-палітычным і культурным жыцці рэспублікі, яго ролю ў будаўніцтве новага грамадства;
- ахарактарызаваць працэс рэфармавання старых і пабудовы новых прафесіянальных школ і курсаў, навучальных майстэрняў, школ

фабрычна-завадскога вучнёўства і тэхнікумаў, ацаніць іх дзейнасць, матэрыяльны стан, а таксама ўзровень забеспячэння і адукаванасці іх навучэнцаў;
- высветліць колькасць і месцазнаходжанне прафесіянальна-тэхнічных устаноў, дынаміку іх узнікнення, вызначыць сацыяльны і нацыянальны склад навучэнцаў;

**Храналагічныя рамкі даследавання** ахопліваюць перыяд ад 1920 да 1939 г. У гэты час пачала закладацца новая савецкая грамадска-палітычная сістэма, якая ставіла сваёй мэтай пабудову новага рабочага чалавека. Як прафесіянальнаму навучанню, так і ідэалагічнаму выхаванню савецкіх рабочых павінны былі паспрыяць прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, у якія выхоўвалі савецкія кваліфікаваныя кадры, а таксама савецкае настаўніцтва, якое атрымала адукацыю ў савецкіх педагагічных установах і ўсім было "абавязанае" новай бальшавіцкай уладзе.

Асновай дадзенага даследавання з’яўляецца комплекс крыніц, якія асвятляюць недастаткова вывучаныя аспекты дзейнасці сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, таму дыпломны праект мае навуковую навізну, у прыватнасці ў ім:
- выяўлены перадумовы зараджэння савецкай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР;
- прааналізавана ўрадавая палітыка ў галіне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі;
- класіфікаваны прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы БССР;
- удакладнены дадзеныя па іх колькасці і месцазнаходжанні;
- адноўлена карціна вучэбнага працэсу савецкіх прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў.

Атрыманыя звесткі можна выкарыстоўваць непасрэдна для вывучэння гісторыі Беларусі навейшага часу, для напісання навуковых работ па дадзенай тэматыцы. Акрамя гэтага, тэкст дыпломнага праекту можа быць падмуркам комплекснага аналізу і параўнання тагачаснай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі з сучасным яе станам з мэтай больш рацыянальнага рэфармавання сучаснай прафесіянальна-тэхнічнай школы.

Дыпломная работа складаецца з уводзінаў, 3 асноўных частак, заключэння, спіса літаратуры, дадаткаў. Ва ўводзінах вызначана актуальнасць тэмы, сфармуляваны прадмет і задачы даследавання, яго навуковая навізна і практычная каштоўнасць, абгрунтаваны храналагічныя рамкі, вылучаны асноўныя палажэнні дыпломнага праекту, якія выносяцца на абарону. Першая глава прысвечана працэсу назапашвання ведаў па прадмеце даследавання,

сучаснаму стану навуковай распрацоўкі тэмы. У ёй змяшчаецца характарыстыка архіўных і апублікаваных крыніц, аналізуецца ступень распрацаванасці даследавання і вызначаецца яго метадалагічная база. Другая глава падзяляецца на 3 раздзелы. У першым змешчана інфармацыя пра пабудову апарата народнай адукацыі БССР, заканадаўчыя пераўтварэнні ў галіне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, якія праводзіліся органамі савецкай улады, таксама вылучаюцца змены ў матэрыяльным стане прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў. У другім раздзеле другой главы закранаецца пытанне фарміравання педагагічных кадраў для прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, адзначаюцца якасныя змены ў матэрыяльна-бытавым жыцці настаўнікаў, а таксама падкрэсліваецца паляпшэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню савецкіх педагогаў. У трэцім раздзеле падаецца класіфікацыя навучальных устаноў, якія адносяцца да прафесіянальна-тэхнічнага сектара адукацыі. У ім утрымліваюцца дадзеныя пра колькасць і месцазнаходжанне прафесіянальных школ, вытворчых майстэрняў, школ фабрычна-завадской моладзі, прафесіянальных курсаў і тэхнікумаў, а таксама вызначаецца лік вучняў у іх, вызначаюцца асноўныя характарыстыкі навучальных устаноў, іх праграмы, тэрміны навучання. Трэцяя глава складаецца з трох раздзелаў. У першым аналізуецца праца школ фабрычна-завадскога вучнёўства і дзейнасць навучальных майстэрняў, а таксама ацэньваецца іх структура, вучэбныя праграмы, адукацыйны ўзровень вучнёўства. Паведамляецца ў раздзеле пра гісторыю стварэння і рэфармавання школ ФЗВ і майстэрняў, акцэнтуецца ўвага на пераўтварэннях, праведзеных у 1930-я гг. з мэтай удасканалення іх працы. Другі раздзел адлюстроўвае змены ў стане прафесіянальных школ і курсаў, у ім падаецца разгорнутае апісанне дзейнасці дадзеных навучальных устаноў, іх спецыфіка, вучэбныя праграмы. У трэцім раздзеле змяшчаецца апісанне работы тэхнікумаў, іх планы, правілы прыёму, праграмы. Характарызуецца іх дзейнасць, структура, падаюцца звесткі пра наяўнасць бюджэтных месцаў і суму платы за навучанне, колькасць студэнтаў, якія былі заселеныя ў інтэрнаты, і колькасць выпускнікоў і лік тэхнікаў, патрэбных для вытворчасці. У заключэнні падведзены асноўныя высновы даследавання і сфармуляваны наступныя вынікі: 1) у 1920-1930-я гг. была пабудавана новая структура прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэме, якая мела на мэце забеспячэнне кваліфікаванымі кадрамі прамысловасці і народнай гаспадаркі, чаго, праўда, да канца 1930-х гг. урад Беларускай ССР не дасягнуў; 2) у разглядаемы перыяд расла колькасць прафесіянальных навучальных устаноў і колькасць навучэнцаў іх, праводзіліся якасныя змены ў сістэме народнай асветы, што дазваляла павысіць узровень адукаванасці вучняў прафесіянальна-тэхнічнай школы; 3) у 1920-1930-я гг.

фарміравалася новая савецкая педагагічная сістэма адукацыі, якая дазволіла падрыхтаваць большую колькасць настаўнікаў, а таксама павысіла ўзровень іх адукаванасці; 4) савецкі ўрад імкнуўся да ліквідацыі саслоўнага прынцыпу адукацыі і стварэння рабочай бясплатнай школы, аднак, для значнай часткі насельніцтва адукацыя была платнай, прынцыпы сацыяльнага адбору і сістэма льгот для рабоча-сялянскіх колаў зачынялі дарогу да прафесіянальна-тэхнічнай асветы прадстаўнікам іншых сацыяльных груп; 5) савецкімі органамі прафесіянальна-тэхнічная школа выкарыстоўвалася як праваднік ідэалогіі, як выхавальнік новага савецкага чалавека. У дадатках змяшчаюцца графікі і табліцы са статыстычнымі дадзенымі па колькасці навучальных устаноў і ліку навучэнцаў у іх, складзеныя аўтарам дыпломнага праекта на падставе апублікаваных і архіўных крыніц.

# ГЛАВА 1

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Праблемы станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР у 1920-1930-я гг., дзейнасці Народнага Камісарыята асветы Беларускай ССР па пабудове новай прафесіянальна-тэхнічнай школы, стварэнні савецкіх педагагічных навучальных устаноў, пытанні зменаў у змесце і праграмах прафесіянальна-тэхнічных школ, навучання і выхавання кваліфікаваных кадраў для прамысловасці і народнай гаспадаркі прыцягваюць да сябе ўвагу шматлікіх даследчыкаў. Сучасныя навукоўцы вызначаюць як станоўчыя рысы рэфармавання тагачаснай адукацыйнай сістэмы, так і адмоўныя, тады як савецкія гісторыкі разглядаюць працэс станаўлення новай савецкай прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі толькі са станоўчага боку, у сувязі з чым на працягу дзесяцігоддзяў існавання савецкай улады праблема народнай адукацыі разглядалася вельмі аднабакова.

У вывучэнні працэса станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай школы ў Беларускай ССР у 1920-1930-я гг. у гістарыяграфіі можна вылучыць тры асноўныя этапы: першы этап – з 1920 г. да першай паловы 1950-х гг., другі – з другой паловы 1950-х да 1991 г., трэці - з 1991 г. да нашага часу.

Першы перыяд гістарыяграфіі адносіцца да часу непасрэдных пераўтварэнняў у пабудаванай савецкай прафесіянальна-тэхнічнай школе. Публікацыі, якія з’явіліся ў 1920-я - першай палове 1950-х гг., як правіла, належалі не гісторыкам-прафесіяналам, а партыйным публіцыстам, дзеячам асветы. У артыкулах і даследаваннях гэтага перыяду разглядаліся агульныя пытанні пабудовы новай савецкай школы, тэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы закранагалася толькі ў агульнаадукацыйным кантэксце, не ўздымаліся праблемы, якія сустракалі савецкі ўрад і Наркамат асветы ў працэсе перабудовы прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі. У іх выкарыстоўваюцца дакументы партыі і ўраду, статыстычныя матэрыялы, перыядычны друк, паказаны дасягненні народнай адукацыі за 20 год Савецкай улады, арганізацыя і змест навучальнага працэсу ў прафесіянальна-тэхнічных установах адукацыі. Разам з тым дадзеныя даследаванні носяць адбітак эпохі Сталіна, яны схематычныя, ідэалагізаваныя, пабудаваныя на недастаткова абгрунтаваным архіўным матэрыяле, доступ да якога ў той час быў абмежаваным.

Адной з першых навуковых прац гэтага перыяду з’яўляецца даследаванне камісара народнай асветы А. М. Платуна “За культурную рэвалюцыю” [89] прысвечаная беларусізацыі і палітэхнізацыі школы, бо

менавіта ў 20-я гг. XX ст. школьная адукацыя набывае ўсё большы прафесійны ўхіл. Таксама аўтар падводзіць вынікі культурнай рэвалюцыі, надзяляе ўвагу пытанню фарміравання кадраў народнай асветы. Акрамя таго, А. М. Платун у якасці дадатка да кнігі прыводзіць пастановы СНК, якія тычацца курса на ўсеагульнае навучанне і на ліквідацыю непісьменнасці, а таксама станаўлення сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР. Аднак агляд камісара народнай асветы з'яўляецца няпоўным і абмежаваным факталагічна, бо не закранае тыя негатыўныя з'явы, якія суправаджалі рэформу адукацыйнай сістэмы ў краіне, а толькі асвятляе яе станоўчыя бакі.

У 1925 г. пабачыла свет педагагічнай хрэстаматыя "Советская производственно-трудовая школа" [139], у якой змяшчаюцца артыкулы дзеячаў народнай асветы з аналізам стану прафесіянальна-тэхнічных устаноў, распараджэнняў урада і іх практычным ажыццяўленнем. У артыкулах падкрэсліваюцца станоўчыя вынікі перабудовы сістэмы народнай асветы, у якой адмоўныя рысы і хібы прысутнічалі толькі ў метадалагічных распрацоўках.

Н. К. Крупская ў сваёй працы "Рэканструкцыя народнай гаспадаркі і політэхнічнае навучанне" [36] акрэслівае асноўныя змены, якія адбыліся ў сістэме прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў Савецкім Саюзе пасля ўсталявання ўлады бальшавікоў, ахарактарызавала значэнне савецкіх пастаноў і дэкрэтаў, прынятых Народным Камісарыятам асветы, распавядае пра падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі і прамысловасці. Яе работа з'яўляецца папулярызатарскай і разлічана на вузкую аўдыторыю, якая непасрэдна ўдзельнічае ў рэфармаванні адукацыйнай сістэмы.

Працягам даследаванняў па гісторыі народнай адукацыі Беларусі паслярэвалюцыйнага перыяду з'яўляецца брашура міністра народнай асветы БССР П. В. Саевіча "Народное образование в БССР за 30 лет" [126], якая была апублікавана ў 1948 г. Праца ў асноўным прысвечана функцыянаванню новаўтворанай савецкай адукацыйнай сістэмы. Для публікацыі характэрна тэндэнцыйнасць адлюстроўваемых падзей, што звязана з пануючай ідэалогіяй камуністычнай партыі на тэрыторыі Беларускай ССР у разглядаемы перыяд часу.

Пачатак новаму, другому этапу ў развіцці гістарыяграфіі савецкага перыяду паклаў XX з'езд КПСС, які асудзіў культ асобы І. Сталіна і акрэсліў захады па пераадоленню яго наступстваў. У гэты перыяд пачаліся непасрэдныя даследаванні па гісторыі народнай адукацыі Беларусі паслярэвалюцыйнага перыяду, што было звязана з перыядам "адлігі", які характарызаваўся частковай дэмакратызацыяй, у тым ліку змяншэннем ціску цэнзуры.

У 1959 г. была апублікавана манаграфія Н. С. Шавельскай “Народная інтэлігенцыя Беларусі” [168], у якой ідзе гаворка не толькі пра саму дзейнасць прафесіянальна-тэхнічнай інтэлігенцыі, але і пра атрыманне ёй ведаў у прафесіянальна-тэхнічных установах у 1920-я гг. Даследчыца звяртае ўвагу на ўзровень і якасць ведаў, у першую чаргу, студэнтаў тэхнікумаў і прафесіянальных курсаў. Акрэслівае яна і іх матэрыяльны стан і забяспечанасць інтэрнатамі і стыпендыямі. Крытычна ставіцца да грамадска-палітычнай дзейнасці студэнтаў, якая часта замінала іх навучанню.

У 1960-я гг. працягвалася традыцыя напісання навуковых прац па гісторыі народнай адукацыі кіраўнікамі органаў народнай асветы. Так, у 1961 г. з’явілася грунтоўнае даследаванне “Народная асвета ў Беларускай ССР” [25]. Аўтары працы – міністр С. А. Умрэйка і намеснік міністра народнай асветы І. М. Ільюшын упершыню далі сістэматызаваны агляд гісторыі народнай адукацыі ў Беларусі, шырока выкарыстаўшы фонды архіваў, афіцыйныя дакументы і працы папярэднікаў. Іх манаграфія ўтрымлівае шмат фактaлагічнага і статыстычнага матэрыялу, што дазваляе падрабязна азнаёміцца з дзейнасцю фактычна ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі. У даследаванні вызначаецца колькасць прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, акрэсліваюцца іх вучэбныя праграмы. Закранаюць С. А. Умрэйка і І. М. Ільюшын пытанне перабудовы сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў у 1920-1930-я гг. Але, неабходна адзначыць, што публікацыя падае рэформу школьнай адукацыі даволі аднабакова, паказвае развіццё народнай адукацыі 1920-1930-х гг. як бесканфліктнае і паступовае, што не адпавядае рэчаіснасці. Таксама даследчыкі падкрэсліваюць клопат партыі і ўрада, мудрасць іх рашэнняў, якія, на самой справе, не заўсёды спрыялі эфектыўнай дзейнасці настворанай сістэмы народнай асветы.

Не страціла свайго значэння і калектыўная праца “Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі” [48], выдадзеная пад рэдакцыяй С. А. Умрэйкі. Кніга была падрыхтаваная калектывам аўтараў навукова-даследчага Інстытуту педагогікі Міністэрства асветы БССР, у ёй упершыню выкладзены сістэматычны агляд развіцця народнай асветы за перыяд з XIX ст. да 60-х гг. XX ст. Даследаванне ахоплівае перыяд стварэння савецкай пачатковай школы, закранае змены, якія адбыліся ў сістэме сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У прыватнасці ў “Нарысах” акрэсліваецца спецыфіка стварэння і функцыянавання кожнай часткі прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы, таксама пералічваюцца пастановы партыйных органаў, СНК і Народнага Камісарыята асветы БССР, якія садзейнічалі ўтварэнню новых прафесіянальна-тэхнічных школ. Акрамя таго, даследчыкі ўзнялі і пытанне педагагічнай адукацыі, як вышэйшай, так і сярэдняй, ацанілі

дзейнасць розных педагагічных навучальных устаноў. Нягледзячы на імкненне шырока асветліць тэму развіцця савецкай народнай асветы ў першыя дзесяцігоддзі савецкай улады, аўтары абапіраліся не на крыніцы, а на публікацыі сваіх папярэднікаў з Народнага камісарыята асветы. Праўда, нягледзячы небагаты фактычны матэрыял, даследаванне з'яўляецца фрагментарным, такія аспекты як матэрыяльны стан вучнёўства і настаўніцтва, вучэбныя праграмы, структура прафесіянальных навучальных устаноў, памылкі савецкіх органаў у рабоце не закранаюцца.

П. П. Сіліванчык у сваёй працы "Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919-37 гг.)" [130] акрэслівае асноўныя моманты станаўлення сістэмы народнай адукацыі, вырашэння праблемы кадраў для народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, развіцця агульнаадукацыйнай школа, вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў. Ва ўсіх гэтых працэсах гісторык бачыць станоўчы ўплыў Камуністычнай партыі Беларусі, якая садзейнічала ідэалагізацыі як прафесіянальна-тэхнічнага, так і педагагічнага вучнёўства, што адмоўна ўплывала на сам ход падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў.

Публікацыя Р. Я. Кісялёва "Школа Савецкай Беларусі" [30] паведамляе пра ўтварэнне Камісарыята Народнай асветы, яго дзейнасць, характарызуе прынятыя ім пастановы і палажэнні, ацэньвае змены ў структуры савецкіх навучальных установаў. Аўтар засяроджвае ўвагу на розных тыпах прафесіянальна-тэхнічных школ, якія былі створаны ў 1920-1930-я гг.: на прафесіянальных школах і курсах, навучальных майстэрнях, тэхнікумах, школах фабрычна-завадской моладзі. Распавядае пра спецыфіку кожнага са звёнаў прафтэхасветы, апісвае дзейнасці педагагічных устаноў, якія рыхтавалі настаўнікаў для прафтэхшкол. Нягледзячы на глыбокі аналіз структуры прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі, гэтую працу нельга лічыць дасканалай, бо Р. Я. Кісялёў не закранае праблемы, якія ўзнікалі ў працэсе рэфармавання школы, а толькі вылучае яго станоўчыя рысы.

У гэты перыяд была выдадзеная манаграфія М. Н. Абраменкі [2], якая прысвечана станаўленню і развіццю ніжэйшай прафесіянальна-тэхнічнай школе Беларусі, якая стала падмуркам прафесіянальным школам і школам фабрычна-завадской моладзі, пабудаваным у савецкі час. Узгадвае ў сваім даследаванні дарэвалюцыйную прафесіянальна-тэхнічную адукацыйную сістэму і І. Багданаў [13], параўноўвае яе з новымі прафесіянальна-тэхнічнымі ўстановамі Савецкага Саюзу, якія, на яго думку, рыхтавалі лепшых спецыялістаў, чым дарэвалюцыйныя прафесіянальныя ўстановы адукацыі.

Н. І. Красоўскі [35] у манаграфіі апісвае заснаванне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, распавядае пра асаблівасці дзейнасці аддзялення, на якім рыхтавалі будучых настаўнікаў, педагагічнага факультэта пры БДУ, які быў створаны ў 1922 г. Закранае аўтар і праблему якасці вышэйшай адукацыі, вылучае адмоўныя бакі савецкай вышэйшай адукацыйнай сістэмы. Называе Н. І. Красоўскі асобныя сярэднія навучальныя ўстановы – двухгадовыя педагагічныя вучылішчы і педагагічныя тэхнікумы, - у якіх рыхтавалі педагогаў для прафесіянальна-тэхнічных школ, якія выкладалі не толькі агульнаадукацыйныя прадметы, але і спецыяльныя.

Е. І. Фірсава ў сваёй рабоце “Осуществление в Белоруссии ленинских идей о всеобщей грамотности” [163] робіць акцэнт на атрыманні рабочымі дадатковай кваліфікацыі на прафесіянальных курсах, а таксама звяртае ўвагу на дзейнасць вячэрніх рабочых тэхнікумаў, што працавалі для студэнтаў, якія вучыліся без адрыву ад вытворчасці. Праўда, выкладзеныя ёй звесткі маюць урывачны, абмежаваны характар.

Даследаванне Н. В. Каменскай [29] асвятляе не толькі сам працэс фарміравання савецкай сістэмы адукацыі ў 1917-1920 гг., але і закранае адукацыйную сістэму, якая існавала ў дарэвалюцыйны перыяд, што дазваляе прасачыць за пераўтварэннямі, якія распачалі савецкія органы асветы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аўтар асвятліла дзейнасць Народнага Камісарыята асветы праз выдадзеныя ім пастановы і распараджэнні. Аднак, значным мінусам дадзенай праца кароткія храналагічныя рамкі і абмежаванне асветленых праблемаў, звязаных са стварэннем новай школы.

Пытанні станаўлення і развіцця савецкай адукацыйнай сістэмы знаходзяць адлюстраванне ў публікацыі “Очерки из истории и педагогической мысли народов СССР” [85], у якой змяшчаюцца нарысы па гісторыі, структуры і арганізацыі прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў розных савецкіх рэспублік, у тым ліку Беларускай ССР перыяду з 1917 па 1941 гг. Сама праца носіць азнаямляльны характар, у ёй выкладзеныя самыя агульныя звесткі, адсутнічае аналіз.

У 1981 г. была выдадзена манаграфія Я. К. Новіка “Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917-1941 гг.)” [51]. У ёй аўтар паведамляе пра станаўленне новай сістэмы педагагічнай асветы, якая давала як сярэднюю, так і вышэйшую адукацыю. Акрамя таго, Е. Новік акрэслівае спецыфіку працы кожнай з педагагічных навучальных устаноў, падкрэслівае, што педагагічныя кадры для прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы атрымлівалі веды ў педагагічных тэхнікумах, двухгадовых інстытутах, на курсах павышэння кваліфікацыі, а таксама ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Дадзеная работа з’яўляецца досыць грунтоўнай, падрабязна

раскрывае асаблівасці працы кожнай педагагічнай установы, дае звесткі пра матэрыяльны стан настаўніцтва 1917-1939 гг.

Пытанні асветы рабочых кадраў закранае Н. В. Васілеўская [14], якая ў сваёй манаграфіі ацэньвае дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі, накіраваную на ідэалагізацыю навучальнага працэсу як у педагагічных навучальных установах, так і непасрэдна ў прафесіянальна-тэхнічнай школе, у першую чаргу тэхнікумаў, таксама характарызуе дзейнасць урада па стварэнні сеткі прафесіянальна-тэхнічных устаноў.

Шмат каштоўных звестак, вынікаў і абагульненняў па пытанню станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай школы ў БССР у 1920-1930-я гг. утрымліваецца ў доктарскіх дысертацыях С. А. Федзюкіна [162], В. С. Волкава [17], С. М. Сіманоўскі [131], Я. К. Новік [50], выкананых як на агульнасаюзным матэрыяле, так і асобна на дадзеных Беларускай ССР. Акрамя таго, у савецкі час адбываліся канферэнцыі [34, 109, 108], прысвечаныя праблемам прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. На іх абмяркоўваліся патрэбы прафесіянальна-тэхнічнай школы, аналізаваўся вопыт мінулага, які савецкія дзеячы імкнуліся прымяніць, выяўляліся памылковыя дзеянні і пастановы Народнага Камісарыята асветы ці яго мясцовых органаў.

Такім чынам, у савецкі час працы даследчыкаў характарызуюцца наступнымі рысамі:

- працэс стварэння савецкай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі адлюстроўваецца як неперарыўны;
- вялікая частка ўвагі надаецца асвятленню рэфармавання прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў час першай пяцігодкі, тады як вынікі другой замоўчваюцца;
- значная ўвага надаецца дзейнасці Камуністычнай партыі Беларусі, а таксама ідэйна-палітычнаму выхаванню;
- сярод памылак згадваюцца толькі недакладнасці метадычнага плану (напрыклад, лабараторна-брыгадны метад);
- не згадваецца аб палітыцы беларусізацыі і рэпрэсіях, якія закранулі як вучнёўскі і настаўніцкі склад, так і органы народнай адукацыі;

Працы савецкага перыяду не раскрывалі праблему нізкай адукацыі педагагічных кадраў, недахопу сродкаў для адчынення прафесіянальна-тэхнічных устаноў, забеспячэння дзяцей рэчамі першай неабходнасці і дастатковымі заробкамі настаўнікаў. Акрамя таго, не паказана ў працах савецкіх гісторыкаў непаслядоўнасць правядзення рэформы, злоўжыванні з боку кіраўнічых органаў рэспублікі, а таксама невыкананне савецкіх дэкрэтаў і пастановаў на месцах. Савецкія даследчыкі бачылі пераважна пазітыўныя

праявы дзейнасці як Савета народных камісараў і Камуністычнай партыі БССР, так і Народнага Камісарыята асветы, Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй, таму працы гэтага часу вызначаюцца аднабаковасцю і абмежаванасцю, бо былі напісаныя паводле марксісцка-ленінскай метадалогіі, што абмяжоўвала навуковую дзейнасць рамкамі класавага падыходу і прынцыпу партыйнасці, што прадвызначыла іх пазітыўнае стаўленне на пабудовы новай школьнай адукацыйнай сістэмы. Аднак, нягледзячы на ўсе недахопы, савецкія аўтары далі першапачатковы штуршок тэме зараджэння народнай асветы і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, праблеме перавыхавання і стварэння савецкіх кваліфікаваных кадраў.

Новы трэці этап у развіцці гістарыяграфіі звязаны з распадам Савецкага Саюзу, першымі крокамі дэмакратызацыі, раскрыццём фондаў спецсховішчаў, што паклала пачатак зменам у падыходах да прац, якія тычыліся станаўлення і фарміравання сістэмы народнай адукацыі ў 20-30-я гг. ХХ ст. Аднак, і на сённяшні дзень тэма савецкай прафесіянальна-тэхнічнай школы застаецца адкрытай, бо грунтоўных прац, якія былі бы створаны пасля распаду СССР існуе вельмі мала.

Адной з самых дасканалых прац па гісторыі савецкай педагагічнай адукацыі, а таксама фарміраванню сістэмы школьнай адукацыі 20-30-х гг. ХХ ст. з’яўляецца зборнік “Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917-1945 гг.)”. У ім, напрыклад, З. М. Ціток [165-167] у сваіх артыкулах падымае пытанні першапачатковых пераўтварэнняў у галіне народнай асветы, асвятляе дзейнасць урадавых органаў БССР па рэфармаванні сістэмы адукацыі. Трэба сказаць, што аўтар закранае праблемы, якія з’яўляліся пад час рэфармавання і ў першую чаргу тычыліся недастатковасці матэрыяльных сродкаў, што выдзяляліся з мясцовых бюджэтаў. А. В. Трухан [155, 156] у сваю чаргу апісвае пастановы партыі і ўрада аб школе, што былі прынятыя ў 30-я гг. ХХ ст., прасочвае іх выкананне мясцовымі органамі. Таксама даследчык закранае тэму станаўлення прафесіянальна-тэхнічнай школы, выяўляе перашкоды, звязаныя з недахопам сродкаў, настаўнікаў і метадалагічнага матэрыялу. У адрозненні ад савецкіх гісторыкаў З. М. Ціток і А. В. Трухан засяродзілі ўвагу на падзеях 1930-х гг., прааналізавалі дакументы, доступ да якіх быў зачынены савецкім даследчыкам.

Артыкул М. П. Абраменкі “Станаўленне і развіццё прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі” [1] адлюстроўвае змены ў сярэдняй спецыяльнай школе. Аўтар прыводзіць класіфікацыю навучальных устаноў дадзенага тыпа, іх месцазнаходжанне, а таксама піша пра змены, якія адбываліся на працягу 1920-1930-х гг. у сістэме прафесіянальна-тэхнічнага навучання, тлумачыць прычыны гэтых пераўтварэнняў. Гісторык паслядоўна апісвае працэс станаўлення

савецкай прафесіянальна-тэхнічнай школы, вызначае станоўчыя і адмоўныя рысы пераўтварэнняў, ацэньвае пастановы і дэкрэты СНК СССР, СНК БССР, Наркамата асветы і Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй, дае ім характарыстыку. Аўтар абапіраецца на грунтоўную базу крыніц, уводзіць у навуковы абарот дакументы 1920-х і 1930-х гг., што садзейнічае дастаткова разгорнутаму і крытычнаму асвятленню праблемы пабудовы савецкай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы.

Важным для раскрыцця тэмы дыпломнай работы з'яўляецца артыкул Г. Р. Сянькевіча [151]. Даследчык паведамляе не толькі пра рэформы, якія ажыццяўляў Камісарыят Народнай асветы БССР, каб дамагчыся пашырэння сеткі прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, але прыводзіць прыклады скаргаў мясцовага насельніцтва на органы мясцовай адміністрацыі, якія ўхіляліся ад выканання пастановаў Наркамата асветы ці злоўжывалі сваімі паўнамоцтвамі, таксама піша пра ўмяшальніцтва органаў праваахövы ў пытанні асветы. Артыкул Г. Р. Сянкевіча, акрамя таго, раскрывае недахопы ў арганізацыі і дзейнасці новых прафесіянальна-тэхнічных школ, што, на думку аўтара, у першую чаргу звязаны з адсутнасцю матэрыяльнай базы і кваліфікаваных педагагічных кадраў.

Цікавасць даследчыка, які займаецца пытаннем станаўлення і развіцця савецкай адукацыйнай сістэмы ў Беларускай ССР, выклікаюць артыкулы А. Г. Трубчыка [152, 153]. У іх аўтар апісвае арганізацыю і дзейнасць савецкіх працоўных школ, а таксама асвятляе тыя пераўтварэнні, якія праводзіў савецкі ўрад у сувязі з іх стварэннем, у першую чаргу ў галіне заканадаўства. Таксама даследчык падае агульныя звесткі па пытанню матэрыяльнага забеспячэння савецкіх школ, у тым ліку прафесіянальна-тэхнічных, праз асвятленне выдаткаў бюджэта Народнага Камісарыята асветы, тады як у савецкі час такія дадзеныя рэдка з'яўляліся ў публікацыях.

А. Я. Смілавіцкі [134] у сваім артыкуле “Сярэднія педагагічныя навучальныя ўстановы” распавядае пра дзейнасць, спецыфіку і вучэбныя праграмы педагагічных курсаў і тэхнікумаў, якія не толькі рыхтавалі новыя настаўніцкія кадры для выкладання агульнаадукацыйных і спецыяльных прадметаў, але і з'яўляліся самыя па сабе прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі. Артыкул хоць і невялікі па памеры, але нясе ў сябе шмат карыснай інфармацыі, якая тычыцца колькасці сярэдніх педагагічных устаноў, галоўным чынам педагагічных тэхнікумаў, у рэспубліцы, іх матэрыяльнай забяспечанасці, а таксама колькасці вучняў, якія атрымоўвалі сярэднюю педагагічную адукацыю.

Пытанне падрыхтоўкі педагагічных кадраў закрануў і М. У. Піскуноў у артыкуле з назваю “Вышэйшая педагагічнай адукацыя” [88]. Гісторык досыць

разгорнута распавёў гісторыю стварэння як самаго Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту, так і ўтварэння на ім педагагічнага факультэта. Акрамя таго, М. У. Піскуноў разглядзеў непасрэдную дзейнасць педагагічнага факультэта БДУ, вылучыў спецыяльнасці, якія можна было атрымаць, а таксама апісаў хібы навучальнага працэсу. Свае высновы аўтар абгрунтаваў, выкарыстоўваючы шырокую базу крыніц, некаторыя з якіх упершыню ім былі ўведзены ў навуковы зварот.

Спецыфіку працоўнага навучання ў прафесіянальна-тэхнічных школах акрэслівае ў сваім артыкуле М. А. Дзмітрыеў [21], таксама дае звесткі пра іх вучэбныя планы, колькасці заняткаў, працягласць навучання. Звяртае ўвагу на недахопы ў арганізацыі навучальнага працэсу прафесіянальна-тэхнічных школ, у першую чаргу звязаных з ваганнем тэрмінаў навучання, неўсталяванымі датамі пачатку і канца навучальнага году, што, на думку даследчыка, залежала не толькі ад тыпу навучальнай установы, але і ад яе месцазнаходжання і спецыфікі мясцовых умоваў.

Такія аўтары як Т. І. Баталка і П. В. Акулінскі ў сваім даследаванні “Становление белорусской национальной школы в 20-е годы XX века” [8] даюць дастаткова поўную характарыстыку новаўторанай савецкай пачатковай школы, паведамляюць пра пераўтварэнні, звязаныя з палітыкай беларусізацыі, а таксама асобна вылучаюць школы для нацыянальных меншасцяў, якія мелі іншую праграму, чым вылучаліся сярод беларускіх школ.

Манаграфія Н. В. Васілеўскай “Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме” [15] прысвечана асобам, якія былі звязаныя з адукацыйнай сістэмай і пацярпелі пад час рэпрэсіяў 1930-х гг., такім як народны камісар асветы А. В. Баліцкі, а таксама У. М. Ігнатоўскі, Я. Ю. Лёсік, В. Ю. Ластоўскі, С. М. Некрашэвіч і інш. У працы раскрываюцца лёсы гэтых асоб, таксама выкладзеныя непасрэдныя справы, паводле якіх гэтыя дзеячы асветы былі абвінавачаныя ў антысавецкай дзейнасці. Акрамя агульных біяграфічных дадзеныя даследаванне асвятляе працу дзеячоў асветы, накіраваную на пабудову новай адукацыйнай сістэмы, аўтар паказвае вялікі ўнёсак гэтых асоб у справу развіцця адукацыі, навукі і культуры.

Даследаваннямі па тэме перабудовы педагагічных навучальных установаў займаецца С. В. Снапкоўская, якая ў сваёй кнізе “Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі” [135] звярнула ўвагу на ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі ў савецкіх педагагічных установах, а таксама ахарактарызавала дзейнасць настаўніцкіх установаў для нацыянальных меншасцяў, распавяла пра іх адрозненне, змест навучання, прывяла статыстычныя дадзеныя па колькасці як педагагічных навучальных установаў з рознымі мовамі адукацыі, так і ліку

педагагічных кадраў, якія яны выпускалі. Выявіла станоўчыя і адмоўныя бакі палітыкі беларусізацыі, а таксама працэсу яе згортвання.

Праблему ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ў савецкіх навучальных установах на прыкладзе школ Віцебшчыны ўзняў А. Л. Дзянікін [22]. Яго артыкул абапіраецца на пастановы і дэкрэты органаў улады, якія ажыццяўляліся на месцах не заўсёды дакладна і своечасова.

Г. Н. Якаўлева ў артыкуле "Советская школа 1920-х гг.: традиции и новации" [169] ацаніла працэс стварэння прафесіянальных школ, падала статыстычныя звесткі, якія тычацца колькасці прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў і іх месцазнаходжання. Акрамя таго, аўтар падкрэсліла розніцу паміж дарэвалюцыйнай і савецкай прафесіянальнымі школамі, ацаніла ўнёсак Народнага Камісарыята асветы ў справу пабудовы новай адукацыйнай сістэмы.

У сваёй манаграфіі "Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі" [42] У. В. Ляхоўскі апісаў працэс пабудовы савецкіх навучальных устаноў, у тым ліку і прафесіянальна-тэхнічных як на акупаванай немцамі тэрыторыі, так і неакупаванай. Таксама даследчык распавёў пра дзейнасць Наркамата асветы ў 1917 – 1918 гг., пра тыя цяжкасці, з якімі ён сутыкаўся ў час ваеннай разрухі. Праца з'яўляецца досыць аб'ектыўнай, бо ў ёй шырока прадстаўлена база крыніц як беларускага, так і нямецкага паходжання.

Праблемамі прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР у 1920-я гг. займаецца С. У. Помазаў [97, 98], які ў сваіх артыкулах акрэслівае як гістарыяграфічную частку дадзенай тэмы, так і прыводзіць факталагічны матэрыял, які ў першую чаргу тычыцца колькасці навучальных устаноў і ліку студэнтаў у іх, сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці вучнёўства, матэрыяльнага забеспячэння прафесіянальна-тэхнічных устаноў адукацыі. Акрамя таго, даследчык ацэньвае загады і пастановы органаў дзяржаўнага кіравання, якія адносяцца да станаўлення новай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы. Праўда, С. У. Помазаў абмяжоўваецца толькі 1920-мі гг., часам адноснага дэмакратызму.

Каштоўную інфармацыю па пытанню станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай школы ў БССР у 1920-1930-я гг. змяшчаюць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, што былі абароненыя пасля распаду Савецкага Саюзу. Н. Я. Новік [52], І. М. Раманава [124], Г. А. Патачанка [87], Н. І. Куракевіч [41] у сваіх дысертацыях імкнуліся абагульніць назапашаныя веды па праблеме станаўлення савецкай прафесіянальна-тэхнічнай асветы, увесці новыя крыніцы ў навуковы зварот, крытычна падысці да ацэнкі дзейнасці прафесіянальна-тэхнічнай школы ў БССР у 1920-1930-я гг. Рост інтарэсу да пытання станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай асветы пасля 1991 г.

праяўляецца ў правядзенні канферэцый [4, 122, 123, 140], прысвечаных праблемам прафесіянальна-тэхнічнай асветы. На іх абмяркоўваюцца патрэбы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, аналізуецца савецкі вопыт.

Такім чынам, на працягу амаль стагоддзя ад Кастрычніцкай рэвалюцыі даследчыкамі была праведзеная пэўная работа па распрацоўцы пытанняў рэфармавання школьнай адукацыі, стварэння новых відаў школ, а таксама прафесіянальна-тэхнічных школ, якія дазвалялі дзецям паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы ці атрымліваць кваліфікацыю для працы на прамысловасці. Акрамя таго навукоўцамі быў назапашаны багаты фактычны матэрыял. Былі прааналізаваныя асобныя аспекты праблемы, такія як стварэнне органаў народнай асветы БССР, перабудовы агульнаадукацыйнай школы ў працоўную, а таксама правядзенне ў жыццё палітыкі беларусізацыі ў школах усіх узроўняў. Закраналіся пытанні недахопу сродкаў на адукацыю ў мясцовых бюджэтах, дрэннай прыстасаванасцю школьных памяшканняў да заняткаў, зніжэння ўзроўню адукацыі як настаўнікаў, так і школьніцтва, ідэалагізацыі школы. Па-за ўвагай даследчыкаў фактычна засталіся такія аспекты праблемы, як невыкананне органамі на месцах загадаў цэнтральнай улады, што тычыліся рэфармавання сістэмы народнай асветы, правядзення імі несанкцыянаваных з цэнтральнымі органамі дзеянняў. Некаторыя раней зробленыя вынікі ў наш час патрабуюць перагляду і пераасэнсавання.

Крыніцы па гісторыі рэфармавання народнай адукацыі падзяляюцца на дакументальныя і наратыўныя. Да дакументальных гістарычных крыніц адносяцца заканадаўчыя і статыстычныя, а таксама дакументы справаводства, а да наратыўных - мемуарная і публіцыстычная літаратура, перыядычны друк. Заканадаўчыя крыніцы апублікаваныя ў наступных зборніках: “Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах” [19], “Коммунистическая партия Белорусии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК” у першых двух тамах [32, 33], “Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа. Сборник документов. 1917 - 1973 гг.” [47], “Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам: 1917 – 1967 гг.: Сборник документов за 50 лет” [125], “Собрания законов и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства БССР” у № 15, 50 і 72 [136 - 138]. У дадзеных публікацыях прадстаўлены пастановы, палажэнні, цыркуляры як Савету Народных Камісараў Савецкага Саюза, так і непасрэдна Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, Народнага Камісарыята асветы, Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй БССР. Таксама сярод дакументаў знаходзяцца рэзалюцыі партыі і рашэнні з'ездаў саветаў і пленумаў ЦК ВКП(б). Дадзеныя дакументы накіраваныя на рэгуляванне дзейнасці прафесіянальна-тэхнічных устаноў, на кіраванне іх працаю, на ўсталяванне адной суцэльнай сістэмы прафесіянальна-

тэхнічнай асветы, у якой мясцовыя органы падпарадкоўваліся б цэнтральным, выконваючы іх загады. Заканадаўчыя крыніцы мелі непасрэднае дачыненне да працы ўсіх навучальных установ у рэспубліцы, бо менавіта паводле загадаў органаў кіравання БССР, у краіне ствараліся новыя прафшколы і курсы, адчыняліся школы фабрычна-завадскога вучнёўства і навучальныя майстэрні пры прадпрыемствах, пашыралася сетка тэхнікумаў. Менавіта паводле загадаў савецкіх органаў улады навучанне пераводзілася на нацыянальную мову, на падставе палажэнняў змяняліся змест і праца прафесіянальна-тэхнічных установ.

Трэба адзначыць, што вялікая колькасць заканадаўчых крыніцы, якія тычацца працэсу стварэння новай прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі, яшчэ не апублікаваныя і змяшчаюцца пераважна ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у 42 фондзе першым вопісе. У першую чаргу гэта справы, у якіх змяшчаюцца прававыя нарматыўныя дакументы, выдадзеныя СНК СССР [20] і БССР [99], Наркаматам асветы [93, 96] і Галоўпрафасветы БССР [90-92, 94, 95, 100, 164], якія тычыліся функцыянавання самаго Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, нармалізацыі працы прафесіянальна-тэхнічных установ, рэгулявання яе праз стварэнне саветаў школ і органаў студэнцкага самакіравання ў 1920-я гг., а таксама праз увядзенне іспытаў і прыёмных камісіяў, замацаванне розных правілаў паступлення і забеспячэнне вучняў стыпендыямі, праз паляпшэнне матэрыяльнага стану настаўніцтва, сацыяльныя забеспячэнні асоб, якія выконвалі вучэбную павіннасць і г. д. У трэцім вопісе чацвёртага фонда Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь знаходзяцца пастановы сакратарыята ЦК партыі [101], а ў першым вопісе фонда 256 – пастановы ЦВК БССР і рэзалюцыі з’ездаў прафсаюзаў [102]. Акрамя дакументаў, якія тычацца арганізацыйнага і навучальнага бакоў прафесіянальна-тэхнічнай адукацыйнай сістэмы, у гэтых архіўных крыніцах знаходзяцца пастановы партыі, члены якой распаўсюджвалі бальшавіцкую ідэалогію сярод навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных і педагагічных установ адукацыі, што значна паўплывала на спецыфіку прафесіянальна-тэхнічнай школы 1920-1930-х гг., на яе навучальныя праграмы і ўзровень кваліфікацыі.

Дакументы справаводства прадстаўлены ў зборніку “Белорусская Советская Социалистическая Республика” [11], у публікацыях “Отчет о состоянии и работе [учебных заведений] за 1922/23 учебный год” [57], “Правила приёма в учебные заведения Белоруссии” [103], “Правілы прыёму ў вучэбныя ўстановы, падпарадкаваныя Галоўпрафасветы БССР на 1926/27 навучальны год” [104], “Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, рабфакі, тэхнікумы, педагагічныя курсы і прафшколы БССР і праграмы іспытаў на 1928/29 навучальны год” [105] , а таксама ў Нацыянальным архіве Рэспублікі

Беларусь ў 42 фондзе 1 вопісе ў справах, у якіх знаходзяцца справаздачы аб стане, колькасці і месцазнаходжанні прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў [5, 23, 53 – 56, 58 - 84], пратаколы паседжанняў пры Народным камісарыяце асветы БССР [18, 119], а таксама пратаколы ўездных аддзелаў народнай адукацыі [112, 113, 117] і культаддзелаў прафсаюзаў [111], саветаў і камісій прафесіянальна-тэхнічных школ [114, 118, 120], вучэбныя планы навучальных устаноў [159 - 161], калектыўныя дамовы на ўтрыманне прафтэхнічных школ [31]. У вопісе 1 фонда 210 і вопісе 1 фонда 265 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь утрымліваецца бягучая дакументацыя Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй [26], прафсаюзаў [110, 115, 116] прафесіянальна-тэхнічных школ, таксама розных грамадскіх і культурных арганізацыяў, накіраваная на ўпраўленне асабістай і грамадскай уласнасцю.

Да статыстычных крыніц адносяцца дакументы, якія апублікаваны ў наступных зборніках: “Ітогі першай пяцігодкі” [28], “Белорусская ССР в цифрах” [12], “Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах” [15], “Культурное строительство БССР” [38], “Народное образование в БССР: сборник документов и материалов” в двух тамах [45, 46], “Статистический ежегодник” [150], “Усесаюзны школьны перапіс 1927 г.” [158], “Культурное строительство от VI к VII съезд советов” [39], “Культурное строительство СССР: 1935” [40], “Асноўныя паказчыкі выканання народнагаспадарчага плана БССР: за 1936 г.” [6], “Асноўныя паказчыкі выканання народнагаспадарчага плана БССР: за III квартал 1935 г.” [7], “Итоги выполнения второго пятилетнего плана развития народного хозяйства Союза ССР” [27], “Социалистическое строительство БССР за годы второй пятилетки” [141], “Труд в Белорусской ССР” [154]. У першую чаргу ўсе яны змяшчаюць звесткі аб колькасці адчыненых прафесіянальна-тэхнічных школ, ад колькасці навучэнцаў і педагогаў у іх. У зборніках “Белорусская ССР в цифрах”, “Народное образование в БССР: сборник документов и материалов”, “Статистический ежегодник” і “Усесаюзны школьны перапіс 1927 г.” змяшчаюцца падрабязныя звесткі як пра навучэнцаў, так і пра выкладчыкаў, праўда, толькі за 1920-я гг. Напрыклад, у іх апублікаваны дадзеныя аб сацыяльным складзе вучнёўства і настаўніцтва прафесіянальна-тэхнічных і педагагічных навучальных устаноў, аб іх партыйнай і нацыянальнай прыналежнасці. Знаходзіцца ў іх інфармацыя і пра памеры стыпендый некаторых вучняў, пра сярэднія заробкі настаўнікаў у залежнасці ад тыпу навучальнай установы і прадмету, які імі выкладаецца. Таксама ў вышэй пералічаных зборніках дакументаў распавядаецца пра кошты аплаты за навучанне, пра забеспячэнне вучняў інтэрнатамі і г. д.

Акрамя таго, для напісання дыпломнай работы былі выкарыстаныя статыстычныя крыніцы, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у фондзе 42 вопісе 1. У дадзеных справах размяшчаюцца каштарысы прафтэхшкол, тэхнікумаў, вучэбна-паказальных майстэрняў [132, 133], у іх звяртаецца ўвага на тое, сродкамі якой арганізацыі былі аплочаны выдаткі прафесіянальна-тэхнічных устаноў, і на якія патрэбы яны былі патрачаны. У некаторых дадзенага фонда справах ідзе гаворка пра недахоп тэхнікаў сярэдняй кваліфікацыі і педагогаў для забеспячэння гаспадаркі і прамысловасці рэспублікі на канец 1938 г. [127], у іншых утрымліваюцца звесткі пра стан прафесіянальна-тэхнічных устаноў [128, 143-149]. У першую чаргу ў іх падаецца інфармацыя пра месцазнаходжанне навучальных устаноў, бюджэт, колькасць вучняў і настаўнікаў, іх сацыяльны, нацыянальны і партыйны склад, забеспячэнне абсталяваннем, памяшканнямі, падручнікамі. Змяшчаюцца ў справах і прыкладныя праграмы прафесіянальна-тэхнічных школ.

У зборніку “Белорусизация: 1920-е годы: Документы и материалы” [10] апублікаваныя крыніцы перыядычнага друку: артыкулы з газет “Звязда”, “Савецкая Беларусь” “Чырвоная Полаччына”, прысвечаныя працэсам беларусізацыі, зменам у правапісе. На старонках гэтых газет асвятляліся грамадска-палітычныя і культурныя падзеі, звязаныя з пранікненнем беларускай мовы ў штодзённае жыццё грамадства: ад правядзення сустрэч з літаратарамі да судовых працэсаў над дзеячамі культуры. Акрамя таго крыніцы перыядычнага друку знаходзяцца ў апублікаваным зборніку “Вестник Народного комиссариата просвещения ССРБ” [16]. У ім змяшчаюцца артыкулы аднаіменнай газеты, у якой друкавалі артыкулы дзеячы асветы, каб заахвоціць падлеткаў паступаць у прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы ці звярнуць увагу на пэўныя недахопы ў сістэме прафтэхнічнай асветы.

Мемуары М. Улашчыка [157], Л. Крывічаніна (Л. Савёнка) і А. Змагара (А. Яцэвіча) [37] распавядаюць пра працэсы правядзення палітыкі беларусізацыі і яе згортвання, пра ўласнае навучанне ў школе ў 1920-я гг., пра стаўленне грамадства да працэсаў увядзення беларускай мовы ў штодзённае жыццё. Акрамя таго, аўтары мемуараў шукаюць прычыны згортвання беларусізацыі, аналізуюць сваё стаўленне да падзей 1920-1930-х гг.

Да крыніц публіцыстычнага паходжання адносяцца такія публікацыі, як “Ад рабочага тэхнікума да палітэхнікума” [3], “Ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасці” [86], “Праца і адукацыя рабочай моладзі” [106], у якіх у папулярызатарскай манеры выкладзены асноўныя дасягненні савецкай адукацыйнай сістэмы, у тым ліку прафесіянальна-тэхнічнай, з мэтай заклікаць большую колькасць вучнёўства ў навучальныя ўстановы, пра якія згадваецца ў публікацыях.

Такім чынам, існуе грунтоўная база крыніц, на падставе якіх можна вывучаць праблемы рэфармавання сістэмы адукацыі БССР у акрэслены перыяд. Асноўнымі крыніцамі курсавой работы з’яўляюцца пастановы СНК БССР і Народнага Камісарыята асветы, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Менавіта яны дазваляюць стварыць найбольш аб'ектыўную карціну развіцця сістэмы народнай адукацыі ў БССР.

Тэарэтычнай асновай дыпломнай работы з’яўляюцца навуковыя прынцыпы і метады гістарычнага даследавання – гістарызм, аб’ектыўнасць, сістэмнасць, параўнальны аналіз. Прынцып гістарызму, які дае магчымасць вывучыць любую з’яву з моманту ўзнікнення і праслядзіць увесь працэс яго развіцця ў гістарычнай рэтраспектыве, і аб’ектыўнасці, які прадугледжвае апору на факты ў іх праўдзівым змесце, не скажоным і не падагнаным пад схему.

У дыпломным праекце былі выкарыстаны традыцыйныя метады гістарычнага даследвання: гісторыка-генетычны і гістарыка-сістэмны. Прымяненне гісторыка-генетычнага метаду і праблемна-храналагічнага прынцыпу дазволіла вывучыць праблему ў развіцці, цеснай сувязі з іншымі сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі працэсамі. Гісторыка-сістэмны метад, які дазваляе праводзіць сінтэз сістэмных элементаў, якія змяшчаюцца ў індывідуальных і ўнікальных гістарычных з’явах, дазваляе прасачыць палітыку савецкага ўраду адносна працэсу станаўлення прафесіянальна-тэхнічнай школы на беларускіх землях у 1920-1930-я гг.

Метадалагічнай асновай дыпломнага праекту з’яўляецца дыялектычная тэорыя пазнання, прынцыпы канкрэтна-гістарычнага і комплекснага даследавання з’яў мінулага, а таксама асобныя працы айчынных даследчыкаў па гэтай праблеме. У рабоце выкарыстаныя логіка-гістарычны і параўнальны віды аналізу гістарычнай і педагагічнай літаратуры, а таксама архіўных і статыстычных дадзеных. Выкладанне атрыманых вынікаў здзяйснялася метадамі апісання, тлумачэння і супастаўлення выкарыстаных матэрыялаў. Прымяненне сістэмнага падыходу дазволіла зрабіць абагульненні і вынікі на аснове шырокага і разнастайнага фактычнага матэрыялу і многіх узаемазвязаных і ўзаемадапаўняючых дадзеных, што дало магчымасць узвысіць ступень дасканаласці атрыманых вынікаў.

Аднак, нягледзячы на шырокую навуковую і метадалагічную базы, праблема станаўлення і фарміравання прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР у 1920-1930-я гг. яшчэ недастаткова распрацавана даследчыкамі, асабліва пытанні, звязаныя з недахопамі, якія з’яўляліся ў працэсе рэфармавання школьнай адукацыі. Няма працы, якая грунтоўна разгледзела пытанне стварэння і рэфармавання савецкай прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі

ці падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі і прамысловасці. Акрамя таго, як савецкія, так і сучасныя даследчыкі аналізавалі падзеі, якія тычацца 1920-х гг., тады як 1930-я гг. большасць з іх абмінала, што, у першую чаргу звязана з адсутнасцю базы крыніц. Так, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дакументы, якія адносяцца да сістэмы асветы БССР у 1930-я гг., прадстаўлены ўсяго некалькімі справамі. Такім чынам, існуе патрэба ў дасканалым вывучэнні тэмы станаўлення і развіцця прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі ў 1920-1930-я гг., пошуку новых крыніц і ўвядзенні іх у навуковы зварот.

# ГЛАВА 2

# АРГАНІЗАЦЫЯ І СТРУКТУРА ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БССР

## 2.1. Стварэнне заканадаўчай і матэрыяльнай базы ў галіне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі

Станаўленне прафесіянальна-тэхнічнай савецкай сістэмы адукацыі ў БССР адбывалася ва ўмовах, калі ў рэспубліцы панавалі гаспадарчая разруха, голад, эпідэміі. Замежная ваенная інтэрвенцыя і грамадзянская вайна нанеслі гаспадарцы велізарныя страты: прамысловасць была разбураная, сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад, школам і навучальным установам не хапала памяшканняў, навучальнай літаратуры, не было ні грошай, ні патрэбнай колькасці кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў.

У гэтых умовах 9 лістапада 1917 г. быў падпісаны дэкрэт УЦВК і СНК “Аб заснаванні дзяржаўнай Камісіі па асвеце”, якой даручалася справа агульнага кіравання і распрацоўка законапраектаў для патрэб народнай адукацыі. У гэты ж час быў прыняты і зварот да насельніцтва, у якім былі выкладзены асновы палітыкі савецкай улады ў сферы адукацыі. У звароце гаварылася, што ў аснову выхавання і адукацыі, будуць пакладзены самыя перадавыя педагагічныя прынцыпы супрацоўніцтва педагогаў і сіл грамадства, што павінна з'явіцца асновай работы па стварэнню новай сістэмы народнай адукацыі [25, с. 69].

Ужо ў канцы лістапада — пачатку снежня 1917 г. былі створаны аддзелы народнай адукацыі мясцовых саветаў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях, а 27 снежня - Камісарыят асветы Заходняй вобласці. Камісарыят кіраваўся наступнымі праграмнымі патрабаваннямі ў галіне народнай адукацыі:

- прадставіць насельніцтву права атрымліваць адукацыю на роднай мове;
- аддзяліць школу ад царквы;
- увесці бясплатную і абавязкова агульную і палітэхнічную адукацыю для ўсіх дзяцей рознага полу да 17 гадоў;
- аказаць бясплатную дапамогу навучэнцам вучэбнымі дапаможнікамі, харчаваннем і адзеннем;
- прыцягнуць шырокія колы працоўных мас да будаўніцтва новай школы [48, с. 10].

Са студзеня 1918 г. на аснове пастаноў і распараджэнняў Дзяржаўнай камісіі па асвеце пачалася ліквідацыя старых органаў кіравання школай - вучэбных акруг, у тым ліку і Віленскай акругі. Былі знішчаны старыя пасады дырэктараў і інспектараў народных вучылішчаў. Усё кіраванне пачатковымі і сярэднімі школамі перадавалася Саветам рабочых і сялянскіх дэпутатаў, пры якіх ствараліся аддзелы народнай адукацыі, камісарыяты ці культурна-асветніцкія камісіі [48, с. 10-11].

Дэкрэт СНК ад 20 студзеня 1918 г. "Аб аддзяленні школы ад царквы" катэгарычна забараняў выкладанне рэлігійных веравучэнняў ва ўсіх навучальных установах, а пастановай ад 1 снежня 1918 г. знішчалася пасада законанастаўнікаў. Бальшавікі добра разумелі, што ў справе правядзення камуністычнай ідэалогіі ў масы царква можа з'яўляцца вялікай перашкодай [95, арк. 15].

Канчаткова ўсе прынцыповыя палажэнні аб адзінай працоўнай школе былі замацаваны ў праграме Камуністычнай партыі, прынятай на VIII з'ездзе ў сакавіку 1919 г. У ёй ставілася задача "... давесці да канца пачатую Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г. справу пераўтварэння школы з прылады класавага панавання буржуазіі ў прыладу камуністычнага перараджэнне грамадства". Акрамя таго, у праграме падкрэслівалася, што школа павінна быць не толькі правадыром прынцыпаў камунізму ўвогуле, але і праваднікам ідэйнага, арганізацыйнага, выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на непралетарскія пласты працоўных мас у мэтах выхавання пакалення, здольнага канчаткова ўсталяваць камунізм [46, с. 23].

Пастановай ад 31 мая 1918 г. уводзілася сумеснае навучанне мужчын і жанчын, што ліквідавала няроўнасць паміж паламі ў сферы навучання [25, с. 70].

Вялікае значэнне меў дэкрэт ад 5 чэрвеня 1918 г. "Аб передачы ў распараджэнне Народнага камісарыята па асвеце навучальных і агульнаадукацыйных устаноў усіх ведамстваў" [46, с. 13]. Аб'яднанне ўсіх навучальных устаноў пад кіраўніцтвам Наркамата асветы забяспечвала правядзенне адзінай навукова-педагагічнай лініі, накіраванай на ўмацаванне падмурку сацыялізму, а таксама спрыяла станаўленню прынцыпу пераемнасці школьнай сістэмы на ўсіх яе ступенях.

Трэба пазначыць, што стварэнне новай савецкай школы суправаджалася жорсткім знішчэннем старой, што было вельмі распаўсюджана ў практыцы бальшавікоў. У 1917-1918 гг. у школах канфіскоўваліся кнігі, карціны, калекцыі, якія не адпавядалі задачам выхавання, былі несумяшчальныя з духам адзінай працоўнай школы [48, с. 17]. Так, з ранейшых падручнікаў 54 было зусім забаронена, як ідэалагічна варожых, выпраўлены 41 дапаможнік з

прыстасаваннем да патрэб рэарганізаванай масавай і прафесіянальна-тэхнічнай школы, і толькі 2 падручнікі былі пакінуты ў першапачатковым варыянце [89, с. 17]. Трэба сказаць, што гэты крок савецкіх уладаў прынёс падвоеную шкоду: знішчаліся выдатныя экзэмпляры школьных падручнікаў па розных прадметах і іх не было чым замяніць, бо ў дзяржаве не хапала сродкаў на выдавецтва новых кніг, таму навучальныя ўстановы, якія адчыняліся ў гэты час, заставаліся без наглядных дапаможнікаў.

Акрамя таго, ад 18 лютага 1918 г. адмянялася школьная форма, а таксама значкі, знакі і г. д. Праз некаторы час бальшавікамі была ўведзена свая школьная атрыбутыка. Такім чынам, савецкая ўлада знішчала нават знешняе падабенства дарэвалюцыйнай адукацыйнай сістэмы з новай бальшавіцкай.

Трэба заўважыць, што ажыццяўленне рэвалюцыйных пераўтварэнняў у галіне школьнай адукацыі ўскладнялася ваеннымі дзеяннямі, а таксама нямецкай акупацыяй, якой падверглася значная частка тэрыторыі Беларусі – Мінская, заходнія паветы Віцебскай і Магілёўскай губ., з мая 1919 г. Гомельскай губ. Камісарыят асветы працягваў сваю дзейнасць у Смаленску, а ў свабодных ад акупацыі паветах Віцебскай і частцы Магілёўскай губерняў працягвалася перабудова школьнай адукацыі [48, с. 11].

У час грамадзянскай вайны інтэрвенты нанеслі велізарныя страты народнай гаспадарцы рэспублікі. І без таго небагатая матэрыяльная база прафесіянальна-тэхнічных школ была амаль поўнасцю знішчаная. Будынкі многіх вучэбных устаноў былі перароблены пад салдацкія казармы, раскрадалася абсталяванне, знішчаліся вучэбныя дапаможнікі і школьны інвентар. Заняткі паўсюдна спыніліся. У маі 1918 г. немцы рэквізавалі ўсю жывёлу, якая належала Мар’інагорскаму сельскагаспадарчаму вучылішчу. У пачатку сакавіка 1919 г. на тэрыторыю рэспублікі ўварваліся польскія войскі. 8 жніўня быў захоплены Мінск, затым Слуцк, Ігумен, Нова-Барысаў, Бабруйск. У верасні палякі пачалі наступленне на Рагачоў, Жлобін, Рэчыцу. Пасля ўпартых баёў Чырвоная армія замацавалася на лініі р. Беразіна [42, с. 89-90]. У гэты час савецкія прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі ствараліся ва ўсходніх раёнах, якія не былі акупіраваны польскім войскам. Ініцыятарамі іх адкрыцця сталі мясцовыя партыйныя і савецкія органы. Так, пачалі работу Рагачоўская вучэбна-практычная майстэрня, Калачаеўскае сельскагаспадарчае вучылішча ў Клімавіцкім раёне, курсы рукадзелля ў Віцебску. Паколькі не было ніякай дакументацыі, планаў, метадычных дапаможнікаў, то заняткі вяліся па складзеных інструктарамі вытворчага навучання і выкладчыкамі планах і праграмах. Як правіла, выкладчыкамі былі людзі, якія працавалі на гэтых пасадах да рэвалюцыі [42, с. 185-188].

У верасні 1920 г. у складзе Наркамасветы БССР быў створаны аддзел прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. Хутка гэты аддзел быў пераўтвораны ў Камітэт прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, а потым у Галоўнае ўпраўленне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, якое ўваходзіла ў склад НКА БССР. Задачай гэтага органа з'яўлялася падрыхтоўка кадраў для прамысловасці, сельскай гаспадаркі, устаноў асветы, аховы здароўя, мастацтва рэспублікі [24, с. 255].

11 чэрвеня 1920 г. калегія Галоўнага камітэту прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі Наркамата асветы зацвердзіла Палажэнне аб сацыяльным забеспячэнні вучняў прафесіянальна-тэхнічных устаноў. Паводле яго ўсім навучэнцам, якія няўхільна выконвалі вучэбную павіннасць прадстаўлялася сацыяльнае забеспячэнне ў наступных памерах: па 2400 руб. у месяц вучням практычных майстэрняў у сельскай мясцовасці, а таксама курсантам, якія не працуюць на прадпрыемствах; па 3000 руб. студэнтам вячэрніх тэхнікумаў першага і другога гадоў навучання, курсантам з прадпрыемстваў, якія часова прыпынілі сваю дзейнасць, а таксама з прадпрыемстваў, якія працуюць скарочана; па 3600 руб. вучням паказальна-вытворчых майстэрняў першага году навучання; па 4200 руб. студэнтам вячэрніх тэхнікумаў трэцяга году навучання, курсантам, якія былі адкамандзіраваныя з прадпрыемстваў і вучням майстэрняў другога году навучання; па 4800 руб студэнтам вячэрніх тэхнікумаў чацвёртага году навучання. Акрамя таго, у пастанове пазначалася, што пры выкананні вучэбнай павіннасці не ў поўным аб’ёме сацыяльнае забеспячэнне памяншалася [96, арк. 21].

Увогуле пад вучэбнай павіннасцю мелася на ўвазе наведванне лекцый ці прахаджэнне адпаведных курсаў, выкананне самастойных работ і лабараторных па агульнаму плану, удзел у семінарскіх занятках, камандзіроўкі на фабрыкі і заводы і іншыя віды практыкі. Тыя ж вучні, якія прапусцілі без паважлівай прычыны звыш 283 лекцыі, практычных заняткаў і іншых абавязковых работ, атрымоўвалі 50 % сацыяльнага забеспячэння, а тыя асобы, якія прапусцілі больш за 50% вучэбнай павіннасці цалкам пазбаўляліся забеспячэння, якое, праўда, можна было вярнуць, пры ўмове выканання ўсіх патрабаванняў, пералічаных вышэй. Трэба зазначыць, што сацыяльнае забеспячэнне ў большасці сваёй натуралізавалася, то бок выдавалася ў выглядзе ўладкавання ў інтэрнат, харчавання, адзення і г. д. Пры частковай натуралізацыі студэнт прафесіянальна-тэхнічнай навучальнай установы атрымоўваў розніцу паміж коштам прадуктаў і той сумай сацыяльнага забеспячэння, на якую меў права паводле пастановы. Калі нормы аплаты сацыяльнага забеспячэння былі натуралізаваныя прадуктамі харчавання часткова, на суму не меншую за 400 руб. у месяц, то, у такім выпадку, памер сацыяльнага забеспячэння скарачаўся

на 1/3. Сродкі на сацыяльнае забеспячэнне асігнавала Галоўнае ўпраўленне прафесіянальна-тэхнічнай адукацяй праз мясцовыя органы [96, арк. 21-22]. Такім чынам, гэтай пастановай савецкі ўрад імкнуўся палепшыць складанае матэрыяльнае становішча вучнёўства, забяспечыць яго мінімумам харчавання і месцам пражывання

Пры вывучэнні сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі цікавасць прадстаўляе дэкрэт СНК ад 29 чэрвеня 1920 г. “Аб вучэбнай прафесіянальна-тэхнічнай павіннасці”, у якім гаварылася: ”У мэтах ліквідацыі тэхнічнай непісьменнасці, а таксама з прычыны вострай патрэбы ў кваліфікаванай рабочай сіле, якую перажывае наша прамысловасць, неабходнасці хутчэйшага папаўнення шэрагаў кваліфікаваных работнікаў-спецыялістаў, Савет Народных Камісараў пастанавіў: 1) усе рабочыя ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў падлягаюць вучэбнай прафесіянальна-тэхнічнай павіннасці; 2) па патрабаванні Галоўнага камітэту па прафесійна-тэхнічнай адукацыі і яго органаў Галоўны камітэт па правядзенні ўсеагульнай працоўнай павіннасці прадстаўляе ў СНК распараджэнні для навучання патрэбнай колькасці асоб з іншых слаёў насельніцтва. У тых прадпрыемствах, дзе не арганізаваныя фабрычна-завадскія школы для вучняў-падлеткаў, вучэбная павіннасць у адпаведнасці з дэкрэтам распаўсюджваецца на асобы з 14-гадовага ўзросту” [26, арк. 10]. Працоўны дзень навучэнцаў скарачаўся да шасці гадзін з захаваннем поўнай заробнай платы. Навучэнцы не прыцягваліся да выканання працоўных павіннасцяў, але пропуск заняткаў разглядаўся, як прагул па рабоце [26, арк. 10]. Дадзены дэкрэт дабра адлюстроўваў імкненне ўлады да павелічэння колькасці працоўнай сілы ў краіне. Акрамя таго, дадзены дакумент меў вялікае значэнне для развіцця прамысловасці, таму што ствараў магчымасць павялічыць колькасць кваліфікаваных работнікаў. Ажыццяўленне дэкрэту ў Беларусі знайшло адлюстраванне ў арганізацыі шэрага прафесіянальна-тэхнічных курсаў і рамесных школ, якія мелі на мэце падрыхтоўку вучняў на прадпрыемствах па выбранай вытворчай спецыяльнасці.

У аснову дзейнасці органаў прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі былі пакладзены інструкцыйна-метадычныя матэрыялы Галоўпрафадукацыі РСФСР. Для больш кваліфікаванага вырашэння актуальных задач пры Галаўным камітэце прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі БССР была створана калегія, у якую ўвайшлі прадстаўнікі саўнаргасу, наркамзема і камсамолу [1, с. 185]. Аднак, усю практычную работу па стварэнні прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў вялі мясцовыя Саветы і органы народнай адукацыі Беларусі - губернскія, павятовыя, гарадскія. Яны арганізавалі ўлік моладзі, не ахопленай агульнаадукацыйнай школай, якая жадала атрымаць вытворчую прафесію, вырашалі пытанні адкрыцця школ, прыёму ў іх навучэнцаў і

забеспячэння выкладчыкамі, зацвярджалі вучэбныя планы, кантралявалі ход навучальна-выхаваўчага працэсу [29, с. 191].

З першых дзён стварэння аддзелу прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі Народнага камісарыята асветы БССР яго супрацоўнікі ўсталявалі сувязь з паветамі з мэтай неперарыўнага атрымання звестак аб дзеючых прафесіянальна-тэхнічных установах, аб наяўнасці памяшканняў і абсталявання ў вучылішчах, якія працавалі яшчэ да рэвалюцыі. Было ўстаноўлена, што ў 1920 г., акрамя некалькіх сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, маглі працаваць Мінскае камерцыйнае вучылішча і жаночая прафесіянальная школа ніжэйшага тыпу з кравецкімі і белашвейнымі майстэрнямі. Захаваліся памяшканні і некаторае абсталяванне ў створаных яшчэ да рэвалюцыі Мар’інагорскім сельскагаспадарчым вучылішчы, Слуцкім рамесным вучылішчы, салярнай майстэрні ў Слуцкім павеце, на курсах майстроў крою і шыцця ў Дзісне [42, с. 185-86].

Значны рост колькасці навучальных устаноў прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў БССР пачаўся з 1921 г. Цікава, што гэты працэс не быў выкліканы вострай патрэбай прамысловай вытворчасці ў кваліфікаваных рабочых кадрах. Наадварот, у тыя гады назіраўся адток рабочых з прадпрыемстваў па той прычыне, што многія з апошніх не працавалі. У 1921 г. у параўнанні з 1913 г. колькасць рабочых у Беларусі знізілася з 22,7 да 13 тыс. чал. [54, с. 37-38]. Рост сеткі прафесіянальна-тэхнічных устаноў тлумачыўся галоўным чынам наяўнасцю вялікай колькасці дзяцей і падлеткаў, якія страцілі ў гады Першай сусветнай, грамадзянскай і савецка-польскай войнаў бацькоў, перапаўненнем дзіцячых дамоў, якія часта не былі ў стане падрыхтаваць сваіх выхаванцаў да працы і далейшага самастойнага жыцця.

У 1921 г. у Мінску адчыніліся школы металістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, палеграфістаў, абутковай і гарбарнай вытворчасці. Прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы адчыняліся і ў іншых гарадах, галоўным чынам там, дзе захавалася база дзеючых да рэвалюцыі прафесіянальных школ: у Слуцку - металістаў, Віцебску - металістаў, друкароў, гарбарнікаў, Магілёве - будаўнікоў, у Клімавічах - вучэбна-практычныя майстэрні [95, арк. 20]. У гэты час прафесіянальныя школы мелі дэтальна распрацаваныя вучэбныя планы і праграмы, прыстасаваныя да прамысловай вытворчасці. У матэрыяльных адносінах прафшколы пастаўленыя задавальняюча, для навучэнцаў ёсць інтэрнаты, 60 % навучэнцаў атрымоўваюць стыпендыі ў памеры 8-10 руб. у месяц. У склад вучняў прафесіянальных школ уваходзяць выключна дзеці рабочых, выхавальнікі дзіцячых дамоў і дзеці бяднейшых сялянаў. Кошт утрымання аднаго навучэнца складае 175 руб. [96, арк. 56-57].

Нягледзячы на хуткі рост сеткі прафесіянальна-тэхнічных навучальных установаў, існаваў шэраг праблем: недахоп настаўнікаў, малая колькасць вучэбных дапаможнікаў, абсталявання і г. д. Недахоп сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў, якія меліся ў распараджэнні Наркамата асветы БССР, патрабаваў упарадкавання сеткі навучальных устаноў. У сувязі з гэтым у пачатку студзеня 1922 г. было прынята рашэнне пераглядзець спіс дзеючых прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, вызначыць, якія з іх пакінуць на дзяржаўным бюджэце, а якія ўтрымліваць на бюджэце мясцовым. Каб захаваць адзіныя патрабаванні ў рабоце прафесіянальна-тэхнічных навучальных установаў, нават тыя прафесіянальна-тэхнічныя школы, якія былі знятыя з дзяржаўнага забеспячэння, заставаліся пад кантролем Галоўнага ўпраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі [95, арк. 18].

Акрамя таго, хуткі рост прафесіянальна-тэхнічных школ і прыток у іх моладзі патрабаваў выпрацоўкі дакладных правілаў прыёму навучэнцаў. У 1923 г. быў распрацаваны шэраг дакументаў Галоўпрафадукацыі БССР на падставе рашэнняў кіруючых органаў прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі РСФСР, у якіх рэгламентаваўся прыём навучэнцаў. Паводле правілаў прыёму ў тэхнікумы і прафесіянальна-тэхнічныя школы ад 22 мая 1923 г. і 13 мая 1924 г. [164, арк. 1] асноўным шляхам да паступлення ў прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы з’яўлялася камандзіроўка ў навучальную ўстанову. Правам накіроўваць падлеткаў у прафтэхшколы валодалі губернскія, абласныя і павятовыя партыйныя, камсамольская, прафесіянальныя арганізацыі, а таксама губернскія і павятовыя аддзелы народнай адукацыі. Абітурыент падаваў у навучальную ўстанову шэраг дакументаў: заяву, метрычнае пасведчанне, дакумент аб адносінах да воінскага абавязку (для грамадзянаў прызыўнога ўзросту), дакумент аб адукацыі, камандзіровачнае пасведчанне і анкету, якая павінна была завярацца камандзіруючай, партыйнай ці іншай савецкай арганізацыямі. Прадстаўнікі працоўнага сялянства замест камандзіровачнага прадстаўлялі пасведчанне валаснога выканкама і водгук валасной ячэйкі аб сацыяльным становішчы. Прыёмная камісія навучальнай установы разглядала пададзеныя заявы і ў адпаведнасці з Парадкам залічэнняў у іх праводзіла адбор. Залічэнне адбывалася ў наступнай паслядоўнасці:

1) круглыя сіроты, якія знаходзіліся на дзяржаўным утрыманні;
2) чальцы КП(б)Б і КСМБ;
3) рабочыя і іх дзеці;
4) дзеці школьных работнікаў і абслугоўваючага персаналу дадзенай навучальнай установы;
5) дзеці камандзірскага і камісарскага саставу Чырвонай арміі і флоту;
6) дзеці рэвалюцыянераў;

7) чальцы прафсаюзаў і іх дзеці [102, арк. 10-11].

Відавочна, што з дапамогай гэтай сістэмы партыйным і дзяржаўным органам удавалася ажыццяўляць кантроль над сацыяльным складам навучэнцаў адукацыйных устаноў. Варта адзначыць, што ў прафшколах, тэхнікумах і ВНУ ствараліся спецыяльныя камісіі па чыстцы, якія павінны былі выяўляць "сацыяльна чужых элементаў", якія дэзарганізавалі школьнае жыццё, на думку савецкай улады [101, арк. 19].

Па ініцыятыве камсамолу ў 1920-1921 гг. у РСФСР пачалі стварацца школы фабрычна-завадскога навучання. Яны ствараліся непасрэдна на прадпрыемствах. Першымі ў Беларускай ССР на працягу 1922 – 1923 гг. былі адчыненыя школы ФЗВ пры Віцебскай тэкстыльнай фабрыцы "Дзвіна", у Бабруйскім павеце пры шклозаводзе імя Камінтэрна і ў Добрушы пры папяровай фабрыцы. Органы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі сталі фактычнымі кіраўнікамі гэтых школ з 1924 г. Да таго часу кіраўніцтва над імі ў значнай ступені ажыццяўлялі прафсаюзныя камітэты [1, с. 192].

У пастанове II сесіі УЦВК XI склікання ад 15 кастрычніка 1924 г. адзначалася неабходнасць далейшага развіцця сеткі школ ФЗВ адпаведна з запытамі народнай гаспадаркі і перспектывамі яго развіцця [47, с. 26]. У рэзалюцыі СНК РСФСР ад 12 чэрвеня 1925 г. ставілася задача рацыяналізацыі сеткі тэхнікумаў і прафесіянальных школ, каб яна адпавядала патрэбам прамысловасці і сельскай гаспадаркі краіны і асаблівасцям кожнага раёну, у якім знаходзіцца навучальная ўстанова [47, с. 29]. Аднак з-за недахопу сродкаў адбывалася скарачэнне прафтэхшкол.

Важным крокам у станаўленні прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі было зацвярджэнне ў сакавіку 1926 г. "Палажэння аб прафесіянальна-тэхнічных школах". У ім падкрэслівалася, што гэтыя школы з'яўляліся ніжэйшымі прафесіянальна-тэхнічнымі вучэбнымі ўстановамі, задачай якіх была падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых і ніжэйшага адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу для розных галін народнай гаспадаркі, а таксама пашырэнне сярод насельніцтва спецыяльных і тэхнічных ведаў. У "Палажэнні" вызначаліся арганізацыйныя формы работы навучальных устаноў: кіраванне імі, камплектаванне, парадак прызначэння выкладчыкаў і г. д. [1, с. 193].

Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б ад 11 лістапада 1927 г. прадугледжвалася пашырэнне сеткі навучальных устаноў прафтэхадукацыі з такім разлікам, каб іх тэхналогіі і абсталяванне не адставалі ад прамысловасці [32, с. 458]. Прадугледжваліся і розныя крыніцы фінансавання (Дадатак А).

Неабходна зазначыць, што ў 1920-я гг. сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі была адарваная ад вытворчасці. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын, адной з якіх з'яўлялася неадпаведнасць перспектыўных планаў развіцця галін

прамысловасці да вытворчых патрэбаў у кваліфікаваных спецыялістах. Таму для ліквідавання дыспрапорцыі кадраў з патрэбамі прамысловасці быў праведзены перагляд усёй сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі з мэтай "змены тэмпаў і метадаў у падрыхтоўцы новых спецыялістаў і давядзенні да адпаведнасці з патрабаваннямі прамысловай вытворчасці", што было замацавана ў рэзалюцыі Пленума ЦК ВКП (б) ад 12 чэрвеня 1928 г. "Аб паляпшэнні падрыхтоўкі новых спецыялістаў" [125, с. 159-161]. Наступным крокам ва ўдасканаленні прафесіянальна-тэхнічнай сістэмы адукацыі было прыняцце пастановы ЦВК і СНК СССР ад 11 верасня 1929 г. "Аб усталяванні адзінай сістэмы індустрыяльна-тэхнічнай адукацыі", паводле якога была зацверджаная адзіная сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі з пераемнасцю ва ўсіх яе звеннях [102, арк. 39].

Трэба сказаць, што 30-я гг. XX ст. прынеслі шмат змен як у палітычнае жыццё рэспублікі, так і ў сферу асветы. У гэты час людзі, якія былі нязгодныя з палітыкай фарсіравання тэмпаў эканамічнага росту, аб'яўляліся прыхільнікамі "правага" ўхілу. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў дзейнасці сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. Так, 29 студзеня 1930 г. калегія НКА БССР заслухала паведамленне "Аб чыстцы навучальных устаноў ад кулацкага і нэпманскага элемента". У прынятай пастанове ў катэгарычнай форме прапаноўвалася на працягу двух месяцаў правесці чыстку ўсіх навучальных устаноў, пычынаючы з сямігадовых школ і канчаючы вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Выключэнню падлягалі кулакі, нэпманы, гандляры, іх дзеці і ўтрыманцы, а таксама ўсе іншыя асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў і іх утрыманцы, незалежна ад таго, хавалі яны сваё сацыяльнае паходжанне пры паступленні ў навучальныя ўстановы ці не. Рашэнне педсавета і адміністрацыі навучальнай установы лічылася канчатковым і ніякаму абскарджанню не падлягала [102, арк. 40].

Пад кулакамі і нэпманамі меліся на ўвазе людзі, якія неслі ў сабе пагрозу савецкай уладзе і перашкаджалі пабудове сацыялізму ў СССР. На справе ж, як гэта вынікае з дакументаў архіваў, яны далёка не заўсёды былі праціўнікамі бальшавіцкай улады. Не былі дакладна вызначаныя і пэўныя крытэры, паводле якіх чалавека залічвалі ў клас "эксплуататараў". У гэты час сотні навучэнцаў былі выключаны з навучальных устаноў сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адсветы. Работнікі прафесіянальных школ, курсаў, вучэбных майстэрняў, школ фабрычна-завадской моладзі і тэхнікумаў, выкладчыкі і студэнты, якія выказвалі нязгоду ў адносінах правамернасці таго, што адбывалася, падвяргаліся астракізму і выганяліся як "класава чужы элемент" або памагатыя "ворагаў народа" [134, с. 402]. Так, ахвярамі рэпрэсіяў сталі такія відныя дзеячы

асветы, як А. Баліцкі, У. Ігнатоўскі, Я, Лёсік, В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч і іншыя [15, с. 46-47].

Трэба пазначыць, што, нягледзячы на ідэалагічныя перашкоды, савецкі ўрад у 1930-я гг. працягваў будаваць новую савецкую прафесіянальна-тэхнічныю школу. Так, у чэрвені 1932 г. СНК СССР прыняў пастанову аб мерапрыемствах па паляпшэнню работы школ фабрычна-завадскога вучнёўства, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні саюзнага і рэспубліканскага вышэйшых саветаў народнай гаспадаркі. Планавалася прыняць у школы ФЗВ у 1931 г. 360 тыс. чал. Меркавалася вытрымаць жорсткія каляндарныя тэрміны будаўніцтва школ, не распыляць сродкі на будаўніцтва карлікавых школ і забараніць пабудову палацаў-гігантаў. Усе будуемыя навучальныя ўстановы павінны былі абсталёўвацца згодна з патрэбамі прафесіянальна-тэхнічнага навучання. Планавалася палепшыць забеспячэнне навучэнцаў жыллём у раёнах новага будаўніцтва, правесці мабілізацыю памяшканняў, якія прыгодныя для разгортвання работы школ ФЗВ, усталёўваліся канкрэтныя заданні па забеспячэнню школ станкамі [1, с. 383]. У 1931 г. у распараджэнні УСНГ БССР знаходзілася 16 вучэбных устаноў [1, с. 384].

Матэрыяльны стан многіх ФЗВ быў вельмі цяжкі: не хапала вучэбных дапаможнікаў, кваліфікаваных кадраў выкладчыкаў. Так, напрыклад, цяжкае становішча было ў Дубровенскай школе ФЗВ пры тэкстыльнай фабрыцы “Дняпроўская мануфактура”. На фабрыцы працавала каля 1000 рабочых. Для забеспячэння фабрыкі кваліфікаванымі ткачамі была адчыненая школа ФЗВ з двухгадовым тэрмінам навучання. Сярод тых, хто паступаў на вучобу, былі, галоўным чынам, дзеці рабочых, батракоў, бяднейшых сялянаў, выхаванцы дзіцячых дамоў. Большасць з іх скончыла 5 класаў, а некаторыя толькі чатырохгадовую школу. Памяшканне навучальнай установы было непрыстасаваным для вядзення заняткаў. Адным падручнікам па беларускай літаратуры карысталіся 7 – 9 чалавек, а па рускай літаратуры іх увогуле не было. Пераважаў вусны метад работы на ўроках, так як наглядныя дапаможнікі адсутнічалі. Спецыяльныя дысцыпліны выкладалі інжынерна-тэхнічныя работнікі фабрыкі, але яны не маглі ўдзяляць дастаткова ўвагі падрыхтоўцы да заняткаў, весці гутаркі, арганізоўваць тэхнічную вытворчасць навучэнцаў, бо былі занятыя сваёй непасрэднай працай на “Дняпроўскай мануфактуры”. Бібліятэка школы была бедная. Дубровенская школа ФЗВ спаборнічала з Віцебскай школай ФЗВ пры фабрыцы “Дзвіна”, але практычных вынікаў ад гэтага спаборніцтва не было, хаця такая з’ява як спаборніцтвы паміж рознымі ўстановамі прафесіянальна-тэхнічнага навучання была шырока распаўсюджаная ў рэспубліцы [1, с. 384-385].

З мэтай паляпшэння адбору моладзі на вучобу ва ўстановы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў іх былі ўведзеныя прыёмныя іспыты. Звычайна яны праводзіліся па важнейшых для дадзенай школы прадметах – мове, матэматыцы і найбольш блізкіх для дадзенай галіны прамысловасці раздзелах фізікі і хіміі [1, с. 388].

У 1930-я гг. адбыліся істотныя змены ў сістэме школ па мове навучання. У 20-я гг. XX ст. школьная сетка Беларускай ССР яскрава адлюстроўвала нацыянальныя прыярытэты. У той час праводзілася палітыка беларусізацыі, адным з вынікаў якой было стварэнне шырокай сеткі школ з выкладаннем на беларускай мове. Вывучэнне нацыянальнай мовы ішло ва ўсіх навучальных установах, якія мелі агульнаадукацыйную праграму. Аднак ужо ў лютым 1933 г. была прынята пастанова аб'яднанага пленума ЦК і ЦВК Кампартыі Беларусі, у якой адзначалася, што ў справе школьнага будаўніцтва дапускаліся грубыя скажэнні існуючай палітыкі "ў механічным пераводзе ў шэрагу раёнаў школ нацыянальных меншасцяў, у тым ліку рускіх школ, у беларускую мову". Кіруючыся гэтымі ўказаннямі Наркамасветы БССР з канца 1933 г. пачаў прымаць меры да пашырэння сеткі нацыянальных, галоўным чынам, рускіх школ. Павялічылася колькасць рускіх школ у гарадах. Шэраг беларускіх пераўтвараліся ў рускія школы [102, арк. 31-32]. Трэба сказаць, што гэта пастанова паклала пачатак афіцыйнаму наступленню на беларускую сярэднюю школу. Да 1938/39 навучальнага года ў школьнай сетцы Беларусі засталіся толькі беларускія і рускія школы. Пераважная большасць вучняў навучалася ў беларускіх школах. У 1938-39 годзе ў рускіх школах займалася 6,6 % вучняў, а астатнія 93,4 % былі ў школах з беларускай мовай выкладання. Большасць расійскамоўных школ знаходзілася ў буйных гарадах [102, с. 31].

Прыняты на XVIII з'ездзе партыі трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР (1938-42 гг.) вызначыў вялікую праграму культурнага будаўніцтва. У плане было закладзена ажыццяўленне сярэдняй адукацыі ў горадзе і поўнага ўсеагульнага сямігадовага навучання ў вясковай мясцовасці і нацыянальных рэспубліках. Пры гэтым улічвалася, што выпускнікі сярэдняй школы павінны будуць пайсці не толькі ў ВНУ, але і на вытворчасць. Таму прызнавалася неабходным, каб яны ў школе атрымлівалі практычную падрыхтоўку да работы ў сферы матэрыяльнай вытворчасці [33, с. 306-307].

Такім чынам, сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі БССР за 1920-1930-я гг. прайшла шлях станаўлення і ўпарадкавання. Гэты працэс адбываўся ў цеснай сувязі з развіццём прамысловасці і сельскай гаспадаркі краіны. Усе цяжкасці, якія выпадалі ім, непазбежна ўплывалі і на прафтэхадукацыю. Трэба адзначыць, што стварэнне і развіццё сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў першую чаргу садзейнічала падрыхтоўцы кадраў новай інтэлігенцыі

з асяроддзя працоўна-сялянскай моладзі. Гэта было асабліва неабходна па шэрагу прычын:

- па-першае, частка старой інтэлігенцыі пад час грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі выехала жыць у іншыя месцы, другая частка, якая не знаходзілася ў партыі бальшавікоў, не пагадзілася з усталяваннем аднапартыйнай сістэмы ў першай палове 20-х гг. XX ст.;
- па-другое, для стварэння новага сацыялістычнага грамадства Камуністычнай партыі была патрэбна інтэлігенцыя з адпаведным камуністычным складам мыслення.

Такім чынам, савецкая прафесіянальна-тэхнічная школа разглядаемага перыяду дапамагала ўключэнню ў свядомасць, жыццё і побыт падрастаючага пакалення новых палітычных, маральна-бытавых нормаў, а таксама нормаў паводзінаў і савецкіх каштоўнасцяў. Акрамя таго, у 1920-1930-я гг. агрэсіўнае навязванне ідэйна-палітычных і маральных каштоўнасцяў, імкненне зруйнаваць шматлікія рысы старога быту, пранізанага рэлігійнасцю і патрыярхальнасцю, выклікала схаваны альбо яўны супраціў, як часткі настаўнікаў, так і вучняў і іх бацькоў. Многія рысы ў маральна-побытавых паводзінах насельніцтва заставаліся традыцыйнымі, нягледзячы на ціск на іх з боку савецкай улады.

Аднак, ня гледзячы на шматлікія заганы новай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, савецкая ўлада здолела пабудаваць новую прафесіянальна-тэхнічную школу, даступную большай частцы насельніцтва, якая з цягам часу падвышала свой адукацыйны узровень, арганізацыйны і фінансавы стан, злучала ўсе звенні прафесіянальна-тэхнічных устаноў, давала магчымасць падлеткам і дарослым атрымаць прафесію, запатрабаваную на рынку працы.

## 2.2. Фарміраванне кадраў прафесіянальна-тэхнічнага навучання

Адначасова са стварэннем і ўмацаваннем кіраўнічага апарату народнай асветы праводзілася работа па прыцягненню настаўнікаў на бок савецкай улады, а таксама па навучанню новых выкладчыкаў ужо ў савецкіх педагагічных установах, што было звязана з недахопам кадраў народнай адукацыі, бо колькасць выпускнікоў настаўніцкіх семінарый была вельмі нізкай яшчэ ў часы Расійскай імперыі.

Трэба адзначыць, што значная частка настаўнікаў і выкладчыкаў насцярожана аднеслася і не адразу прыняла рэфармаванне прынцыпаў адукацыі. У сувязі з гэтым у тагачасным савецкім грамадстве, у першую чаргу ў прэсе, з'явіліся такое вызначэнне як "новае" і "старое" настаўніцтва, якое размяжоўвалася па сваіх ідэалагічных поглядах. Да таго ж акрамя непрыняцця ідэалогіі савецкай дзяржавы, настаўнікі мелі цяжкае матэрыяльнае становішча [152, с. 100]. Таму многія педагогі былых сярэдніх і сярэдніх спецыяльных школ, што знаходзіліся ў царскія часы ў прывілеяваным становішчы, сустрэлі перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі варожа і спачатку сталі на шлях прамога сабатажу савецкай улады ў галіне перабудовы школьнай справы. Гэтая частка настаўнікаў уваходзіла ва Усерасійскі настаўніцкі саюз. Аднак, абапіраючыся на рэвалюцыйна настроеную частку настаўнікаў, Камісарыят асветы Заходняй вобласці арганізаваў Саюз настаўнікаў-інтэрнацыялістаў. Ужо вясной 1918 г. у яго шэрагах налічвалася 12 тыс. чалавек [165, с. 224].

Праўда, з-за адтоку так званага "старога" настаўніцтва на змену прафісіянальным і вопытным настаўнікам прыйшлі самавучкі і асобы, якія праслухалі кароткатэрміновыя курсы, што прывяло за сабой зніжэнне агульнага адукацыйнага ўзроўню школьных працаўнікоў, што ў сваю чаргу адбілася на якасці адукацыі. Так, у выніку інструктарскага абследавання 275 школ Рэчыцкага павета ў пачатку 1921 г. адзначалася, што з усёй колькасці настаўнікаў толькі 12 % прыгодныя да працы, 40 % могуць быць карыснымі, калі яны пройдуць паўторныя курсы, а астатнім з-за іх прафесіянальнай нягоднасці нават небяспечна пакідаць дзяцей. У сувязі з гэтым у большасці школ навучалі толькі чытанню, пісьму і ліку [152, с. 102].

Прафесіянальная непадрыхтаванасць спалучалася са складаным матэрыяльным становішчам настаўніцтва, а таксама няпростымі ўмовамі жыцця. Так, напрыклад, мінскім губернскім аддзелам народнай адукацыі ў 1919 г. было праведзенае анкетнае апытанне, якое падае некаторыя звесткі аб становішчы настаўніцтва таго часу. Паводле яго вынікаў 52 % сельскіх настаўнікаў жывуць у наёмных памяшканнях, якія не задавальняюць патрэбам

самай прымітыўнай гігіены. У пакоях зімна, цесна і сыра, а таксама адсутнічае асвятленне. У сувязі з недахопам сродкаў, і, як вынік, дрэнным харчаваннем, у 40 % настаўнікаў пагоршылася здароўе. Акрамя таго, 67 % карыстаюцца асабістымі кнігамі ці кнігамі з сельскай бібліятэкі, а 19 % зусім пазбаўлены кніг, 68 % не атрымоўваюць газет і часопісаў, 30 % атрымоўваюць пошту раз у месяц [152, с. 100].

З дадзееных анкетнага апытання вынікае, што менавіта крайняя беднасць прывяла да масавага адтоку прафесіянальных педагагічных кадраў у іншыя працоўныя сферы. Нягледзячы на катастрафічны недахоп настаўнікаў, савецкае кіраўніцтва працягвала адчыняць новыя школы і павялічваць колькасць класаў. Асабліва ў цяжкім становішчы апынуліся павятовыя аддзелы народнай адукацыі. У асобных сельскіх школах на аднаго настаўніка ў 1919/20 навучальным годзе прыходзілася да 60-ці вучняў [99, арк. 13-15].

Пасля кастрычніцкага перавароту адмянялася размежаванне выкладчыкаў па катэгорыям, замест паўрочнай зарплаты ўводзіліся тарыфныя стаўкі, вызначаліся 5-гадовыя надбаўкі за стаж, якіх магло быць не больш за 4. Таксама было надзвычай цяжка сумясціць педагагічную дзейнасць з працай на іншых пасадах. Заробак на ўсіх іншых месцах не павінен быў перавышаць 50 % ад асноўнага акладу. Акрамя таго, дазвол ад аддзелу народнай адукацыі на сумяшчэнне пасад атрымаць было амаль немагчыма. Усе школьныя працаўнікі (настаўнікі, школьныя ўрачы, інструктары фізічнай працы) павінны былі штогод перавыбірацца згодна з дэкрэтам аб выбарнасці педагагічных і адміністрацыйна-педагагічных пасад ад 27 лютага 1918 г. Працягласць працы настаўніка вызначалася 6 гадзінамі ў дзень, з якіх 4 неабходна было адводзіць на вучэбныя заняткі, а астатнія – на бягучыя школьныя справы: на ўдзел у паседжаннях школьнага савету, дзяжурствы, праверку сшыткаў і г. д. [111, арк. 23].

Савецкая ўлада ўзяла курс на перападрыхтоўку педагагічных кадраў, што было звязана не столькі з паляпшэннем адукацыйнага ўзроўню настаўнікаў, колькі з іх перавыхаваннем як актыўных праваднікоў савецкай палітыкі. Вырашыць гэтую праблему павінны былі педагагічныя курсы, якія за кароткі перыяд рыхтавалі савецкіх выкладчыкаў. У 1917-1920 гг. у краіне стваралiся такія курсы трох тыпаў:

- пастаянныя курсы з двума гадамі навучання;
- аднагадовыя курсы з 10-месячным тэрмінам навучання;
- кароткатэрміновыя курсы з 6-тыднёвым тэрмінам навучання.

Так, напрыклад, у маі-чэрвені 1918 г. у Мінскай губ. былі арганізаваныя кароткатэрміновыя курсы ў Мінску, Барысаве, Мазыры, Мар'інай Горцы і Бабруйску. Галоўнай мэтай курсаў з'яўлялася азнаямленне настаўнікаў з

новымі метадамі выкладання прадметаў у працоўных школах I ступені. На тэарэтычныя заняткі па сельскай гаспадарцы адводзілася 50 вучэбных гадзін, тады як на методыку выкладання гісторыі – 6 гадзін, на матэматыку і родную мову – па 12, а на практыку ў майстэрнях і на вопытным полі – 180 гадзін на кожную групу. Кожныя такія курсы рыхтавалі па 200 настаўнікаў для савецкіх працоўных школ [159, арк. 95-97]. Так, за 1921-1925 гг. на летніх курсах прайшлі перападрыхтоўку 39 % настаўнікаў старэйшых і 75 % настаўнікаў пачатковых класаў. У 1923 г., напрыклад, курсы перападрыхтоўкі працавалі ва ўсіх павятовых цэнтрах, што дало магчымасць ахапіць вучобай 1928 педагогаў [30, С. 39].

Трэба зазначыць, што ўжо ў 1921 г. трохгадовыя педагагічныя курсы былі рэарганізаваны ў педтэхнікумы з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Такія тэхнікумы былі адчыненыя ў Мінску, Бабруйску, Барысаве, Ігумене, Мазыры і Петрыкаве. На першы курс прымаліся асобы з падрыхтоўкай не ніжэй за першыя два класы школы II ступені. Першы і другі курсы павінны былі стаць агульнаадукацыйнымі, трэці – агульна педагагічным, а чацвёрты – дзяліцца на 2 аддзяленні – школьнае і дашкольнае. Прадугледжвалася адчыніць пры педтэхнікумах падрыхтоўчыя аддзяленні. Такія ўстановы не маглі адразу даць неадходную колькасць спецыялістаў, таму адначасова з імі працягвалі сваю дзейнасць розныя педагагічныя курсы [134, с. 227].

7-12 мая 1918 г. у Маскве адбыўся Усерасійскі з'езд дэлегатаў настаўніцкіх інстытутаў. На ім прысутнічалі дэлегаты ад 22 настаўніцкіх інстытутаў, у тым ліку ад Віцебскага і Мінскага. Было прынята рашэнне аб пераўтварэнні настаўніцкіх інстытутаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы з чатырохгадовым тэрмінам навучання [51, С. 20]. Выкананне гэтага рашэння на беларускіх землях пачалося 5 кастрычніка 1918 г., калі Дзяржаўная камісія па асвеце ў асноўным ухваліла мерапрыемствы па пераўтварэнню настаўніцкіх інстытутаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы [48, С. 21]. У ліку першых Віцебскі настаўніцкі інстытут быў ператвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову з трыма аддзяленнямі: сацыяльна-гістарычным, біёлага-геаграфічным і фізіка-матэматычным. Мінскі настаўніцкі інстытут з верасня 1915 г. па верасень 1918 г. знаходзіўся ў Яраслаўлі. Магілёўскі інстытут у тым жа годзе быў ператвораны ў педагагічны [51, С. 22].

У жніўні 1918 г. у Маскве адкрыўся I Усерасійскі з'езд па асвеце. З'езд прызнаў неабходным стварыць адзіны тып вышэйшай педагагічнай настаўніцкай установы, уніфікаваць у краіне сістэму педагагічнай адукацыі. Акрамя таго прынятае “Часовае палажэнне аб настаўніцкіх семінарыях” змяняла вучэбна-выхаваўчы працэс, уводзіла калегіяльнае кіраўніцтва. На чале навучальнай установы стаяў педсавет, які кіраваў усім яе жыццём. Ён меў права

распрацоўваць праграмы, размяркоўваць дысцыпліны па гадах навучання [107, арк. 5-6]. Праўда, уніфікаваць усе педагагічныя навучальныя ўстановы было не магчыма. У сістэме педагагічнай адукацыі яшчэ доўгія гады захоўваліся розныя тыпы устаноў асветы.

Не паспелі педагагічныя інстытуты праявіць свае слабыя і моцныя бакі, як кіраўніцтва аддзелу падрыхтоўкі настаўнікаў Наркамасветы РСФСР прапанавала стварыць новы тып педагагічнай навучальнай установы - інстытуты народнай адукацыі, у якіх рыхтавалі б не толькі настаўнікаў, але і дашкольных і пазашкольных работнікаў. У жніўні 1919 г. у Маскве адбылася другая нарада па рэформе педагагічных навучальных устаноў. Нарада ўхваліла рэарганізацыю педагагічных інстытутаў і некаторых настаўніцкіх семінарый і прыняла Статут інстытутаў народнай адукацыі [51, С. 24].

У сувязі са стварэннем у БССР ў 1919/20 навучальным годзе інстытутаў народнай адукацыі, якія здзяйснялі падрыхтоўку спецыялістаў для галін асветы, знікла неабходнасць у адначасовым існаванні настаўніцкіх семінарый, якія рыхтавалі настаўнікаў для школ I ступені. У чэрвені 1919 г. НКА РСФСР прыняў рашэнне пераўтварыць усе настаўніцкія семінарыі ў залежнасці ад мясцовых умоў у педагагічныя курсы для падрыхтоўкі работнікаў школ I ступені альбо інстытуты народнай адукацыі. Кантынгент вучняў семінарый, а потым трохгадовых педкурсаў быў нешматлікім. Кожная настаўніцкая ўстанова мела ў сярэднім каля 100 выхаванцаў [107, арк. 27].

Аднаўленне і разгортванне сеткі навучальных устаноў патрабавала вырашэння пытання аплаты працы педагагічных работнікаў. У 1920 г. Усесаюзны цэнтральны савет прафесіянальных саюзаў (УЦСПС) і Галоўпрафадукацыі РСФСР зацвердзілі палажэнне аб аплаце працы работнікаў спецыяльных навучальных устаноў. Аклады выкладчыкам спецыяльных прадметаў усталёўваліся з улікам 18 прадметных урокаў у тыдзень, дадаткова дазвалялася чытаць не больш як 6 гадзін. Аплата настаўнікаў агульнаадукацыйных прадметаў адпавядала ўсталяванай у адзінай працоўнай школе норме - у разліку 36 гадзін у тыдзень, з якіх вучэбных гадзін павінна было быць 24. У палажэнні вызначаліся абавязкі майстроў. Яны павінны былі не толькі забяспечваць узорныя правядзенні заняткаў, але і весці падрыхтоўку да іх, клапаціцца аб стане майстэрняў, абсталявання, наяўнасці інструменту і г. д., а таксама на працягу 8-гадзіннага рабочага дня выконваць усе работы па спецыяльнасці, якія адміністрацыя можа ім даручыць, напрыклад, будаўнічыя або рамонтныя работы, рамонт інвентару для вучэбных або дапаможных устаноў, выкананне пэўных заказаў і г. д. На час камандзіровак на курсы, у спецыяльныя навучальныя ўстановы для павышэння кваліфікацыі за работнікамі захоўвалася права на сярэдні заробак [1, с. 187].

Важнай падзеяй для сістэмы фарміравання педагагічных кадраў было адкрыццё 30 кастрычніка 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Падрыхтоўка педагагічных кадраў ажыццяўлялася на факультэце грамадскіх навук. Грамадска-педагагічнае і этналінгвістычнае аддзяленне рыхтавала выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, мовы і літаратуры, эканамічнае і прававое - эканамістаў і юрыстаў. У першым навучальным годзе на грамадска-педагагічным аддзяленні вучыўся 221 студэнт, на этнолага-лінгвістычным – 86. Падводзячы вынікі работы за першы навучальны год, рэктар універсітэту адзначаў, што заняткі вяліся ў складаных умовах: пры тэмпературы ніжэй за нуль і пры адсутнасці ў лабараторыях вады [88, с. 237].

Першы год ва ўніверсітэце на ўсіх факультэтах навучалася 1390 студэнтаў, працаваў 81 выкладчык, у тым ліку 14 прафесараў, 53 загадчыкі кабінетаў і лабараторый. Многія прафесары прыехалі з іншых гарадоў краіны. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, высокакваліфікаваных кадраў не хапала. Напрыклад, на фізіка-матэматычным аддзяленні, адчыненым на педфаку ў 1922 г. не было ніводнага прафесара. Спачатку там працавалі былыя выкладчыкі гімназіяў і рэальных вучылішчаў. І толькі пазней педагагічную работу ўзначалілі прафесары – фізік Я. Сіроткін і астраном А. Міхайлоўскі, якія прыехалі з РСФСР. Глыбокі след у развіцці матэматычных навук пакінулі Я. Громер і Ц. Бурсцін. Са снежня 1923г. ва ўніверсітэце пачаў працаваць Я. Колас. Перад студэнтамі часта выступаў старшыня ЦВК А. Чарвякоў [111, арк. 35].

З пераходам да НЭПа адбываюцца змяненні ў сістэме і сетцы прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў. Гэты пераход ажыццяўляўся ў рэжыме строгай эканоміі ўсіх галін народнай гаспадаркі, у тым ліку і ў галіне асветы. Таму на дзяржбюджэце былі пакінуты толькі 2-гі Мінскі беларускі педтэхнікум, Мінскі яўрэйскі педагагічны тэхнікум, Бабруйскі і Барысаўскі педагагічныя тэхнікумы і двухгадовыя польскія настаўніцкія курсы [134, С. 228].

У сувязі са стварэннем Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і агульным скарачэннем сеткі навучальных устаноў, 4 снежня 1922 года Галоўнае ўпраўленне прафесіянальнай адукацыі БССР выдала загад аб закрыцці Мінскага інстытута народнай адукацыі 31 студзеня 1922 г.. Найбольш кваліфікаваныя выкладчыкі Мінскага інстытуту народнай адукацыі перайшлі на працу ва ўніверсітэт [35, С. 69].

Акрамя таго, былі зачыненыя І-ы Мінскі, Ігуменскі, Мазырскі і Петрыкаўскі педтэхнікумы. У выніку з 8 педагагічных тэхнікумаў у 1921 г. праз год засталося толькі 4. Пры вялікім недахопе настаўнікаў гэта страта была вельмі адчувальнай, асабліва для мясцовых аддзелаў народнай асветы, якія

ўсімі даступнымі ім сродкамі імкнуліся захаваць педагагічныя навучальныя ўстановы [134, с. 228].

Суадносна з рашэннямі I Усерасійскай партыйнай нарады, якая праходзіла з 31 студзеня 1920 г. па 4 снежня 1921 г., і змяненнем сістэмы народнай адукацыі была праведзена рэарганізацыя педагагічных навучальных устаноў. Падрыхтоўка настаўнікаў для сярэдніх навучальных устаноў была засяроджана ў педагагічным інстытуце альбо на педагагічным факультэце ўніверсітэта. Настаўнікаў для сямігадовых школ павінны былі рыхтаваць практычныя інстытуты народнай адукацыі. У 1923 г. практычныя інстытуты народнай адукацыі былі ліквідаваны як установы, якія не спраўдзілі сваё існаванне [51, С. 42]. Пры рэарганізацыі яны пераўтвараліся ў педагагічныя тэхнікумы або інстытуты.

У гэты час вяліся пошукі шляхоў паляпшэння агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі будучых студэнтаў. У 1923 г. былі ўведзеныя ўступныя іспыты ў ВНУ. Абітурыенты здавалі іспыты па рускай мове, матэматыцы, фізіцы і грамадазнаўству ў аб'ёме праграмы рабфака. Перабудоўвалася работа факультэта грамадскіх навук: у ім захоўваліся толькі 2 аддзяленні – эканамічнае і прававое. Астатнія ўвайшлі ў склад арганізаванага ў 1922/1923 навучальным годзе педагагічнага факультэта. У яго ўваходзілі 4 факультэты: сацыяльна-гістарычны, этнолага-лінгвістычны, фізіка-матэматычны і прыродазнаўчы. У першы год на педагагічным факультэце навучалася 730 студэнтаў, у тым ліку на сацыяльна-гістарычным – 357, этнолага-лінгвістычным – 116, фізіка-матэматычным – 126, прыродазнаўчым – 13 [88, с. 238].

Стварэнне педагагічнага факультэта БДУ мела вялікае значэнне: тут закладваліся трывалыя асновы для развіцця вышэйшай педагагічнай адукацыі ў рэспубліцы. Педфак БДУ з'яўляўся заснавальнікам падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй. Яго структура шмат разоў змянялася і ўдасканальвалася. З мэтай зближэння педагагічнага факультэта БДУ з патрэбамі школы вясной 1924 г. была зменена яго структура. Першы курс з'яўляўся агульным. На ім выкладаліся галоўным чынам грамадска-палітычныя і агульнанавуковыя дысцыпліны. Размеркаванне студэнтаў па спецыяльнасцях пачыналася з другога курса. На аддзяленнях працавалі нацыянальныя секцыі – беларуская, польская, яўрэйская [88, с. 239].

Паляпшэнню сацыяльнага складу і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі садзейнічала ажыццяўленне пастановы СНК БССР ад 11 чэрвеня 1924 г., у адпаведнасці з якой Наркамату асветы даручалася правесці некаторае скарачэнне агульнай колькасці студэнтаў. Калі ў 1922/23 навучальным годзе ў БДУ налічвалася 189 студэнтаў, то ў 1925/26 годзе

колькасць іх узрасла да 1397. Скарачэнне меркавалася праводзіць з улікам акадэмічнай паспяховасці студэнтаў. Перавагамі і ільготамі карысталіся навучэнцы пралетарскага паходжання. З 919 студэнтаў педфаку БДУ было адлічана 190 чалавек, а ў Віцебскім вышэйшым педагагічным інстытуце з 328 – 110. Гэтая пастанова садзейнічала адбору ва ўніверсітэт больш падрыхтаванага кантынгенту, аднак, разам з тым, скарачала выпуск кваліфікаваных настаўнікаў і выкладчыкаў, якіх не хапала, каб цалкам ахапіць усе ўстановы асветы рэспублікі [88, с. 239].

Розныя тыпы навучальных устаноў, якія працавалі ў БССР, уяўлялі сабой спробу стварыць зладжаную сістэму педагагічнай адукацыі. Але толькі стварэннем педагагічнага факультэта БДУ восенню 1922 г. была закладзена трывалая аснова для развіцця вышэйшай педагагічнай адукацыі ў краіне. У гады аднаўленчага перыяду былі рэарганізаваны сярэднія педагагічныя навучальныя ўстановы. Наркамасветы адмовіўся ад адзінай педагагічнай установы і выказаўся за паасобную падрыхтоўку настаўнікаў для сярэдніх і пачатковых школ. Было вырашана засяродзіць падрыхтоўку настаўнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў педагагічных інстытутах і на педагагічных факультэтах універсітэтаў, а настаўнікаў сярэдняй кваліфікацыі ў педагагічных тэхнікумах. Трохгадовыя педагагічныя курсы падлягалі ператварэнню ў чатырохгадовыя педтэхнікумы [51, С. 59].

Такім чынам, у БССР у перыяд з 1917 па 1924 гг. рэарганізацыя сістэмы педагагічнай адукацыі праводзілася некалькі разоў. Пераўтварэнні не заўсёды адпавядалі існуючай рэальнасці. У кіруючых работнікаў НКА, дзеячаў народнай асветы не было яшчэ вопыту, неабходнага для стварэння і кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі новай савецкай сістэмы адукацыі і выхавання. У канцы аднаўленчага перыяду падрыхтоўку выкладчыкаў для сярэдніх навучальных устаноў у Беларусі праводзіў толькі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Таксама нізкай у гэты перыяд была агульная кваліфікацыя настаўніцтва. Так, напрыклад, паводле дадзеных аб кваліфікацыі настаўніцтва прафтэхшкол на 1923 г. вынікае, што з агульнага ліку 232 чалавек выкладчыцкага складу – 166 асоб маюць вышэйшую адукацыю, з сярэдняй адукацыяй – 54 чалавекі, а з ніжэйшай – 12. Апошнія з’яўляюцца пераважна выкладчыкамі прадметаў вузкай спецыяльнасці, напрыклад, фізкультуры. Інструктарскі склад, у большасці выпадкаў, таксама недастаткова кваліфікаваны ў вытворчых адносінах [45, с. 282].

1923/24 навучальны год паклаў пачатак арганізаванай і планамернай працы ў сферы народнай адукацыі. Упарадкоўвалася сетка, выпрацоўваліся праграмы, паляпшалася матэрыяльнае становішча навучальных устаноў, у тым ліку і педагагічных. Тым не менш праблема педагагічных кадраў не была

вырашана нават напрыканцы 20-х гадоў XX ст. Вучэбная нагрузка заставалася вельмі вялікай. Каля паловы настаўнікаў працавала з трыма і чатырма групамі, прычым на адзін камплект прыходзілася ў сярэднім каля 46 вучняў [25, С. 119]. Толькі з 30-х гадоў XX ст. становішча з педагагічнымі кадрамі пачало паляпшацца.

На VIII з'ездзе РКП (б) падкрэслівалася, што настаўнікі павінны падначальвацца не толькі сваім непасрэдным цэнтрам, але і мясцовым партыйным арганізацыям [169, С. 104], што яшчэ раз паказвае, што настаўнікі выкарыстоўваліся савецкай уладай у якасці праваднікоў ідэалогіі і прапаганды савецкіх ідэй і савецкага ладу жыцця. Аднак, значная частка настаўніцтва, асабліва дарэвалюцыйнага, не ўспрымала новаўводзінаў савецкай школы, а таму фармальна адносілася да выканання новых патрабаванняў і ўстановак [169, С. 107].

Паколькі новая сістэма асноўнай задачай ставіла выхаванне "савецкага чалавека", то і настаўнік павінен быць адпаведным. Былі арганізаваны кружкі па вывучэнню палітыкі партыі і савецкай улады. З мэтай камуністычнага выхавання работнікаў асветы ў 1925 г. пачаў выдавацца педагагічны часопіс "Асвета" [10, с. 287].

Калі ў 1927 г. у рэспубліцы пачаўся пераход да ўсеагульнай пачатковай адукацыі, то гэта выклікала неабходнасць пашырэння падрыхтоўкі настаўнікаў. У кожным педагагічным тэхнікуме ствараліся паралельныя аддзяленні. У сувязі з гэтым былі адчыненыя новыя педтэхнікумы. Так, у сувязі з наданнем школам у сельскіх мясцовасцях сельскагаспадарчага ўхілу Чырвонабярэжскі агратэхнікум пераўтварылі ў аграпедагагічны. У 1928 г. узніклі яшчэ 2 тэхнікумы – у Слуцку і Лепелі, а ў 1929 г. у Мінску адчыніўся дашкольны педагагічны тэхнікум і тэхнікум па падрыхтоўцы настаўнікаў фізічнай культуры. У цэлым колькасць педтэхнікумаў у Беларусі ў 1926-1929 гг. вырасла з 10 да 16, а кантынгент навучэнцаў павялічыўся з 2028 да 3732 чалавек [145, арк. 229].

Па дадзеных школьнага перапісу ў БССР у пачатку 1927/28 навучальнага года ў I канцэнтры працавала 9153 настаўнікі, у тым ліку: у пачатковых школах – 7779 і ў малодшых класах сямігадовых школ – 1374 чалавекі. Гэтыя кадры размяркоўваліся па стажу працы наступным чынам: да 1 года – 7,5 %, ад 1 да 2 год – 15,1 %, ад 3 да 4 – 9,3 %, ад 5 да 9 – 26,4 %, ад 10 да 14 – 18,4 %, ад 15 да 19 – 11,3 %, ад 20 і больш – 12%; па адукацыі: з вышэйшай і сярэдняй педагагічнай адукацыяй – 28,5 %, з вышэйшай і сярэдняй агульнай адукацыяй – 38,3 %, з няскончанай сярэдняй адукацыяй – 33,2 %. Настаўнікаў ва ўзросце да 30 год было 53,3 % ад усяго настаўніцтва. У 1930 г., у параўнанні з 1927 г., змяніўся і сацыяльны склад педагагічных кадраў. Значна ўзрасла

ўдзельная вага настаўнікаў, якія паходзілі з рабочых і сялянаў (57,6 % ад усяго настаўніцтва) [110, арк. 119-120]. Прыведзеныя дадзеныя сведчаць пра тое, што колькасць настаўнікаў у рэспубліцы была невялікай і цалкам не магла забяспечыць патрэбы народнай адукацыі ў педагагічных кадрах, асабліва прафесіянальных.

Акрамя таго, у 1927/28 навучальным годзе ў асобных педагагічных тэхнікумах уводзіцца завочнае аддзяленне, арганізуюцца семінары і курсы для настаўнікаў старэйшых класаў сямігадовай школы і для настаўнікаў пачатковай школы. У 1929 г. завочным навучаннем было ахоплена 7,7 % усіх настаўнікаў [145, арк. 120-121].

У канцы 1920-х гг. у вырашэнні кадравай праблемы больш выразна пачалі выкарыстоўвацца адміністрацыйныя метады. Мясцовыя аддзелы народнай асветы павінны былі раўнамерна размяркоўваць педагогаў па дaручаным школам. Большая частка настаўнікаў адмаўлялася ехаць на пастаяннае месца працы ў глухія вёскі, на што губернскія органы ўлады рэагавалі па аднолькавай схеме: спачатку настаўніка папярэджвалі, затым штрафавалі, а потым на некалькі месяцаў пазбаўлялі зарплаты. У асобных выпадках настаўнікі дастаўляліся на вызначанае месца працы пры дапамозе міліцыі [152, с. 102].

Трэба адзначыць, што ў сувязі з працэсамі беларусізацыі, якія разгарнуліся ў 1920-я гг. у краіне, настаўніцкія курсы адыгралі важную ролю ў навучанні педагогаў беларускай мове. Так, у 1923 г. былі адчыненыя 2-гадовыя “Вышэйшыя курсы беларусазнаўства”, на якіх выкладаліся вучэбныя прадметы, якія давалі грунтоўныя веды па гісторыі і геаграфіі Беларусі, беларускай мове і літаратуры, нацыянальна-вызваленчым руху, звесткі з гісторыі, этнаграфіі і фальклору, народнай педагогікі. Арганізоўваліся ў гэтай галіне і кароткатэрміновыя курсы, якія ахоплівалі 3, 6 месяцаў ці 1 год. Беларускія курсы для настаўнікаў былі арганізаваныя ў Мінску, Слуцку і іншых гарадах. У 1926/27 навучальным годзе былі арганізаваныя настаўніцкія курсы ў Гомельскім і Рэчыцкім паветах, далучаных да БССР. У 1924/25 і 1925/26 навучальных гадах былі накіраваныя ў беларускія школы і школы нацыянальных меншасцяў настаўнікі, якія скончылі: вышэйшыя курсы беларусазнаўства – 161 чалавек, педфак БДУ – 274, педагагічныя тэхнікумы – 754 [151, с. 79].

З кожным годам павялічваўся склад педагагічных кадраў. Калі ў 1920/21 навучальным годзе ў школах БССР працавала толькі 10 800 настаўнікаў, то ў 1930/31 годзеколькасць іх узнасла амаль у 2 разы [111, с. 10]. У 1931 г. у рэспубліцы налічваецца 21 педагагічны тэхнікум, з выпускам каля 1500 чал. у год і шэраг двух- і аднагадовых педагагічных курсаў, з выпускам каля 1 тыс.

чал. Але ўсё ж такі забяспечанасць прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі педагогамі застаецца няпоўнай [145, арк. 14-15].

За перыяд з 1921 па 1930 гг. педагагічнымі тэхнікумамі і курсамі было падрыхтавана каля 7 тыс. настаўнікаў, педагагічным факультэтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту 1400 выкладчыкаў II ступені сямігадовых школ, рабфакаў, тэхнікумаў і інш. сярэдніх навучальных устаноў [92, арк. 13].

Трэба заўважыць, што настаўнікі займалі даволі важнае месца ў тагачасным савецкім грамадстве. Так, з 11558 настаўнікаў 9015 актыўна працавалі ў грамадскіх арганізацыях і мясцовых органах савецкай улады (Дадатак Б), у тым ліку членамі сельскіх саветаў з’яўляліся 1209 чалавек, членамі раённых выканаўчых камітэтаў – 215, членамі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі – 1409 чалавек [82, арк. 14].

У пачатку 30-х гг. XX ст. змяняецца сістэма вышэйшай педагагічнай адукацыі. Так, у 1930 – 1931 гг. педагагічныя факультэты ўніверсітэтаў пераўтвараюцца ў педагагічныя інстытуты з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Вышэйшы педагагічны інстытут адчыніўся ў 1931 г. на базе педфакультэта БДУ. Ён меў тры сваіх факультэты: гістарычны, мовы і літаратуры з двума аддзяленнямі (рускім і беларускім) і фізіка-матэматычны. На ўсіх факультэтах былі завочныя і вячэрнія аддзяленні. У 1936 г. яму было нададзена імя А. Горкага [159, арк. 394].

Таксама ў 1930 г.аднавіў працу Віцебскі індустрыяльна-педагагічны інстытут, быў створаны ў гэтым жа годзе Магілёўскі аграрна-педагагічны, заснаваны Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытуты з двухгадовым тэрмінам навучання [159, арк. 394-395]. Такім чынам, значна пашырылася сістэма навучання педагогаў вышэйшай кваліфікацыі, што спрыяльна адбівалася на дзейнасці прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, на падрыхтаванасці як педагагічнага складу, так і складу навучэнцаў.

У педагагічных установах адукацыі для арганізацыі заняткаў складаўся план-графік, у якім былі распісаны расклад заняткаў, тэрміны сесіяў, час мерапрыемстваў. У плане пазначалася, што рабочы дзень студэнта вызначаўся наступным чынам: аўдыторныя заняткі – 6 гадзін у дзень, аднак з-за таго, што студэнты кожны год па месяцу былі занятыя дапамогай калгасам, прадпрыемствам і школам, працягласць вучэбных заняткаў павялічылася да 8 гадзін у дзень; самастойная падрыхтоўка – 4 гадзіны; грамадская работа – 1 гадзіна ў дзень; педпрактыка – 2 гадзіны ў тыдзень. У сувязі з тым, што ўсе студэнты былі ахопленыя заняткамі ў гуртках, спартовых секцыях, працавалі агітатарамі ў калгасах, на прадпрыемствах, піянерважатымі ў атрадах, вольнага ад акадэмічнай нагрузкі часу ў іх заставалася вельмі мала, што адмоўна ўплывала на ступень іх падрыхтаванасці [159, арк. 396].

Трэба адзначыць, што, як і раней, колькасць настаўнікаў і выкладчыкаў, падрыхтаваных у розных навучальных установах, не адпавядала патрэбам народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. Так, у 1929/30 навучальным годзе дыпломы атрымалі 2433 настаўнікі, у тым ліку скончылі педагагічныя тэхнікумы – 1098 чал., двухгадовыя педагагічныя курсы – 325, гадавыя педкурсы – 450 і кароткатэрміновыя – 560 чал [145, арк. 59].

Як адзначалася ў папярэднім раздзеле, 30-я гг. ХХ ст. былі неспрыяльнымі для народнай асветы ў сувязі з цяжкім станам краіны. "Вялікі скачок", "раскулачванне", пабудова камуністычнага грамадства, рэпрэсіі, - усе гэтыя з'явы падарвалі моц краіны, прымушалі людзей супраціўляцца дзеянням улады, што вылілася ў адлічэнні з навучальных установ як навучэнцаў, так і выкладчыкаў, якія не прымалі існуючы парадак рэчаў ці належалі да т. зв. "ворагаў народа", "класава чужых элементаў" і г. д.

У гэты час, акрамя таго, былі прынятыя меры па ўвядзенню адзінаначалля ў вучэбных калектывах. Дэмакратычны характар іх работы падмяняўся адміністратыўным засіллем, абмеркаванне спрэчных пытанняў на пасяджэннях педагагічных саветаў – загадамі. Так, НКА БССР у студзені 1930 г. у адпаведнасці з рашэннямі лістападаўскага (1929 г.) пленума ЦК ВКП(б) пастанавіў наступнае: увесці адзінаначалле ў навучальных установах з 1 студзеня 1930 г.; ліквідаваць педагагічныя саветы; перадаць функцыі прыёму і звальнення з работы педагагічных і навуковых кадраў ад НКА непасрэдна адміністрацыі навучальных установ [134, с. 403]. Рэакцыяй на дырэктыўныя рашэнні ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б стала накіраванне на вучобу ў педагагічныя тэхнікумы і педагагічны факультэт БДУ большай колькасці партыйцаў і членаў РКСМ, якія працавалі ў школах. У сувязі з гэтым змяняўся і сацыяльны склад вучнёўства. Так, калі ў 1929 г. у тэхнікумах НКА БССР навучалася 33% выхадцаў з рабочых і 42 % выхадцаў з сялянаў, то ў 1931 г. адпаведна – 22% і 59% [98, с. 16-17].

Неабходна адзначыць і стракаты нацыянальны склад кантынгенту педагагічных тэхнікумаў. У 1929/30 навучальным годзе ў іх навучалася 2620 беларусаў (68,7 %), 948 яўрэяў (24,9 %), 56 рускіх (1,5 %), 148 палякаў (3,9 %) і 39 асоб іншых нацыянальнасцяў (1 %). Усяго ў гэтым навучальным годзе вучылася 3811 чалавек [98, с. 17].

Разам з абвінавачваннямі ў прыналежнасці да "класава чужых элементаў" у 1930-я гг. у рэспубліцы атрымала распаўсюджанне т. зв. "нацдэмаўшчына" – абвінавачванне ў нацыяналізме часткі беларускай інтэлігенцыі, у тым ліку настаўнікаў і выкладчыкаў. У гэты час з'яўляюцца спісы забароненых кніг, якія перашкаджаюць весці заняткі. Па няпоўных дадзеных толькі з красавіка 1932 г. па май 1933 г. было ліквідавана і адпраўлена

ў макулатуру 4 календары, 10 вучэбных праграм, 18 нотна-музычных твораў, 84 назвы падручнікаў і іншай вучэбнай літаратуры. Гэтыя з'явы аказалі самы згубны ўплыў на сферу народнай адукацыі [134, с. 404].

Аднак, у 30-я гг. XX ст. урад рэспублікі прымаў і такія рашэнні, якія дапамагалі атрыманню кваліфікацыі настаўнікам, паляпшалі іх жыццё. Напрыклад, вялікую ўвагу ўрад БССР надзяляў паляпшэнню жыллёва-бытавых умоў навучэнцаў і настаўнікаў, клапаціўся аб умацаванні матэрыяльнай базы. Напрыклад, СНК БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб мерапрыемствах па павышэнню адукацыі настаўнікаў ад 29 мая 1936 г. зазначаў наступнае:

1. Абавязаць Народны Камісарыят асветы ахапіць абавязковай вучобай пры педагагічных навучальных установах настаўнікаў, якія не маюць адпаведнай адукацыі (вышэйшай ці сярэдняй) з тым, каб да 1 жніўня 1938 г. яны маглі здаць іспыты ў адпаведных педагагічных навучальных установах і атрымаць званне настаўніка [46, с. 248].

2. Зацвердзіць наступныя асноўныя формы педагагічнай адукацыі:

- Вячэрнія аддзялення (без адрыву ад працы ў школе) пры ўніверсітэце, педагагічных, настаўніцкіх інстытутах і педтэхнікуме для настаўнікаў сярэдняй, няпоўнай сярэдняй і пачатковай школ, якія не маюць адпаведнай адукацыі (вышэйшай ці сярэдняй) з тым, каб да 1 жніўня 1938 годзе яны маглі прайсці курс педвучылішча або вышэйшай педагагічнай навучальнай установы.
- Экстэрнат за курс універсітэту, педагагічнага, настаўніцкага інстытутаў і педвучылішча, правядзенне летніх курсаў для аказання дапамогі настаўнікам, якія падвышаюць сваю кваліфікацыю шляхам экстэрнату.
- Завочнае навучанне пры ўніверсітэце, педагагічных інстытутах і педтэхнікумаў.

3. У адпаведнасці з гэтым зацвердзіць прыём у завочныя сектары педтэхнікумаў у 1936 г. 5100 чалавек замест 2500, у завочныя сектары ўніверсітэта 2400 чалавек.

4. Стварыць пры Аршанскім, Барысаўскім, Гомельскім, Віцебскім, Мінскім, Магілёўскім, Мазырскім, Полацкім, Рэчыцкім педтэхнікумах і Бабруйскім, Крычаўскім дашкольных педтэхнікумах вячэрнія аддзялення для гарадскіх настаўнікаў, якія не маюць педагагічнага адукацыі. Зацвердзіць прыём на гэта аддзялення - 344 чал. [46, с. 249].

5. Арганізаваць у чэрвені гэтага года паўтарамесячныя курсы для настаўнікаў, якія рыхтуюцца экстэрнам за педтэхнікум, на 2500 чалавек і 1500 настаўнікаў, якія здаюць экстэрнам за педагагічны або настаўніцкі інстытуты.

Акрамя таго, у пастанове адзначаецца, што завочнае навучанне настаўнікаў пастаўленых нездавальняюча і вылучаецца некалькі прычын такога стану:

- Нездавальняючая арганізацыя кансультацый і нізкая якасць іх.
- Нязначны працэнт выканання кантрольных работ.
- Няпоўная яўка завочнікаў на сесію - 65%.
- Недастатковае забеспячэнне падручнікамі і метадычна распрацаванымі праграмамі.
- Адсутнасць кантролю за працай завочнікаў і дапамогі ім з боку загадчыкаў ГоррайОНО і дырэктараў школ [46, с. 250].

У выніку гэтага значны адсотак другагодніцтва, значны адсеў і малалікія выпускі. Таму каб палепшыць справу завочнага навучання, урад БССР пастанаўляе педагогам, якія скончылі шляхам завочнага навучання педагагічны інстытут, прадставіць для падрыхтоўкі да дзяржаўных іспытаў дадаткова месяц адпачынку з захаваннем сярэдняй заработнай платы. Акрамя таго, забяспечыць настаўнікаў-завочнікаў 5 дзён у дэкаду, акрамя выходнага, зусім свабодных ад усялякіх нагрузак і вячэрніх заняткаў. Наркамату асветы, Дзяржплану і Белліту ў адпаведнасці з павелічэннем ахопу настаўнікаў навучаннем неабходна павялічыць тыраж падручнікаў і метадычных указанняў і праграм. Дзяржплану вылучыць на гэта дадатковы фонд паперы 34 т. 470 кг. Для абслугоўвання павялічаных кантынгентаў набору завочнай сістэмы і пашыранай сеткі вячэрніх аддзяленняў адпусціць дадаткова асігнаванні па бюджэце для завочнага навучання і для вячэрніх аддзяленняў 577 254 руб. Усё кіраўніцтва справай вучобы настаўнікаў сканцэнтраваць у Інстытуце павышэння кваліфікацыі кадраў народнай адукацыі, уліўшы туды існуючы пры НКА метадычны кабінет па завочным навучанні [110, арк. 25-26].

Таксама, каб палепшыць умовы жыцця і працы настаўніцтва, была зацверджаная ад 31 сакавіка 1939 г. пастанова СНК БССР "Мерапрыемствы па паляпшэнню матэрыяльна-бытавых умоў настаўнікаў", у якой ішла гаворка пра неабходнасць прадстаўлення настаўнікам сельскай мясцовасці кватэр з палівам і асвятленнем, а ў выпадку непрадстаўлення ў натуры - выплат настаўнікам фактычнага кошту камунальных паслуг ці кошту кватэр, а таксама пэўных грашовых сум за паліва і асвятленне. Урад БССР загадваў пры засяленні ў новыя пабудаваныя жылыя дамы вылучаць жылплошчу для настаўнікаў, а таксама разгарнуць індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва для педагогаў. Для гэтай мэты прапаноўвалася вылучыць ліміт крэдытавання для настаўнікаў і ўсталяваць парадак індывідуальнага крэдытавання [46, с. 295].

У мэтах лепшага абслугоўвання школ і тэхнікумаў інструктарамі-метадыстамі ў пастанове загадвалася забяспечыць іх сродкамі руху (конь, ровар

і г. д.). Таксама неабходна было органам народнай асветы ўсталяваць парадак і памер аплаты сутачных і кватэрных пра раз'ездах у межах раёну. Для паляпшэння дабрабыту настаўнікаў кіраўніцтва навучальных установаў павінна было забяспечыць педагогаў асобнымі агародамі на прышкольным надзеле [46, с. 295-296]. Такім чынам, урад БССР не толькі клапаціўся пра забеспячэнні прыстойнага жыцця настаўнікам рэспублікі, але, разам з тым, імкнуўся з дапамогай захадаў па наладжванні дабрабыту настаўніцтва схіліць педагогаў на свой бок, заахвоціць працаваць у навучальных установах краіны.

Аднак, канец 30-х гг. ХХ ст. у большай ступені знішчыў тыя якасныя змены, за якія змагаліся ў 20-я гг. ХХ ст. беларускія нацыянальныя дзеячы ў сферы адукацыі. Быў пакладзены канец беларусізацыі. А згодна з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад жніўня 1938 г. у Беларускай ССР была праведзена атэстацыя настаўнікаў. Меркавалася, што ў першую чаргу яна павінна будзе адносіцца да асоб, якія не маюць скончанай педагагічнай адукацыі – 20565 чалавек з агульнай колькасці настаўнікаў у рэспубліцы 26869 чал. Перад правядзеннем атэстацыі народны камісар асветы А. Д’якаў даў тлумачэнне правяраючым, што атэстацыя - гэта не чыстка, што задача яе заключаецца не ў пошуку і выкрыцці “ворагаў народа”, а ў выяўленні ўзроўню падрыхтаванасці настаўнікаў, іх прафесіянальных якасцяў. Хутка Д’якаў быў абвінавачаны ў “прытупленні класавай пільнасці і патуранні ворагам народа”. У выніку атэстацыі ў 64 раёнах рэспублікі былі звольненыя з пасад 1328 чалавек з 13332 правераных [134, с. 412].

На канец другой пяцігодкі педагагічны ўзровень настаўніцкіх кадраў характарызаваўся наступным чынам: настаўнікі агульнаадукацыйных прадметаў – з 31240 чалавек на 1 студзеня 1938 г. толькі 2702 педагогі мелі вышэйшую адукацыю, адукацыю ў памеры двухгадовага настаўніцкага інстытуту атрымаў 761 чалавек, 1530 асоб мелі няскончаную вышэйшую, сярэднюю педагагічную адукацыю атрымала 11887 настаўнікаў, а агульную сярэднюю адукацыю – 5472, 8888 чалавек не мелі нават сярэдняй адукацыі [127, арк. 6].

Такім чынам, у сістэму падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў у 1920-1930-я гг. уваходзілі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, двухгадовыя педагагічныя інстытуты, чатырохгадовыя педагагічныя тэхнікумы, а таксама педагагічныя курсы з рознымі тэрмінамі навучання. Створаны ў 1922 г. педагагічны факультэт БДУ з’яўляўся заснавальнікам падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй. Усе гэтыя захады па пашырэнню сістэмы педагагічнай адукацыі прывялі ў першую чаргу да колькаснага росту настаўніцкіх кадраў, да таго ж якасна павышаўся іх адукацыйны ўзровень у сувязі з падзелам педагагічных устаноў на сярэднія і вышэйшыя. Акрамя таго, у

1917-1939 гг. палітыка савецкага ўрада была накіраваная на ўзмацненне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва. Настаўніцтва ў гэтай дзейнасці адыгрывала адну з вядучых роляў. Яно ўдзельнічала ў рабоце ЦВК БССР, гарвыканкамаў, гарадскіх, раённых і сельскіх саветаў, партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыяй, камітэтаў сялянскай грамадскай узаемадапамогі, народных дамоў і дамоў селяніна, у барацьбе з голадам, ахапіўшым краіну ў 1921 г., бандытызмам у 1921-1922 гг., у арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычных кампаніяў. Аднак, нягледзячы на шматлікія станоўчыя зрухі ў сістэме педагагічнай асветы, настаўніцкімі кадрамі напрыканцы 1930-х гг. у поўнай ступені былі забяспечаныя не ўсе прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы. Да таго ж педагагічная адукацыя была досыць ідэалагізаваная, а з-за вялікай колькасці грамадскіх работ у студэнтаў педагагічных навучальных установаў часам не хапала часу на ўласныя заняткі, ад чаго іх адукацыйны ўзровень паніжаўся. Таксама педагогі, нягледзячы на пастановы ўрада, не былі добра забяспечаныя матэрыяльна, што выклікала адток іх са сферы адукацыі ў іншыя, якія больш аплачваліся. Змяніўся і сацыяльны склад настаўніцтва, што ў першую чаргу было звязана з палітычнымі зменамі ў краіне, калі ад адноснага дэмакратызму 1920-х гг. краіна перайшла да таталітарызму 1930-х гг., калі знішчаліся не толькі дэмакратычныя пачаткі ў педагагічнай навуцы, але знішчаліся і самыя носьбіты гэтай навукі - настаўнікі, выкладчыкі і нават камісары асветы.

## 2.3. Станаўленне структуры прафесіянальна-тэхнічнай школы

Галоўнай мэтай савецкай школы ў аднаўленчы перыяд было стварэнне працоўных рук для народнай гаспадаркі, а мэтанакіраванасць і змест вучэбных праграм насілі палітэхнічны характар. Гэта было абумоўлена разрухай у краіне, якая, у сваю чаргу, стала вынікам працяглых войнаў і інтэрвенцыі. Аднаўленне народнай гаспадаркі патрабавала вялікай колькасці працоўнай сілы, таму пашырэнне сеткі прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў было першачарговай задачай савецкай улады.

Прафесіянальна-тэхнічнае навучанне ў дарэвалюцыйнай Беларусі было прадстаўлена шэрагам навучальных устаноў: рамеснымі і тэхнічнымі вучылішчамі, ніжэйшымі рамеснымі сельскагаспадарчымі школамі, курсамі і рамеснымі майстэрнямі, рамеснымі аддзяленнямі і класамі ручной працы пры агульнаадукацыйных школах [1, с. 23].

Прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы савецкага тыпу пачалі стварацца ў аднаўленчы перыяд. У склад устаноў прафесіянальнай адукацыі ўваходзілі прафесіянальныя школы, школы фабрычна-завадскога вучнёўства, вучэбна-практычныя майстэрні, тэхнікумы і прафесіянальныя курсы. У гэты час агульная колькасць гадзін у сярэдніх спецыяльных навучальных установах скарацілася. Шэраг прадметаў, якія ўваходзілі ў план дарэвалюцыйнай школы (гісторыя, лацінская мова, чыстапісанне, філасофія, закон Божы, заканазнаўства) наогул перасталі выкладацца ў савецкі час. Калі казаць пра грамадскія навукі, то камуністычная партыя імкнулася да змяншэння колькасці часоў іх выкладання ў навучальных установах. У адным з палажэнняў аб вышэйшай падрыхтоўцы кваліфікаваных работнікаў гаварылася аб тым, што ў далейшым грамадскія навукі належаць выкладанню пад асабліва пільным кантролем партыі [57, с. 15-19].

У 20-я гг. XX ст. прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы мелі пэўную самастойнасць. Так, 14 мая 1920 г. Галоўны камітэт прафесіянальнай адукацыі зацвердзіў “Палажэнне аб кіраванні прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі тыпа тэхнікумаў і прафесіянальна-тэхнічных школ”. У адпаведнасці з ім агульнае кіраўніцтва дзейнасцю навучальнай установы ажыццяўляў яго савет, у які ўваходзілі заведуючы, прадстаўнікі выкладчыкаў навучальнай установы і адказны кіраўнік практычнымі заняткамі, заведуючы гаспадарчай часткай, прадстаўнікі мясцовага Губпрафадукацыі, прадстаўнікі фабрычна-завадскога камітэту (у выпадку, калі навучальную ўстанову абслугоўвае 2 і больш, то з кожнага фабзаўкома па прадстаўніку), прадстаўнікі Губернскага сацыяльнага выхавання, прадстаўнікі навучэнцаў (па 1 ад кожнага

аддзялення навучальнай установы; у выпадку, калі ўстанова складаецца з аднаго аддзела, у савеце прымаюць удзел 2 яе прадстаўніка), прадстаўнік мясцовага органа РКСМ, адзін прадстаўнік ад абслугоўваючага персаналу навучальнай установы, прадстаўнікі майстроў і служачых па аднаму ад кожнай групы, прадстаўнікі органа самакіравання, урач навучальнай установы [90, арк. 51].

Да задачаў савету прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў адносіліся:

- выданне інструкцый, загадаў і пастаноў па справах, якія тычацца ўсіх бакоў жыцця навучальнай установы;
- выбранне заведуючага навучальнай установай, кіраўніка практычнымі заняткамі і заведуючых аддзяленнямі, у тым ліку і клубнага;
- разгляд і зацвярджэнне справаздач ад навукова-вучэбнай і практычнай дзейнасці навучальнай установы;
- вырашэнне пытанняў ад набыцці і выкарыстанні будынкаў, памяшканняў, зямельных надзелаў і аб прыняцці навучальнай установай на сябе рознага роду абавязальніцтваў;
- разгляд і папярэдняе зацвярджэнне праектаў штатаў і каштарысаў навучальнай установы, прадстаўленне ў органах Галоўнага камітэта прафісіянальнай адукацыі;
- хадайніцтва аб змене і дадатках “Палажэнне аб школе прамысловага працоўнага вучнёўства” і “Палажэння аб кіраванні прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі тыпа тэхнікумаў і прафесіянальна-тэхнічных школ”;
- зацвярджэнне выкладчыцкага і адміністратыўнага персаналу навучальнай установы;
- адкрыццё вучэбна-дапаможных устаноў;
- выбранне рознага роду камісіяў, неабходных для правільнага функцыянавання жыцця навучальнай установы;
- прыняцце ўсіх мераў да забеспячэння нармальнага ходу працы навучальнай установы [90, арк. 51].

Савет навучальнай установы збіраўся не радзей за адзін раз у месяц. Пытанні, якія абмяркоўваліся на паседжанні, вырашаліся большасцю галасоў, пры ўмове, што на сходзе прысутнічала 1/3 частка савету навучальнай установы. Для хуткага вырашэння бягучых пытанняў у навучальнай установе працаваў Прэзідыум, у які ўваходзілі заведуючы навучальнай установай, два члена і два кандыдата да іх.

Прэзідыум выбіраўся саветам навучальнай установы на 1 год. Старшынёй Прэзідыума з’яўляўся заведуючы прафесіянальна-тэхнічнай школай. У кампетэнцыю дадзенага органа кіравання ўваходзілі:

- папярэдняя распрацоўка пытанняў, якія выносіліся на разгляд савету навучальнай установы;
- рашэнне ўсіх пытанняў, якія не ўваходзілі ў кампетэнцыю савету навучальнай установы;
- рашэнне пытанняў, якія трэба было тэрмінова вырашыць і якія адносіліся да кола дзеяння савету;
- запрашэнне выкладчыцкага персаналу і абслугоўваючага практычныя заняткі [90, арк. 52].

Праўда, у 1930-я гг. школьнае самакіраванне было заменена адміністрацыйным апаратам, які кіраваў дзейнасцю ўсіх навучальных устаноў.

У 20-я гг. XX ст. ствараліся ў межах прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі прафесіянальныя школы, якія мелі тэндэнцыю пераўтварацца ў масавы від рабочай асветы. Прафшколы існавалі двух тыпаў: паніжанага і павышанага. Паніжанага тыпу прафшколы камплектаваліся на базе чатырохгодкі і пяцігодкі, тады як павышанага – на базе поўнага курсу сямігадовай школы. Як першыя, так і другія мелі на мэце даць вучням вытворчыя навыкі і спецыяльныя веды, якія неабходныя кваліфікаванаму рабочаму, а таксама агульнаадукацыйную падрыхтоўку, якую прафесіянальныя школы паніжанага тыпу давалі ў аб’ёме ведаў поўнага курсу сямігодкі, а павышанага тыпу – у аб’ёме роўным дзевяцігодцы [46, с. 58-59].

Паводле правілаў прыёму, якія былі выдадзеныя Галоўпрафадукацыі, у прафесіянальныя школы прымаліся падлеткі, якія дасягнулі 14-ці год. Колькасць навучэнцаў на кожным годзе навучання звычайна дасягала 40 чалавек [103, с. 36].

Прафшколы па сваёй спецыялізацыі падзяляліся на сельскагаспадарчыя, індустрыяльна-тэхнічныя, саматужна-рамесныя, будаўнічыя, транспартныя і мастацкія [158, с. 159]. Па працягласці навучання прафесіянальныя школы былі пераважна трохгадовымі, аднак, у рэдкіх выпадках поўны курс навучання ў іх мог складаць 2 і 4 гады, у залежнасці ад спецыяльнасці [158, с. 162-163]. У прафшколах навучальны год звычайна складаў 9 месяцаў, праўда, існавалі і такія прафесіянальныя школы, у якіх заняткі вяліся менш за 8 месяцаў. З 33 даследаваных прафшкол у 1927 г. заняткі ўдзень вяліся ў 18 з іх, увечары – у 2 і ў дзве змены – у 13. Заняткі адбываліся на пастаяннай аснове, кожны дзень [158, с. 173]. Трэба адзначыць, што першапачаткова дакладна вызначаных планаў працы прафшкол не існавала, так, напрыклад, у правілах прыёму ў навучальныя ўстановы БССР за 1924 г. было напісана, што час медыцынскага

агляду, іспытаў і пачатак заняткаў вызначае кожная навучальная ўстанова самастойна і аб'яўляе пра гэта ў мясцовай прэсе [103, с. 37]. Аднак, вядома, што ўжо ў 1927 г. прафесіянальныя школы пачыналі свой навучальны год пераважна ў прамежку ад 1 да 15 верасня, а апошні званок у іх быў ад 1 да 15 чэрвеня [158, с. 168].

У вучэбныя планы прафшкол былі ўключаны заняткі па расійскай мове, гісторыі з геаграфіяй, алгебры з трыганаметрыяй, хіміі і таваразнаўству, французскай і нямецкай мовах [1, с. 186].

У 1920-1930-я гг. асноўным тыпам навучальных устаноў, асноўнай мэтай якіх з'ўлялася непасрэдная падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых для індустрыяльнай прамысловасці, сталі школы фабрычна-завадскога вучнёўства, якія ствараліся непасрэдна на заводах і прадпрыемствах. Гэтыя школы рыхтавалі металістаў, паліграфістаў, электраманцёраў, цесляроў і рабочых іншых прафесіяў, давалі побач са спецыяльнымі агульнаадукацыйныя веды і на працяглы час сталі найбольш эфектыўнай формай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых [25, с. 36]. Праўда, нягледзячы на ўсе намаганні ўрада і адміністрацыі школ ФЗВ, кваліфікацыя працоўных, падрыхтаваных у гэтых школах, была не вельмі высокай, але ва ўмовах недахопу працоўнай сілы ў аднаўленчы перыяд, часу на падрыхтоўку высокакваліфікаваных рабочых не было [29, с. 180].

Школы фабрычна-завадской моладзі камплектаваліся на базе сямігодкі. У адукацыйным плане школы ФЗВ роўныя прафшколам. Тэрмін навучання ў іх працягваўся ад 2 да 3 год, пры гэтым час на вытворчае і тэарэтычнае навучанне дзеліўся пароўну. Час, адведзены на вывучэнне спецыяльных прадметаў, павінен быў перавышаць на 25% час, прадугледжаны на тэарэтычнае навучанне, на сацыяльна-палітычныя прадметы адводзілася не больш чым 15 % часу ўсіх заняткаў у школе. Узрост прымаемых у школы ФЗВ вызначаўся 15 - 17 гадамі, а для прадпрыемстваў са шкоднымі ўмовамі – 17 – 18 гадамі [2, с. 383-384].

У школах фабрычна-завадскога вучнёўства звычайна на курсе вучылася да 50 чалавек [158, с. 159]. У школах працягласць навучальнага году складала 8-9 месяцаў на 1926/27 навучальны год. З 6 існуючых школ ФЗВ у 1927 г. у 2 з іх заняткі праходзілі ўдзень, у 3 – увечары і толькі ў 1 школе ўдзень і ўвечары. Працавалі школы кожны дзень [158, с. 173]. У большасці школ ФЗВ навучальны год пачынаўся ў першай палове кастрычніка, а канец яго прыходзіўся на першую палову чэрвеня [158, с. 168].

Для рамеснага абслугоўвання нізавой сеткі кустарна-прамысловай кааперацыі, сельскай гаспадаркі і непасрэдна вёскі існавала сетка вучэбна-практычных майстэрняў. Гэтыя ўстановы камплектаваліся на базе ведаў у аб'ёме курсу першай ступені (чатырохгадовай школы). Навучальныя майстэрні

мелі саматужна-рамесную спецыялізацыю. Па колькасці вучняў яны моцна адрозніваліся адна ад адной. Так, напрыклад, на 1927 г. у 8 майстэрнях навучалася на 1 курсе да 50 чал., у 5 ад 50 да 99 навучэнцаў, а ў 2 ад 100 да 149 [143, арк. 59]. Працягласць курсу навучання ў майстэрнях складала ад 1 да 3 год, у залежнасці ад складанасці прафесіі, якой імкнецца авалодаць вучань [46, с. 59]. Вучэбна-практычныя майстэрні мелі звычайна дзевяцімесячны навучальны год, праўда, сустракаліся і такія, дзе навучанне працягвалася менш за 8 месяцаў ці больш за 11. Працавалі вучэбныя майстэрні ў пераважнай большасці ўдзень, вечаровыя заняткі праводзіліся толькі ў майстэрнях з двума зменамі. Гэтая асаблівасць тлумачыцца тым, што ў сваёй большасці майстэрні працавалі пры фабрыках і заводах падчас працы дадзеных устаноў, і заняткі ў іх вяліся штодня [146, арк. 73]. У навучальных майстэрнях навучальны год пачынаўся пераважна з 1 па 15 кастрычніка, а сканчаўся ў перыяд з 1 па 15 чэрвеня [146, арк. 68.].

Для падрыхтоўкі кадраў сярэдняй кваліфікацыі па розных спецыяльнасцях у 1920-я гг. разгортвалася сетка індустрыяльных, сельскагаспадарчых, будаўнічых, медыцынскіх, педагагічных і іншых тэхнікумаў. Індустрыяльны тэхнікум рыхтаваў спецыяліста сярэдняй кваліфікацыі – тэхніка як бліжэйшага памочніка інжынера на буйных прадпрыемствах і як самастойнага кіраўніка прадпрыемстваў дробнага і часам сярэдняга памераў. Тэхнікумы камплектаваліся з ліку тых, хто скончыў прафтэхшколы, а так як у пачатковы перыяд усталявання бальшавіцкай улады на беларускіх землях такіх асоб было няшмат – з тых, хто скончыў поўны курс сямігодкі. Па аб’ёму ведаў, што дае тэхнікум, ён з’яўляецца першай прыступкай ВНУ і дае падрыхтоўку для паступлення на другі курс вышэйшай навучальнай установы пэўнага профілю [46, с. 60]. На першы курс прымалі асоб ва ўзросце 18 год і больш. Па колькасці чалавек на курсе тэхнікумы адрозніваліся адзін ад аднаго. Так, з 5 сельскагаспадарчых тэхнікумаў у 1927 г. на адным курсе ў двух з іх вучылася ад 50 да 99 чалавек, у двух іншых – ад 100 да 149, а ў апошнім больш за 200 асоб. У адным будаўнічым тэхнікуме на курсе налічвалася ад 150 да 199 студэнтаў, столькі ж іх было ў сацыяльна-эканамічным. У большасці сваёй на адным курсе ў тэхнікуме навучалася больш за 100 асоб [158, с. 159].

Тэрміны навучання ў тэхнікумах былі розныя. У першую чаргу працягласць навучання залежала ад складанасці спецыяльнасці, якую атрымоўвалі навучэнцы. Так, напрыклад, з 5 сельскагаспадарчых тэхнікумаў 4 з іх былі трохгадовымі і 1 чатырохгадовым, з 2 індустрыяльна-тэхнічных 1 быў чатырохгадовым і 1 пяцігадовым, будаўнічыя тэхнікумы былі чатырохгадовымі, а транспартныя – як чатырохгадовымі, так і двухгадовымі, у

сацыяльна-эканамічных тэхнікумах курс навучання цягнуўся 3 гады, як і ў медыцынскім. Педагагічныя і мастацкія тэхнікумы мелі чатырохгадовы тэрмін навучання [145, арк. 62-63]. У тэхнікумах навучальны год у большасці сваёй цягнуўся да 8-9 месяцаў, аднак былі і такія тэхнікумы, у якіх заняткі вяліся на працягу 11 месяцаў. З 30 тэхнікумаў, якія працавалі ў 1927 г., у 18 з іх праходзілі заняткі ўдзень, у 3 – увечары і ў 9 – удзень і ўвечары, што давала магчымасць атрымоўваць адукацыю большай колькасці жадаючых. Усе яны працавалі штодня [146, арк. 33]. Пачынаўся навучальны год у тэхнікумах пераважна ад 1 да 30 верасня, канец жа яго прыходзіўся ў большасці выпадкаў на 1-15 чэрвеня [145, арк. 35].

Для перакваліфікацыі рабочых, якія занятыя на вытворчасці, існуюць вячэрнія рабочыя тэхнікумы (ВТР). Створаныя яны былі, каб рабочыя без адрыву ад вытворчасці маглі атрымаць вышэйшую ступень кваліфікацыі. Такія вечаровыя рабочыя тэхнікумы былі двух відаў: 1 канцэнтр дае кваліфікацыю дзясятніка, манцёра, майстра, а 2 канцэнтр – кваліфікацыю тэхніка. Тэрмін навучання на абодвух канцэнтрах складаў 3 гады з магчымасцю скарачэння гэтага часу ў залежнасці ад рэальнай магчымасці павелічэння дзённай нагрузкі слухачоў ВРТ за лік скарачэння рабочага дня на вытворчасці. Камплектаванне тэхнікумаў адбывалася на базе падрыхтоўкі ў аб'ёме чатырох класаў сямігодкі і рабочага стажу па адпаведнай спецыяльнасці вытворчасці не менш за 3 гады [46, с. 61]. Праўда, на тэрыторыі БССР вячэрнія рабочыя тэхнікумы не атрымалі шырокага распаўсюду. Так, у 1925/26 навучальным годзе існаваў толькі адзін вячэрні тэхнікум, дзе атрымоўвалі адукацыю 40 студэнтаў, а ў 1926/27 і 1927/28 навучальных гадах іх было два, пры чым у 1927/28 навучальным годзе ў іх вучылася 148 чалавек, а ў 1928/29 – 195 [46, с. 50-51].

Самастойнай групай вучэбных устаноў для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў рабочых з'яўляліся прафесіянальныя курсы, якія былі доўгатэрміновымі і кароткатэрміновымі. Тэрмін навучання на доўгатэрміновых прафкурсах складае больш за 1 год, а на кароткатэрміновых – менш за 1 год. Прафесіянальныя курсы, як і іншыя курсы, насілі характар першаснай адукацыі: падлеткаў і некваліфікаваных рабочых, - а таксама дакваліфікацыі рабочых і спецыялістаў, якія ўжо атрымалі першасную кваліфікацыю. Курсы мелі розныя вучэбныя планы ў залежнасці ад мэтаў і базаваліся на фактычным узроўні агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі навучэнцаў [46, с. 60-61].

У 1925/26 навучальным годзе ў рэспубліцы было 7 прафесіянальныя курсаў. Педагагічныя і землеўпарадкавальныя курсы дзейнічалі ў Мінску, сацыяльна-эканамічныя – 3 у Мінску і 2 у Магілёве. Па мове навучання ў сваёй большасці яны былі змяшаныя (6 з 7). На курсах у 1925/26 навучальным годзе працавала 67 работнікаў асветы, якія навучалі 1075 чалавек [150, с. 36-37].

Курсы па сваё спецыялізацыі падзяляліся на саматужна-рамесныя, транспартныя, сацыяльна-эканамічныя і педагагічныя. Колькасць навучэнцаў у іх вагалася ад некалькіх чалавек да двух соцен асоб [150, с. 159].

Доўгатэрміновыя курсы па сваёй працягласці вагаліся: былі двухгадовыя саматужна-рамесныя і педагагічныя, а таксама двух- і трохгадовыя сацыяльна-эканамічныя і транспартныя [158, с. 162-163.]. Навучальны год у доўгатэрміновых курсах цягнуўся пераважна 9 месяцаў. Заняткі ў 1927 г. на 21 з іх вяліся ў 8 удзень, у 11 увечары і толькі ў 2 і ў дзень, і ў вечары. Працавалі курсы кожны дзень [158, с. 173]. Навучальны год на большасці прафесіянальных курсах пачынаўся ў прамежку з 1 па 15 кастрычніка, а канец году прыходзіўся ў іх на 1-15 чэрвеня [158, с. 168].

Трэба зазначыць, што адрозніваліся навучэнцы прафесіянальна-тэхнічных навучальных установ не толькі па прыналежнасці да пэўнага сацыяльнага пласта насельніцтва, але і сваёй нацыянальнасцю. Так, у 1925/26 навучальным годзе працавала 73 установы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, праўда, толькі 70 з іх падалі звесткі пра стан сваіх справаў. Так, у гэтым 70 установах навучалася ўсяго 8540, з іх беларусаў было 4870, рускіх – 644, яўрэяў – 2735, палякаў – 195, асоб іншых нацыянальнасцяў - 96. У тэхнікумах сітуацыя з нацыянальным складам выглядала наступныя чынам: у 24 тэхнікумах, якія падалі звесткі, вучыўся 4171 студэнт, з іх беларусаў налічвалася 2467, рускіх – 349, яўрэяў – 1199, палякаў – 117, асоб іншых нацыянальнасцяў – 39. У 31 даследаванай прафшколе на 1925/26 навучальны год атрымлівалі прафесіянальна-тэхнічную адукацыю 2730 чалавек, з якіх 1502 былі беларусамі, 138 – рускімі, 1012 – яўрэямі, 53 – палякамі і 25 асоб былі іншай нацыянальнасці. У сетцы школ фабрычна-завадскога вучнёўства, якія падалі звесткі, навучалася 48 асоб, з якіх 30 па нацыянальнасці былі беларусамі, 1 рускім, 9 яўрэяў, 8 палякаў. На 7 прафесіянальных курсах у 1925/26 навучальным годзе атрымлівалі прафесіянальныя веды 1075 чалавек, з якіх беларусамі па нацыянальнасці былі 503 асобы, рускімі – 77, яўрэямі – 466, палякамі – 5, а прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў налічвалася ўсяго 24 асобы.У навучальных майстэрнях у тым жа годзе навучалася 516 асоб, 368 з іх прызнавалі сябе беларусамі, 79 – рускімі, 49 – яўрэямі, 12 – палякамі і 8 асоб мелі іншую нацыянальнасць (Дадатак В) [150, с. 35-36].

Акрамя таго, вядома, што з усталяваннем савецкай улады на тэрыторыі рэспублікі асобы абодвух палоў маглі атрымоўваць адукацыю, у тым ліку і прафесіянальна-тэхнічную. Хаця жанчыны, якія атрымалі маглі вучыцца, у прафесіянальна-тэхнічных установах былі прадстаўленыя не вельмі шырока на некаторых спецыяльнасцях, у сілу іх спецыфікі. Вядома, што ў 1925/26 навучальным годзе ў 70 навучальных установах прафесіянальна-тэхнічнай

адукацыі, якія падалі звесткі пра сваю працу, вучылася ўсяго 8540 асоб, з якіх толькі 2519 былі жаночага полу, што складае 29,5 % ад агульнай колькасці навучэнцаў, пры чым у тэхнікумах 42,1 % ад агульнай колькасці навучэнцаў былі жанчынамі, у прафшколах – 10,9 %, у школах фабрычна-завадской моладзі – 47,9 %, на прафкурсах – 39,6 %, а ў навучальных майстэрнях толькі 3,5 % ад агульнай колькасці навучэнцаў у іх былі жаночага полу [150, с. 38-39]. Такая сітуацыя тлумачыцца спецыфікай кожнай навучальнай установы. Так, напрыклад, вядома, што ў 1927 г. на сельскагаспадарчых спецыяльнасцях тэхнікумаў навучалася 19 жанчын з 226 студэнтаў, на індустрыяльна-тэхнічных – 1 з 80, на транспартных – 15 з 76, на будаўнічых 1 з 54, на сацыяльна-эканамічных – 20 з 45, на медыцынскіх – усе жанчыны (54), на педагагічных – 20 з 340, на мастацкіх – 2 з 13. У прафшколах у 1927 г. на сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў атрымоўвалі адукацыю 56 чалавек, з іх 13 жанчын, на індустрыяльна-тэхнічнай спецыяльнасці з 433 асоб 24 жанчыны, на саматужна-рамеснай – з 58 30 жанчын, на транспартнай – з 30 11, на будаўнічай – з 58 2, на мастацкай са 107 94 жанчыны [158, с. 227]. У школах фабрычна-завадской моладзі ў 1927 г. на спецыяльнасці пасадчыкі не было ні адной жанчына, на спецыяльнасці гарбары ўсяго адна з 12 асоб, на спецыяльнасці банкаброшнікі на тэкстыльна-вытворчых школах ФЗВ атрымлівала адукацыю адна жанчына, на спецыяльнасці ватэршчыкі – адна жанчына з 5 асоб, на спецыяльнасці па папяровай вытворчасці з 16 асоб, якія ёй авалодвалі, 5 было жанчын, на спецыяльнасці набіральнікі было 4 жанчыны з 11 навучэнцаў, на іншых паліграфічных спецыяльнасцях жанчыны не вучыліся, як і на транспартных [158, с. 224]. Навучальныя майстэрні скончылі ў 1926/27 навучальным годзе па спецыяльнасцях апрацоўка металу, апрацоўка дрэва, абутнікі толькі мужчыны, тады як па швейнай спецыяльнасці толькі жанчыны. Доўнатэрміновыя курсы па спецыяльнасці швейнікі таксама скончылі толькі жанчыны, а на спецыяльнасці рахункаводы вучыліся як мужчыны, так і жанчыны, якіх было 38 з 65 асоб агульнага складу [158, с. 225].

Таксама, трэба адзначыць, што нягледзячы на ўсе захады савецкага ўраду па ўдасканаленні сістэмы і структуры прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, да канца 30-х гг. XX ст. не былі вырашаныя некаторыя праблемы. У першую чаргу, так і не стала навучанне ва ўсіх тыпах прафесіянальна-тэхнічных навучальных установаў бескаштоўным, не былі пераадоленыя класавыя супярэчнасці, таму прафесіянальна-тэхнічная школа так і засталася класавай, толькі адзін пануючы клас быў заменены іншым, акрамя таго не былі дасягнутыя пастаўленыя мэты ў забеспячэнні патрэбнай колькасцю прафесіянальных кадраў прамысловасці. У першую чаргу гэтая праблема тычылася забеспячэння вытворчасці тэхнікамі, якіх рыхтавалі ў першую чаргу

тэхнікумы, такія як: Мінскі палітэхнікум рыхтаваў гідратэхніка, Віцебскі тэхнікум – тэхнікаў па металаапрацоўцы, станкабудаўніцтву і зімнай апрацоўцы металу, па цеплатэхніцы і тэхніка-электрыка, Мінскі будаўнічы тэхнікум – тэхнікаў па жыллёваму прамысловаму будаўніцтву і па ацяпленню і вентыляцыі, Гомельскі тэхнікум – тэхніка па будаўнічым матэрыялам, Швейна-тэкстыльны тэхнікум – швейнікаў і тэкстыльшчыкаў, Тэхнікум харчовай прамысловасці – тэхнікаў п хлебапячэнню, па кандытарскім вырабам і тэхніка-брадзільшчыка, Запалкавы тэхнікум – тэхніка па запалцы і Бабруйскі дрэваапрацовачны – тэхніка па механічнай дрэваапрацоўцы [127, арк. 69]. Так, на канец 1938 г. захоўваўся недахоп тэхнікаў у наступным памеры: хімічнай прамысловасці патрабавалася 56 тэхнікаў, металаапрацовачнай – 131, дрэваапрацовачнай – 180, тэкстыльнай – 274, швейнай – 117, абутковай – 81, торфаздабываючай – 56 і харчовагуставай – 257 асоб [127, арк. 68].

Такім чынам, на працягу 1917–1939 гг. была сфармаваная пэўная структура прафесіянальна-тэхнічных устаноў, якая дапамагала пашырыць сетку прафесіянальных устаноў, якія рыхтавалі кваліфікаваных кадраў для савецкай прамысловасці. У гэты час былі дакладна ўсталяваныя тэрміны навучання, былі падрыхтаваныя вучэбныя планы і праграмы, што рабіла больш эфектыўнай дзейнасць прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў. Хаця нягледзячы на ўсе намаганні колькасці прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў была недастатковая для забеспячэння прафесіянальнымі кадрамі ўсіх галін народнай гаспадаркі і прамысловасці. Наогул сістэме сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальна адукацыі ў БССР складана даць аднабаковую адзнаку. З аднаго боку нельга не пагадзіцца з тым, што сетка прафесіянальна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў пры Савецкай уладзе пашыраецца. З'яўляюцца новыя спецыяльнасці. Разруха ў краіне і эканамічнае адставанне ад Захаду патрабавалі ад новай Савецкай улады стварэння як мага больш спрыяльных умоў для развіцця прамысловасці ў краіне, што прадугледжвала ў сваю чаргу развіццё спецыяльнай і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

З другога боку, паколькі Савецкая ўлада галоўнай мэтай ставіла падрыхтоўку як мага большай колькасці рабочых, то і сістэму сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі Камуністычная партыяператварыла ў своеасаблівы “камбінат” працоўных рук. У праграмах навучальных устаноў зніклі такія прадметы, як лацінская мова, амаль не вывучалася філасофія, мала ўвагі надавалася літаратуры, што хутчэй за ўсё, прыводзіла да зніжэння агульнага ўзроўню адукаванасці навучэнцаў.

Паколькі галоўнай падтрымкай савецкай улады былі менавіта рабочыя і сяляне, то і сістэма адукацыі ў БССР адпавядала інтарэсам гэтых слаёў насельніцтва. Калі ў царскай Расіі асноўную частку праграм складалі

гуманітарныя навукі, то ў савецкай сістэме народнай адукацыі перавага аддавалася прыродазнаўчым і тэхнічным навукам, што безумоўна было прадыктавана патрэбамі эканомікі.

Неабходнасць хуткай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў прыводзіла да скарачэння гадзін у праграмах, што ў сваю чаргу ўплывала на якасць адукацыі. Яшчэ адным адмоўным момантам было тое, што ў сваім імкненні зрабіць адукацыю прывілегіяй працоўных і сялянаў, Камуністычная партыя ставіла ў дыскрымінацыйнае становішча іншыя пласты насельніцтва. Дарэвалюцыйныя навучальныя ўстановы, у якіх навучаліся дзеці вышэйшых слаёў насельніцтва, былі зачынены, а ў новых навучальных установах пры паступленні перавага аддавалася рабочым і сялянам.

# ГЛАВА 3

# РАЗВІЦЦЁ СЕТКІ ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-ТЭХНІЧНЫХ ШКОЛ

## 3.1. Заснаванне школ фабрычна-завадскога тыпу і дзейнасць вучэбна-практычных майстэрняў

Школы фабрычна-завадскога вучнёўства з’яўляліся асноўнай формай падрыхтоўкі рабочых масавай кваліфікацыі для індустрыяльнай прамысловасці ў БССР у 1917-1939 гг. Першыя школы ФЗВ паўсталі як форма рэарганізацыі рамеснага вучнёўства і школ-клубаў рабочай моладзі ў навучальныя ўстановы пры прадпрыемствах. Яны ўзніклі ў выніку двух прычын: патрэб прамысловасці ў кваліфікаванай рабочай сіле і неабходнасці адукацыі вялікай колькасці падлеткаў, занятых на вытворчасці.

Як сістэма, фабрычна-завадское вучнёўства ўключала ў сябе шэраг звёнаў:

1. падрыхтоўка да пэўнай прафесіі шляхам працоўнай адукацыі ў працэсе вытворчасці;
2. агульнатэарэтычная адукацыя, якая дапамагала падлеткам усвядоміць працэс вытворчасці і атрымаць дастатковае агульнакультурнае развіццё;
3. грамадска-палітычная праца, якая выхоўвала вучняў школ ФЗВ, рыхтавала савецкага чалавека, які павінен быў змагацца за ідэі свайго класа;
4. фізічнае выхаванне, якое гартавала здароўе і моц падлеткаў;
5. клубныя самадзейныя заняткі [53, арк. 55].

У 1921 г. Саюзам металістаў было прынята “Палажэнне аб завадскім вучнёўстве ў металаапрацоўчай прамысловасці”. У школы ФЗВ прымаліся падлеткі ад 14 да 18 гадоў з адукацыяй прыкладна ў аб'ёме школы І ступені (чатырохгадовай школы). Тэрміны навучання ў школах у 1920-я - пачатку 1930-х гг. складалі 2-4 гады. Навучальныя планы ўключалі агульныя (агульная тэхналогія, чарчэнне, машыназнаўства, механіка, матэрыялазнаўства, арганізацыя вытворчасці і інш.), спецыяльныя (спецтэхналогіі, спецкурсы) і агульнаадукацыйныя дысцыпліны. На вытворчае навучанне адводзілася ад 40 да 60% вучэбнага часу [159, арк 22].

Школы ФЗВ разглядаліся як формы класавага выхавання пралетарыяту, прыём прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп быў строга абмежаваны. У 1922 г. школы ФЗВ былі ўключаныя ў сістэму народнай адукацыі БССР як

разнавіднасць агульнаадукацыйнай школы, якая давала адначасова прафесіянальную падрыхтоўку і дазваляла працягваць навучанне ў школах II прыступкі, тэхнікумах або на рабфак. Школы ФЗВ выклікалі шырокую палеміку па пытанні аб задачах прафесійна-тэхнічнай школы, яе агульнаадукацыйнай функцыі і тэрмінах навучання (А.К. Гасто, Н.К. Крупская, А.В. Луначарскі і інш.). Перавод часткі школ ФЗВ на базу сямігодкі дазволіў скараціць тэрміны навучання і аб'ём агульнай адукацыі. Вылучыліся школа вучнёўства масавых прафесіяў (ШУМП), школа ФЗВ па падрыхтоўцы рабочых-універсалаў сярэдняй кваліфікацыі, школа ФЗВ для навучання высокакваліфікаваных рабочых-усталёўшчыкаў [94, арк. 10-11].

Школ фабрычна-завадскога вучнёўства ў 1925/26 навучальным годзе было тры. Дзве з іх знаходзіліся ў Мінску і рыхтавалі персанал для вырабу чыгуначнага транспарту, а адна ў с. Маркоўшчына. Пра апошнюю школу ФЗВ ёсць больш падрабязныя звесткі, чым пра дзве першыя. Так, у с. Маркоўшчына знаходзілася тэкстыльная школы ФЗВ з расійскай мовай навучання. У ёй працавалі 5 чалавек, якія неслі свае веды 48 навучэнцам, з якіх 25 былі мужчынскага полу, а 23 – жаночага [150, с. 36-37]. У 1926/27 навучальным годзе школ фабрычна-завадскога вучнёўства ў БССР было 7, у 1927/28 – 13, у 1928/29 – 16. У іх атрымлівалі прафесіянальна-тэхнічную адукацыю адпаведна 693, 1004 і 1103 асобы [46, с. 50-51].

З прыняццем Дэкрэту СНК РСФСР ад 17 сакавіка 1926 г. “Аб зацвярджэнні Палажэння аб прафесіянальна-тэхнічных школах” быў заканадаўча зацверджаны ніжэйшы ўзровень сістэмы прафесіянальна-тэхнічнага навучання ў краіне. У агульнай частцы гэтага Палажэння сцвярджалася, што школы ФЗВ “… з’яўляюцца ніжэйшымі прафесіянальна-тэхнічнымі вучэбнымі ўстановамі, якія маюць на мэце падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых і ніжэйшага адміністрацыйна-тэхнічнага персанала для розных галін гаспадаркі…”. Навучанне ў школах ФЗВ было бескаштоўным [101, арк. 67-68].

У пастанове СНК СССР ад 30 сакавіка 1929 г. “Аб школах фабрычна-завадскога вучнёўства” практычным бокам было прыняцце рашэння аб передачы школ ФЗВ на баланс прамысловых прадпрыемстваў з мэтай стварэння тэхнічна ўкамплектаванай базы ніжэйшага ўзроўню прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. І як вынік, рацыянальным бокам пытання з’явілася падрыхтоўка кадраў кваліфікаваных рабочых успатрабаваных спецыяльнасцяў для тых прамысловых прадпрыемстваў, на балансе якіх утрымліваліся дадзеныя школы ФЗВ [101, арк. 69].

З пачаткам правядзення політэхнізацыі ўсеагульнага навучання ў краіне было прынята рашэнне ўзняць эфектыўнасць адукацыі ў школах ФЗВ як

фундаментальнай асновы гэтага працэсу, што знайшло адлюстраванне ў пастанове СНК СССР ад 8 чэрвеня 1931 г. "Аб мерапрыемствах па ўдасканаленню працы школ ФЗВ, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні УСНХ СССР і саюзных рэспублік". У дакуменце былі распрацаваныя не толькі фінансавыя пытанні капітальнага будаўніцтва і абсталявання школ фабрычна-завадскога вучнёўства, але разглядаліся і пытанні аб кантынгенце прыёму навучэнцаў, іх узросце, умовах прыёму, а таксама вызначаліся дыферэнцыяваныя тэрміны навучання для асноўных профіляў, якія рыхтавалі кваліфікаваных рабочых, сыходзячы з максімальнага тэрміна навучання ў ФЗВ, які на 1931 г. складаў два гады [101, арк. 69]. Гэта быў яшчэ адзін якасны крок ў рэфармаванні ніжэйшага ўзроўню прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў.

У 1932 г. з мэтай паляпшэння адукацыйнай падрыхтоўкі падлеткаў, якія паступалі ў школы ФЗВ на базе фабрычна-завадской сямігодкі, былі арганізаваныя курсы да завадскога вучнёўства па вядучых спецыяльнасцях: вугальнай, металургічнай, машынабудаўнічай і чыгуначнага транспарту [101, арк. 69-70]. Фактычна, курсы дазавуча ўзмацнілі падрыхтоўку паступаючых, і, як вынік, палепшылі адукацыйны ўзровень выпускнікоў школ фабрычна-завадскога вучнёўства.

Аднак, патрэба ў кваліфікаваных кадрах масавых прафесіяў так і не была вырашаная, таму 15 верасня 1933 г. ЦВК сумесна з СНК СССР прынялі спецыяльную пастанову аб развіцці школ фабрычна-заводскага вучнёўства. У ёй адзначаліся дасягненні ўказаных школ у падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых, а таксама пазначалі недахопы ў рабоце школ ФЗВ: тэрміны навучання занадта доўгія і іншы раз аднолькавыя пры атрыманні простых і складаных спецыяльнасцяў, вучэбныя планы загружаныя агульнаадукацыйнымі прадметамі, падрыхтоўка рабочых некаторых прафесіяў перавышае патрэбы вытворчасці. Таму ў пастанове ставілася задача перабудаваць школы ФЗВ так, каб звузіць іх функцыі, зрабіць рэзервам прамысловых прадпрыемстваў, скіраваць іх намаганні на падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых масавых прафесіяў. Тэрмін навучання змяншаўся з 2 гадоў да 1 года ці 6 месяцаў у залежнасці ад складанасці спецыяльнасці. Камплектаваць школы ФЗВ прадугледжвалася толькі тымі асобамі, якія скончылі сямігодку. Адзначалася, што кожны, хто скончыў школу ФЗВ, абавязаны па вызначэнню адпаведнай гаспадарчай арганізацыі адпрацаваць на вытворчасці не менш чым 3 гады па сваёй спецыяльнасці. Пастанова патрабавала істотнага перагляду вучэбных планаў і праграм, умацавання непасрэдна прафесіянальнай падрыхтоўкі навучэнцаў, павышэння арганізаванасці ўсяго вучэбнага працэсу [137, с. 375].

Абсалютная большасць вучэбнага часу ў шасцімесячных і гадавых школах ФЗВ адводзілася на вытворчае навучанне: у першых – 750 гадзін, у другіх – 1400 пры агульнай колькасці гадзін 1030 і 1850 адпаведна. З тэарэтычных прадметаў у вучэбным плане значыліся спецыяльная тэхналогія, спецыяльнае матэрыялазнаўства і чытанне чарцяжоў [137, с. 376].

З праграмы вытворчага навучання выключалася вывучэнне сумежных работ, звестак аб сумежных спецыяльнасцях, лічылася залішнім шырокае вывучэнне дадзенай галіны прамысловасці. Праграма вытворчага навучання ліквідавала вывучэнне асноўных прыёмаў, аперацый і комплексаў, аваloданне якімі дыктавалася кваліфікацыйнымі патрабаваннямі вывучаемых спецыяльнасцяў на ўзроўні 3 – 4 разрадаў. Тут жа прадугледжваліся заняткі для выканання трэніровачных практыкаванняў. Галоўнай задачай тэарэтычнага навучання з’яўлялася ўзбраенне навучэнцаў ведамі пра ўстройства і работу асноўнага абсталявання, на якім прыйдзецца працаваць, па тэхніцы бяспекі і арганізацыі працы непасрэдна на рабочым месцы дадзенай спецыяльнасці [137, с. 376 - 377].

У гэты час школы ФЗВ яшчэ больш умацавалі сувязь з прадпрыемствамі, што прывяло да таго, што ў школах розных ведамстваў паступова складваліся вучэбныя планы, якія значна адрозніваліся паміж сабой. З аднаго боку гэта была станоўчая з’ява, бо дазваляла больш поўна ўлічыць інтарэсы канкрэтнага прадпрыемства, асаблівасці вытворчага працэсу і ўмоў працы, з другога баку, змест прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў розных школах ФЗВ стаў адрозніваццa нават пры падрыхтоўцы рабочых адной і той жа спецыяльнасці [1, с. 387].

У 1930-я гг. ФЗВ выпускалі 10,2 % усіх падрыхтаваных рабочых, што далёка не адпавядала задачы рыхтаваць праз ФЗВ не менш як 60 % кваліфікаваных кадраў. Нягледзячы на тое што будаўніцтва памяшканняў для ФЗВ уваходзіла ў агульны план капітальных работ 1930 г. як першачарговае будаўніцтва, з выдзеленых 750 тыс. руб. значная частка была недаасвоена. Таму ў многіх школах заняткі праходзілі ў 2 змены, а навучэнцы жылі ў бараках і клубах [1, с. 384].

У 1935 г. урад СССР прыняў рашэнне аб павелічэнні тэрміну навучання ў школах ФЗВ да 1,5 – 2 гадоў, што дазволіла значна пашырыць і паглыбіць тэарэтычную падрыхтоўку навучэнцаў і вытворчае навучанне [1, с. 390].

У 1934 г. школ фабрычна-завадскога вучнёўства ў рэспубліцы налічвалася 13, у якіх вучылася 1738 асоб, праўда, 624 з іх выбылі ў гэты ж год. У 1935 г. у школах ФЗВ навучалася 1446 вучняў, з якіх 597 так і не давучылася да канца. Прычыны, паводле якіх навучэнцы не канчалі школы былі рознымі. Так, 21,3 % з іх былі адлічаныя за непаспяховасць, 22,3 % - за ненаведванне

заняткаў ці парушэнне вучэбнай дысцыпліны, 8,9 % пакінулі навучанне з-за адсутнасці інтэрнатаў, а 4% - з-за змены працы, пераводу ў іншую навучальную ўстанову і інш [40, с. 106-107].

Што тычыцца вучэбна-паказальных майстэрняў, то яны засноўваліся з мэтаю задавальнення патрэбаў, галоўным чынам, сельскага насельніцтва ў прафесіянальна-тэхнічных ведах, неабходных яму ў занятках сельскай гаспадаркай, а таксама для забеспячэння патрэб саматужнай прамысловасці ў дасканалейшых прыёмах вытворчасці, для паляпшэння якасці вырабаў, маючы на ўвазе механізацыю працы. Вучэбна-паказальныя майстэрні маглі мець некалькі аддзяленняў па спецыяльнасцям. Іх адчынялі з дазволу Губернскага камітэту прафесіянальнай адукацыі, які паведамляў пра тое Галоўнаму камітэту. Навучальна-паказальныя майстэрні, якія знаходзіліся ў сферы дзейнасці Галоўнага камітэту саматужнай прамысловасці, паведамляюць Галоўпрафасветы аб пачатку сваёй працы, рэгіструючыся ў Губпрафадукацыі [61, арк. 15].

Працягласць курсу ў навучальных майстэрнях складала каля трох год. Аб'ём прадметаў усталёўваў савет навучальнай установы прымяняльна да спецыяльнасцяў, прыкладных навучальных планаў і праграм, выдадзеным Галоўпрафадукацыі, і зацвярджаліся Губпрафадукацыі. Падчас навучання ў майстэрнях маглі прымацца прыватныя замовы, калі яны прадстаўлялі інтарэс у навучальным працэсе. Замовы масавага характару не дапускаліся [159, арк. 2].

Пры майстэрнях арганізоўваліся залежна ад спецыяльнасці бібліятэкі, лабараторыі, музеі ўзораў, фермы і інш. пры неабходнасці. У ідэале заняткі пачыналіся 1 верасня і сканчаліся 1 ліпеня. У навучальныя майстэрні прымалі асоб як мужчынскага, так і жаночага полу, якія скончылі 4 класы агульнаадукацыйнай школы ці валодалі адпаведным узроўнем развіцця, а таксама практыкантаў для ўдасканалення атрыманых уменняў на вытворчасці. Навучанне ў вучэбна-паказальный майстэрнях было цалкам бескаштоўным [159, арк. 2].

Заведуючы навучальнай майстэрняй абіраўся з асоб, якія скончылі прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы па спецыяльнасці майстэрні. Настаўнікі агульнаадукацыйных прадметаў – з асоб, якія мелі права выкладаць у школах І ступені. Настаўнікі спецыяльных прадметаў – з асоб, якія мелі прафесіянальна-тэхнічную адукацыю. Майстры – з асоб з практычным стажам па спецыяльнасці не меншым за тры гады. Заведуючы і выкладчыкі зацвярджаліся Губернскім Камітэтам прафесіянальнай адукацыі і тымі органамі, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца, майстры і служачыя – саветам вучэбна-паказальнай майстэрні [54, арк. 6].

У абавязкі савету вучэбна-паказальнай майстэрні ўваходзілі складанне каштарысаў, зацвярджэнне гадавой справаздачы, праверка рахункаў, прыём матэрыялаў, засведчанне прыходна-расходных кніг, ацэнка паспяховасці навучэнца, залічэнне вучняў майстэрні [159, арк. 2].

Да задачаў майстэрняў, якія мелі ўхіл у бок абслугоўвання саматужных промыслаў, адносіліся арганізацыя арцеляў з ліку асоб, якія скончылі майстэрні і размеркаванне іх, а таксама кіраўніцтва дзейнасцю арцеляў па загадзе губернскіх органаў Галоўнага камітэта прафесіянальнай адукацыі.

У штат практычнай майстэрні ўваходзілі заведуючы, настаўнікі агульных прадметаў, выкладчыкі спецыяльных прадметаў, майстры (на 15-20 вучняў – 1 майстар), справавод-рахункавод, вартаўнік-прыбіральнік. Пры гэтым адзін з педагогаў з'яўляўся сакратаром савету. Пры патрэбе магла быць уведзеная пасада агента па даручэннях для кіравання гаспадарчай часткаю і асабістымі кантактамі з установамі гаспадарчых справах [159, арк. 3].

З прычыны разнастайнасці задач, якія ставіліся вучэбна-паказальным майстэрням мясцовай прамысловасцю, і чыста школьных мясцовых умоў (памяшканне, абсталяванне, педагагічны персанал і г. д.), навучальныя планы прадугледжваюць існаванне двух тыпаў майстэрняў: нармальны (асноўны) і пераходны (спрошчаны), з больш сціснутым, на карысць практычных заняткаў, тэарэтычны курсам. Вучэбныя планы падвоеных, то бок тых майстэрняў, якія складаюцца з двух аддзелаў, атрыманыя шляхам камбініравання вучэбных планаў для адзінарных майстэрняў, якія складаліся з аднаго аддзелу [159, арк. 3]. Навучальныя планы вучэбна-паказальных майстэрняў разлічаны на асоб, якія ўмеюць пісаць без асабліва грубых арфаграфічных памылак і вырашаць задачы на чатыры дзеяння над цэлымі шматзначнымі лікамі: складовымі найменнымі для слясарна-такарных майстэрняў, простымі для ўсіх астатніх, і толькі для майстэрняў пераходнага тыпу па слясарна-кавальскай і цярлярна-беладрэвавай спецыяльнасцям адназначнымі цэлымі, бо яны маюць слабейшую падрыхтоўку [54, арк. 10]. Практычныя заняткі вяліся ў тыдзень па 28 гадзін. У большасці планаў – суцэльныя практычныя заняткі займалі не менш за паўгады [159, арк. 3].

У навучальна-практычных майстэрнях па абслугоўванню сялянскай гаспадаркі кожны навучэнец вывучае два рамяства: сталярна-цяслярнае і слясарна-кавальскае, і спецыялізуецца на адным з іх, а ў майстэрнях астатніх тыпаў – толькі адно рамяство: простае (напрыклад, цяслярнае, слясарнае) ці складанае (напрыклад, слясарна-кавальскае, слясарна-такарнае). Пры чым падзел вучняў слясарна-такарных аддзяленняў магчымы толькі пры наяўнасці ў майстэрні выключна добрага абсталявання для кожнага жадаючага авалодаць дадзенай спецыяльнасцю. Майстэрні звычайнага тыпа па слесарна-такарнай

спецыяльнасці павінны быць абсталяваныя станкамі ў такой колькасці, каб кожны вучань на працягу поўнага курсу навучання выканаў не толькі элементарныя такарныя работы, але і цэлы шэраг практыкаванняў, дастатковых для таго, каб скончыць курс гатовым рамеснікам, хаця б у адносінах да выканання хадавых таварных работ; калі ж такарных станкоў недастаткова, ці зусім няма, то такая майстэрня прылічваецца да тыпу слесарна-кавальскіх. Для дрэвааздобных майстэрняў абсталяванне пільнымі, даўбёжнымі, фугавічнымі і інш. станкамі пажадана, але не абавязкова [159, арк. 4].

На 1925/26 навучальны год у Беларускай ССР налічвалася 7 вучэбных майстэрняў, у якіх вучылася 516 асоб, пры чым 498 мужчынскага полу і толькі 18 жаночага. Слесарна-кузнечныя вучэбныя майстэрні знаходзіліся ў Быхаве і Рагачове, слесарна-сталярная – у с. Грэбенеў і ў с. Цецерана, слесарна-кузнечная і сталярная – у с. Коханава, паравозна-слесарныя – у Віцебску і Воршы [150, с. 36-37].

У саматужна-рамесных навучальных майстэрнях у 1927 г. са 130 чалавек колькаснага складу ўсе 130 атрымоўвалі стыпендыі з бюджэту дзяржавы [158, с. 164]. У тым жа годзе ў 4 саматужна-рамесных навучальных майстэрнях вучылася каля 500 асоб і 202 з іх былі прадстаўлены месцы ў інтэрнатах, якія былі разлічаныя толькі на 155 чалавек [158, с. 165]. За навучанне ў навучальных майстэрнях не плаціў ніхто [158, с. 218].

Вучэбна-практычныя майстэрні па сваёй колькасці ў 1927/28 навучальным годзе дасягнулі 8, у наступным годзе іх колькасць заставалася нязменнай. У іх вучылася 614 чалавек штогод (Дадатак Г) [46, с. 50-51].

Такім чынам, школы ФЗВ сталі масавай формай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, а навучальныя майстэрні – дапаможнай навучальнай установай, якая давала прамысловыя навыкі ў аб'ёме, неабходным для абслугоўвання саматужнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. За 1920-1930-я гг. у іх структуры навучання і праграмах адбыліся значныя змены: скарачаліся і павялічваліся тэрміны навучання, змяняліся выкладаемыя прадметы, а таксама правілы прыёму ў майстэрні. Не было дастатковай колькасці педагагічных кадраў для працы ў іх, часам некаторыя настаўнікі не мелі адпаведнай кваліфікацыя, як і майстры. Спецыфічнай рысай школ ФЗВ і майстэрняў з'яўлялася іх прывязанасць да прадпрыемстваў, а таксама выкананне пэўных замоваў, з мэтай атрымання неабходных навыкаў. Аднак, нягледзячы на ўсе захады савецкай улады па ўдасканаленню працы ў школах і майстэрнях, прамысловасць і народная гаспадарка так і не былі забяспечаныя патрэбнай колькасць кваліфікаваных кадраў у поўным аб'ёме.

## 3.2. Утварэнне прафесіянальных школ і курсаў

Прафесіянальныя школы з'яўляліся ніжэйшымі прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі, якія мелі мэтай падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых і ніжэйшага адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу для розных галін народнай гаспадаркі, а таксама распаўсюджванне сярод насельніцтва спецыяльных і тэхнічных ведаў. Прафшколы адчыняліся, рэарганізаваліся і зачыняліся краявымі, абласнымі, губернскім і акруговымі выканаўчымі камітэтамі па планах, узгоднеfísicos з Народным Камісарыятам асветы і знаходзіліся ў падпарадкаванні адпаведных мясцовых аддзелаў народнай адукацыі.

Пры прафесіянальных школах маглі арганізоўвацца з дазволу мясцовых аддзелаў народнай адукацыі кароткатэрміновыя і эпізадычныя курсы і лекцыі, у адпаведнасці са спецыяльнасцю школы.

Вучэбная работа ў прафесіянальных школах праводзілася на падставе вучэбных планаў і праграм, якія распрацоўваліся Галоўным упраўленнем прафесіянальнай адукацыі Народнага Камісарыята асветы, з удзелам зацікаўленых ведамстваў, і зацвярджаліся Дзяржаўным навуковым саветам. Адпаведныя мясцовыя аддзелы народнай адукацыі па дамове з мясцовымі зацікаўленымі органамі, маглі ўносіць у навучальныя планы і праграмы неабходныя змены, з наступным зацвярджэннем такіх зменаў Народным Камісарыятам Асветы. Прафесіянальныя школы павінны былі валодаць адпаведнымі спецыяльнасцям школы вучэбна-дапаможнымі ўстановамі, такімі як навучальныя і вытворчыя майстэрні, навучальныя гаспадаркі, кабінеты і г. д. Навучанне ў іх праводзілася бескаштоўна [160, арк. 38].

Тэрмін навучання ў прафшколах усталёўваўся, у залежнасці ад спецыяльнасці, Народным Камісарыятам асветы, па ўзгадненні з зацікаўленымі ведамствамі. Прафшколы ўтрымліваліся на сродкі:

- асігнуемыя мясцовымі выканаўчымі камітэтамі па мясцоваму бюджэту;
- якія атрымлівалі ад зацікаўленых гаспадарчых прадпрыемстваў, арганізацыяў і ўстаноў;
- якія атрымлівалі ад вытворчай дзейнасці школы;
- іншых паступленняў [145, арк. 9-10].

Што тычыцца непасрэднага кіравання прафесіянальнымі школамі, то яно ўскладалася на заведуючага, аднаасобна адказнага за стан і дзейнасць школы. Заведуючы прафшколай прызначаўся адпаведным аддзелам народнай адукацыі, па дамове з зацікаўленымі ведамствамі, з асоб, якія валодалі спецыяльнай тэхнічнай адукацыяй не ніжэй за тэхнікум адпаведнай

спецыяльнасці, а таксама практычным педагагічным стажам не менш за тры гады [78, арк. 33].

Для абмеркавання і высвятлення пытанняў, якія тычыліся як вучэбнага, так і адміністрацыйна-гаспадарчага жыцця прафесійна-тэхнічнай школы ўтвараецца савет школы, пра які ішла гаворка ў папярэднім раздзеле. Пастановы савету праводзяцца ў жыццё заведуючым прафесіянальнай школай. У выпадку нязгоды заведуючага з пастановай савету, яму прадстаўлялася права прыпыняць правядзенне такой пастановы ў выкананне, пераносячы пытанне ў адпаведны мясцовы орган народнай адукацыі, у вядзенні якога знаходзілася школа [78, арк. 34].

Выкладчыкамі прафесіянальна-тэхнічных школ (агульнаадукацыйных і спецыяльных прадметаў і інструктарамі вытворчага навучання) маглі быць прызначаны асобы, якія атрымалі спецыяльную падрыхтоўку ў педагагічных вышэйшых навучальных установах або тэхнікумах па адпаведнай спецыяльнасці. У выключных выпадках, з дазволу адпаведных аддзелаў народнай адукацыі, маглі быць дапушчаныя да выкладання ў прафесіянальна-тэхнічных школах асобы, якія не задавальняюць названым патрабаванням, але якія мелі працяглы педагагічны або вытворчы стаж [78, арк. 35].

На першы курс прафшкол прымаліся ў парадку асаблівых правілаў, выдадзеных НКА, падлеткі абодвух полаў не маладзейшы за 14 гадоў з падрыхтоўкай у аб'ёме не ніжэй першай прыступкі. Кожная прафшкола распрацоўвала на аснове выдадзеных тыпавых статутаў асаблівы статут дадзенай школы, які зацвярджаўся адпаведным выканаўчым камітэтам і рэгістраваўся Наркаматам асветы [117, арк. 56].

Вывучэнне стану прафесіянальных школ дазволіла ўстанавіць стан прафесіянальна-тэхнічных устаноў, і ўжо ў верасні 1920 г. пачала сваю працу Мінская прамыслова-эканамічная школа, створаная на базе камерцыйнага вучылішча. У яе вучэбны план былі ўключаны заняткі па расійскай мове, гісторыі з геаграфіяй, алгебры з трыганаметрыяй, хіміі і тавараэнаўству, французскай і нямецкай мовах. Выкладалі гэтыя прадметы выкладчыкі, якія раней працавалі ў вучылішчы, такія як Пігулеўскі, Валасевіч, Энсель і інш. Дырэктарам Мінскай прамыслова-эканамічнай школы стаў Чаханаў [63, арк. 68].

У снежні 1920 г. на аснове падпісанага наркомам асветы РСФСР А. Луначарскім "Палажэння аб секцыях сельскагаспадарчай адукацыі пры губпрафадукацыі" было вырашана перадаць усе сельскагаспадарчыя школы, якія раней падначальваліся Наркамзему БССР, Галоўпрафадукацыі. Барысаўская сельскагаспадарчая школа знаходзілася побач з горадам у былым маёнтку вялікага князя Мікалая Мікалаевіча. У студзені 1921 г. у ёй навучалася

40 чалавек ва ўзросце ад 15 да 19 гадоў, галоўным чынам дзеці сялянаў. Школа мела вельмі слабую матэрыяльную базу. Адсутнічалі вучэбныя планы і праграмы, наглядныя дапаможнікі; спецыяльныя дысцыпліны не выкладаліся з-за адсутнасці выкладчыкаў. Нерэгулярна вяліся заняткі па расійскай мове, арыфметыцы, пачатковай геаметрыі, хіміі і інш. прадметах. Інспектар Галоўпрафадукацыі Чадовіч, які абследаваў гэтую школу, пісаў аб неабходнасці даслаць туды хаця б некалькі брашур. У даведцы адзначалася, што выкладчыкі і служачыя школы грошай не атрымлівалі. Ім выдаваўся толькі мізэрны паёк [63, арк. 69].

У 1921 г. у Мінску адчыніліся школы металістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, паліграфістаў, абутковай і гарбарнай вытворчасці. Вучылішчы адчыняліся і ў іншых гарадах, галоўным чынам, там, дзе захавалася база дзеючых да рэвалюцыі прафесіянальных школ: у Слуцку – металістаў, Віцебску – металістаў, друкароў, гарбарнікаў, Магілёве – будаўнікоў, Клімавічах – вучэбна-практычная майстэрня. Нядрэнная база мелася ў Лужаснянскай сельскагаспадарчай школе. Класныя памяшканні знаходзіліся ў двухпавярховым каменным доме. У некалькіх вучэбных кабінетах захавалася абсталяванне. У кабінеце фізікі – звыш 100 назваў навучальных дапаможнікаў, у геаграфічным – 61 карта. У школе таксама былі кабінеты хіміі і батанікі, чатыры вучэбныя класы, сталовыя, кухня, два спальныя пакоі, бібліятэка з 94 назвамі кніг. Гаспадарка школы мела 10 коней, 31 карову, 20 павозак, саняў, 106 дзесяцін зямлі [1, с. 188].

У сувязі з невялікай колькасцю школ, недахопам абсталявання, вучэбных дапаможнікаў, настаўнікаў у жніўні 1921 г. было прынята рашэнне зліць мінскія школы металістаў, апрацоўшчыкаў дрэва і паліграфістаў у аб’яднаную школу з трыма аддзяленнямі. Яна размяшчалася ў двухпавярховым доме з іншымі пабудовамі на вул. Серпухоўскай. Пачалося абсталяванне механічнай і дрэваапрацоўчай майстэрняў, завезлі некалькі станкоў і інструмент для ручнойкузні. Узначаліў школу інжынер Б. Сілін. Школа хутка расла і неўзабаве стала адной з вядучых прафесіянальна-тэхнічных установаў у рэспубліцы. Праз год тут навучалася 179 чал. [119, арк. 88-89].

У 1922 г. стварaецца шэраг новых прафесіянальна-тэхнічных школ, сярод іх у Віцебску – дрэваапрацоўшчыкаў і тэкстыльшчыкаў, у Магілёве, Чавусах, Горках – металістаў і інш.  Горацкая прафтэхшкола – старэйшая прафесіянальна-тэхнічная навучальная ўстанова Беларусі, пераемнік былога Горацкага рамеснага вучылішча, адчыненага ў 1878 г. (з 1918 па 1922 г. – школа II ступені). Тэрмін навучання ў школе – чатырохгадовы. Навучалася там 80 падлеткаў у слясарна-кавальскай і слясарна-мэблевай справе для абслугоўвання сельскага насельніцтва.У вучэбных майстэрнях налічвалася тры

такарныя станкі, пяць сталярных варштатаў, 25 камплектаў сталярнага інструмента, два рухавікі і іншае абсталяванне. Пазней, у 1924 г., школа атрымала дадатковае добраўпарадкаванае вучэбнае памяшканне і інтэрнат на 10 пакояў. Ёй былі перададзены для ўкамплектавання бібліятэкі 500 тамоў вучэбнай, мастацкай, грамадска-палітычнай літаратуры. На працягу многіх гадоў школай загадаваў інжынер Т. Леўшуноў. У 1926 г. – рашэннем Наркамасветы БССР Горыцкая і Клімавіцкая прафтэхшколы былі аб'яднаны ў адну з месцам размяшчэння ў Клімавічах. Падрыхтоўка тут вялася па працы па металу і па дрэве. У 1923 г. адчыняюцца Мінская школа рамесных вучняў, у Магілёве – гарбароў, у Віцебску – будаўнікоў, у Воршы – дрэваапрацоўшчыкаў, Быхаўская прафтэхшкола, вучэбна-паказальныя майстэрні ў Грабневе, Крычаве, Цяцерыне, Таўпечыцах і інш. Былі аб'яднаныя ў адну Слуцкія школы металістаў і дрэваапрацоўшчыкаў. Пасля аб'яднання ў школе займалася 130 навучэнцаў. Тут працавалі 22 выкладчыкі і абслугоўваючы персанал. Загадваў школай І. Бураў. У Мазыры пры фабрыцы "Чырвоны Кастрычнік" пачала работу школа дрэваапрацоўшчыкаў, у якой навучалася 36 чал. Ёй былі перададзены 12 варштатаў і 1 такарны станок па дрэву. У Гомелі і Жлобіне працавалі вучылішчы чыгуначнікаў, у якіх навучалася па 40 чал. Усяго да канца 1923 г. у рэспубліцы працавала больш за 40 стацыянарных прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, дзе рыхтавалі кадры кваліфікаваных рабочых і рамеснікаў галоўным чынам для выкарыстання іх у галіне народнай гаспадаркі [117, арк. 89-90; 61, арк. 56; 80, арк. 22].

У 1924 г. налічвалася 21 прафесіянальная школа: Мінская аб'яднаная школа з цэхамі метала- і дрэваапрацоўкі, прафшкола будаўнікоў з печка-каменным і малярна-будаўнічым, а таксама прафшколы друкароў, гарбароў, шаўцоў и прафесиіянальная школа, якая рыхтавала майстроў па вырабу абутку ў Мінску, прафшкола металістаў у Бабруйску, Слуцкая аб'яднаная з сельскагаспадарчым ухілам, з цэхамі метала- і дрэваапрацоўкі, Мазырская прафшкола дрэваапрацоўкі з ухілам фанернай вытворчасці, прафесіянальныя школы металістаў, будоўнікоў з аддзеламі печкавым і цяслярска-сталярным, а таксама абутковая прафшкола ў Магілёве, Аршанская прафшкола дрэваапрацоўкі, Віцебская школа металістаў, Горэцкая аб'яднаная прафшкола з цэхамі метала і дрэваапрацоўкі, прафесіянальная школа будаўнікоў і прафшкола па вырабу абутку ў Віцебску, Гарадоцкая і Чаўская школы металістаў [103, с. 36-37].

Ужо праз год, у 1925/26 навучальным годзе, колькасць прафесіянальныя школ у БССР узрасла да 31. У іх навучалася 2730 асоб і працавала 23 работнікі асветы. Па мове навучання пераважалі расійскамоўныя прафшколы, іх было 17, змяшаных – 11, а таксама 2 беларускамоўныя і 1 прафшкола на іўрыце. У

гэты час сельскагаспадарчыя прафшколы размяшчаліся ў с. Буда-Кашалёва, с. Канічы, с. Смаляны. У іх навучалася 186 навучэнцаў, пераважна мужчынскага полу (176). У тэхнічных прафесіянальных школах у двух у Віцебску, у сямі ў Мінску і па адной у Бабруйску, Горках, Гарадку, Клімавічах, Магілёве, Слуцку, Чаўсах, Крычаве атрымлівалі прафесіянальна-тэхнічную адукацыю 1742 чалавекі. Кустарна-рамесныя прафшколы працавалі па тры ў Віцебску і Мінску, дзве ў Магілёве, па адной у Мазыры, Воршы і Барысаве. 802 чалавекі вучыліся ў іх [150, с. 36-37]. У 1926/27 навучальным годзе іх налічвалася ў рэспубліцы 34, дзе навучаліся 5276 чалавек [158, с. 156-157] (паводле іншых звестак 10 з 1952 вучнямі [46, с. 265]), у 1927/28 – 29 з 2363 студэнтамі, а ў 1928/29 – 31 з 2736 навучэнцамі [46, с. 50-51].

Стыпендыі навучэнцаў прафесіянальных школ БССР вагаліся ў залежнасці ад месца навучання і спецыялізацыі. Так, напрыклад, у сельскагаспадарчай прафшколе на 1927 г. 413 вучняў з 498 ці 82,9 % атрымоўвалі стыпендыі, хаця бюджэт быў разлічаны на 383 чалавекі, а гэта значыцца, што навучэнцы прафшкол атрымалі меншую колькасць грошай, чым было першапачаткова разлічана, аднак стыпендыі атрымала большая колькасць вучнёўства. У 13 індустрыяльна-тэхнічных прафшколах у гэтым жа годзе навучалася 1502 чалавекі, 910 з якіх ці 60,6 % атрымоўвалі стыпендыі, праўда, разлічаныя на 888 асоб. Трэба зазначыць, што ў сваёй пераважнай большасці стыпендыі былі аплочаны за дзяржаўны кошт. Саматужна-рамесных прафесіянальных школ у 1927 г. налічвалася 3, у іх вучылася 204 вучні, з якіх 170 асоб ці 83,3 % атрымоўвалі стыпендыі, разлічаныя на 158 чалавек. Большасць стыпендыятаў знаходзілася на ўтрыманні дзяржавы, акрамя 5,1 %, якіх забяспечвалі стыпендыямі розныя арганізацыі, на якія быў ускладзены ўрадам дадзены абавязак. У 4 будаўнічых прафшколах з 260 вучняў 213 асоб ці 81,9 % былі забяспечаныя дзяржавай стыпендыямі, якія былі разлічаныя на 205 чалавек. У транспартнай прафшколе, у якой навучалася 59 чалавек у 1927 г. 22 вучні ці 37,3 % навучэнцаў атрымоўвалі стыпендыі [158, с. 164]. Стыпендыі ў 1927 г. на транспартных курсах, на якіх атрымоўвалі адукацыю 114 асоб, усе з іх атрымоўвалі стыпендыю ў поўным памеры, прадугледжаным Наркаматам асветы БССР [158, с. 164].

У 6 сельскагаспадарчых прафшколах на 1927 г. навучалася 498 студэнтаў, з іх 408 (81,9 %) атрымалі месцы ў інтэрнатах, разлічаныя на 372 чалавекі. З 1502 чалавек, якія атрымоўвалі адукацыю ў 13 індустрыяльна-тэхнічных прафшколах у 1927 г., месцы ў інтэрнатах атрымалі 579 асоб ці 38,5 %, аднак адміністрацыя навучальных устаноў разлічвала толькі на 377 месцаў. У 3 саматужна-рамесных прафшколах вучылася 204 асобы, з якіх у інтэрнаты былі заселеныя 126 (61,8 %) чалавекі, хаця яны былі разлічаныя на 115 асоб. У

2 будаўнічых прафшколах 90 асоб былі заселеныя ў інтэрнаты. На 6 транспартных курсах навучалася каля 342 каля чалавек, з якіх 177 атрымалі месцы ў інтэрнатах [158, с. 165].

У мастацкіх прашфколах існавала традыцыя аплаты за навучанне. Так, у 1927 г. з 1263 студэнтаў, якія падалі звесткі пра сваю аплату, толькі 224 асобы былі цалкам вызваленыя ад платы за навучанне. Астатнія 1039 чалавек штогод абавязаныя былі плаціць наступныя сумы: да 19 руб. у год – 25 асоб, ад 20 да 29 руб. – 134, ад 30 да 49 руб. – 371, ад 50 да 74 руб. – 332, ад 75 да 99 руб. – 110, ад 100 да 199 руб. – 67 [158, с. 218]. За навучанне на саматужна-рамесных курсах з 77 асоб, што падалі звесткі, у 1927 г. толькі 4 нічога не плацілі за сваё навучанне, тады як 73 навучэнца былі абавязаныя ўносіць наступныя сумы штогод: ад 20 да 29 руб. – 1 асоба, ад 30 да 49 руб. – 14, ад 50 да 74 руб. – 46, ад 75 да 99 руб. – 11, ад 100 да 199 руб. - 1. На сацыяльна-эканамічных курсах з 145 чалавек, якія падалі свае дадзеныя, 9 не плацілі за навучанне, а астатнія 136 уносілі штогадовую плату ў розных памерах. Так, да 19 руб. у год плацілі за сваё навучанне 13 асоб, ад 20 да 29 руб. – 15, ад 30 да 49 руб. – 89, ад 50 да 74 руб. – 13, ад 75 да 99 руб. – 6 [158, с. 218].

У другой палове 1920-х гг. урад рэспублікі пачаў скарачаць колькасць доўгатэрміновых прафесіянальных курсаў. Так, калі ў 1926/27 навучальным годзе прафкурсаў было 31, то ў 1927/28 годзе іх стала 30, а ў 1928/29 – 28. Праўда, нягледзячы на скарачэнне іх колькасці, лік навучэнцаў на прафкурсах рос кожны год: у 1926/27 навучальным годзе іх налічвалася 5518, у 1927/28 – 6049 і ў 1928/29 – 6191 чалавек (Дадатак Д) [46, с. 50-51].

Такім чынам, стварэнне сеткі прафесіянальных школ і курсаў у 1917-1939 гг. дало магчымасць савецкай уладзе забяспечыць адукацыяй большую колькасць падлеткаў, а таксама рабочых, якія мелі патрэбу ў дакваліфікацыі. Прафшколы і курсы з’яўляліся ніжэйшымі прафесіянальна-тэхнічнымі ўстановамі, якія рыхтавалі кваліфікаваных рабочых для прамысловасці па розных спецыяльнасцях. Аднак, нягледзячы на пашырэнне сеткі прафесіянальных школ і курсаў, на рост колькасці іх навучэнцаў, прамысловасць БССР не было цалкам забяспечаная кадрамі з прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй. Таксама нягледзячы на намаганні савецкіх уладаў удасканаліць навучальны працэс шляхам выдавецтва тыповых праграм і навучальных планаў для прафесіянальных школы і курсаў, навучанне ў іх заставалася лакальным, бо абапіралася не толькі на спецыфіку спецыяльнасці, якую атрымоўвалі навучэнцы ў прафшколах і на прафкурсах, але і на мясцовыя асаблівасці, звязаныя з месцазнаходжаннем школы, сродкамі, на чые яна працавала, спецыфікай памяшкання і абсталявання, калі яно было.

## 3.3. Арганізацыя працы тэхнікумаў

Тэхнікумы з’яўляліся важнай адзінкай у структуры прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў 1920-1930-х гг. Яны былі неабходныя для стварэння базы рабочых сярэдняй кваліфікацыі, якія маглі б кіраваць працэсам на малых прадпрыемствах.

Арганізацыя вучэбнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах першай паловы 20-х гг. адбывалася на падставе “Палажэння аб тэхнікумах”, зацверджанага калегіяй Галоўпрафадукацыі РСФСР у ліпені 1920 г. Другі раздзел гэтага дакумента быў прысвечаны вучэбнай працы тэхнікумаў. Згодна з ім, працягласць курса навучання дзённага тэхнікума была вызначана ў 4 гады. На першым курсе вывучаліся агульнаадукацыйныя прадметы, а на астатніх трох — спецыяльныя. Час навучання ў вячэрніх тэхнікумах быў вызначаны ў 6 гадоў. Курс навучання ў ім таксама падзяляўся на канцэнтры. Сістэма выкладання прадметаў, іх аб’ём і размеркаванне па семестрах павінны былі вызначацца на месцах [20, арк. 6]. Такім чынам, у “Палажэнні аб тэхнікумах” былі акрэслены такія важныя складальныя навучальнага працэсу, як працягласць навучання і спецыялізацыя кожнага з яго этапаў.

Тым не менш названы дакумент быў у асноўным арыентаваны на тэхнікумы, якія рыхтавалі інжынераў і тэхнікаў для вытворчасці. Ён не мог задаволіць тэхнікумы іншых, нетэхнічных спецыяльнасцяў. Таму Народны камісарыят земляробства БССР, у веданні якога ў той час знаходзіліся ўсе сельскагаспадарчыя ўстановы, 20 снежня 1922 г. зацвердзіў “Палажэнне аб сельскагаспадарчым тэхнікуме”. Згодна з ім, працягласць навучання ў сельскагаспадарчых сярэдніх спецыяльных навучальных установах была вызначана ў тры гады. За гэты час патрэбна было падрыхтаваць кваліфікаваных працаўнікоў па асобных галінах сельскай гаспадаркі [99, арк. 30].

Вучэбныя планы, як правіла, складаліся ў саміх тэхнікумах на аснове планаў дарэвалюцыйных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і адлюстроўвалі спецыфічныя асаблівасці амаль што кожнай з іх. Выкладчыкі самі складалі праграмы адпаведна ўзроўню ведаў навучэнцаў, мясцовым умовамі і на аснове свайго ўласнага вопыту. Акрамя таго значная частка тэхнікумаў Савецкай Беларусі выкарыстоўвала вучэбныя планы тэхнікумаў РСФСР. Так, у Мінскім рабочым тэхнікуме ў названы перыяд за аснову для складання навучальных планаў былі ўзяты планы Маскоўскага будаўнічага палітэхнікума і Ленінградскага будаўнічага тэхнікума [57, с. 14].

Адной з галоўных праблем пры арганізацыі навучання быў розны адукацыйны ўзровень студэнтаў, у асноўным нізкі. Згодна з “Палажэннем аб тэхнікумах” 1920 г., у навучальныя ўстановы маглі прымацца асобы, “якія

прайшлі не менш 2-х гадоў навучання ў школе II ступені ці атрымалі спецыяльную падрыхтоўку, а таксама рабочыя, якія па сваім развіцці паспяваюць за курсам" [20, арк. 6]. Такая няясная і неакрэсленая фармуліроўка правіл прыёму дазваляла прымаць у тэхнікумы амаль што ўсіх, хто мог чытаць і пісаць. Так, у аб'яве аб прыёме ад 1921 г. у Мінскі рабочы тэхнікум гаварылася, што для залічэння на I курс тэхнікума трэба ўмець пісаць, чытаць і быць знаёмым з 4-ма правіламі арыфметыкі - складанне, адыманне, множанне і дзяленне [3, с. 6]. Зразумела, што са студэнтаў з такім адукацыйным узроўнем было цяжка, амаль што немагчыма падрыхтаваць праз тры з паловай гады кваліфікаваных тэхнікаў, а праз пяць гадоў — інжынераў, як гэта было запісана ў мэтавай устаноўцы тэхнікума.

У сувязі з тым, што значная частка залічаных на першы курс тэхнікума была малаграматнай, прыходзілася траціць удвая больш часу на засваенне вывучаемых імі прадметаў. У многіх тэхнікумах амаль што паў гады неабходна было паўтараць школьную праграму. Некаторыя курсы выкладчыкі вымушаныя былі праводзіць па некалькі разоў. Так, напрыклад, у 1921/22 і ў 1922/23 навучальных гадах з-за дрэннай падрыхтаванасці навучэнцаў у Беларускім рабочым тэхнікуме каля 30 % ад усяго ліку вучэбных прадметаў паўтараліся два разы [3, с. 31]. Праблемы слабой падрыхтоўкі навучэнцаў і перагружанасці вучэбных праграм тычыліся ўсіх тэхнікумаў у акрэслены перыяд. Па падліках, на паўтарэнне школьных правілаў граматыкі і арыфметыкі ў 1920-1923 гг. навучэнцы трацілася ад 18 да 35 % усяго вучэбнага часу першых курсаў тэхнікумаў [83, арк. 11; 112, арк. 4].

Наступны 1923/24 навучальны год паклаў пачатак больш арганізаванай і планамернай працы ў тэхнікумах. У гэты час былі распрацаваны вучэбныя праграмы, пачало паляпшацца матэрыяльнае забеспячэнне навучальных устаноў, што ў сваю чаргу дало магчымасць удасканаліць абсталяванне майстэрняў, кабінетаў і лабараторый, зрабіць умовы навучання больш-менш здавальняючымі. Асабліва складаным было становішча з арганізацыяй вучэбнага працэсу ва ўстановах педагагічнай сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Педагагічныя тэхнікумы да 1923 г. не мелі свайго распрацаванага палажэння, як

індустрыяльныя і сельскагаспадарчыя, хоць і з'яўляліся самай шматлікай групай тэхнікумаў таго часу. Важным крокам у распрацоўцы і арганізацыі навучальнай дзейнасці дадзеных тэхнікумаў з'явілася стварэнне 23 снежня 1923 г. пры Галоўпрафасветы БССР пастаяннай камісіі для разгляду пытанняў метадалогіі, вучэбных планаў і праграм для педагагічных навучальных устаноў. Вынікам працы названай камісіі стала распрацоўка і прыняцце "Палажэння для педагагічных тэхнікумаў". У ім структура вучэбнага працэсу ў навучальных установах гэтага тыпу выглядала наступным чынам:

курс навучання доўжыўся чатыры гады, першыя два гады навучання ў педтэхнікумах павінны былі даць слухачам агульную адукацыю з педагагічным ухілам, апошнія два гады навучання — педагагічныя веды. Летні семестр на кожным курсе адводзіўся для сельскагаспадарчай практыкі. Спецыялізацыя на школьным і дашкольным аддзяленнях пачыналася на IV курсе [92, арк. 214].

У маі 1923 г. калегія Галоўпрафадукацыі НКА БССР зацвердзіла правілы прыёму слухачоў у педагагічныя тэхнікумы. У іх больш канкрэтна, чым у папярэдніх дакументах, былі акрэслены патрабаванні да паступаючых і падняты патрабаванні да ўзроўню адукацыі. Так, стаць студэнтам педтэхнікума можна было толькі маючы веды за сямігадовую школу [95, арк. 11].

На 1924 г. налічваецца 3 індустрыяльныя тэхнікумы: Мінскі тэхнікум з дарожна-будаўнічым аддзелам, Віцебскі электра-механічны і Магілёўскі механічны з сельскагаспадарчым і машынабудаўнічым ухіламі тэхнікумы, - 2 прамыслова-эканамічныя ў Мінску і Віцебску кожны, медыцынскія тэхнікумы ў Магілёве, Віцебску і Мінску (праўда, у 1924 г. у іх не было прыёму навучэнцаў), Мінску музычны, Віцебскі мастацкі тэхнікумы і Маскоўская Беларуская драматычныя студыя з беларускім і яўрэйскім аддзеламі, якая з'яўлялася мастацка-музычным тэхнікумам [103, с. 34-36].

У 1925/26 навучальным годзе на тэрыторыі БССР дзейнічалі 25 тэхнікумаў, у якіх навучаліся 4171 чалавек і працавала 397 работнікаў асветы. Медыцынскія тэхнікумы засталіся толькі ў Віцебску і Магілёве. Два педагагічных былі адчыненыя ў Віцебску, тры ў Мінску, а таксама па аднаму ў Магілёве, Барысаве, Мсціслаўлі, Полацку і Рагачове. Усяго 11. Сельскагаспадарчыя тэхнікумы працавалі ў Барысаве, Мінску, Магілёве, Полацку, с. Чырвоны Бераг і с. М. Горка. Акрамя таго ў Віцебску працягвалі працу індустрыяльна-тэхнічны, сацыяльна-эканамічны, музычны і мастацкі, а ў Мінску - архітэктурна-будаўнічы і музычны тэхнікумы [150, с. 36-37].

Праблема кантролю ведаў студэнтаў тэхнікумаў вырашалася праз увядзенне абавязковых залікаў па вызначаным мінімуме прадметаў, якія праводзіліся ў канцы кожнага трыместра. Слухачы, не выканаўшыя гэтага мінімуму, заставаліся на паўторны курс ці адлічваліся. Адзнака паспяховасці пры правядзенні залікаў праводзілася па трохбальнай сістэме — "здавальняюча", "нездавальняюча" і "вельмі здавальняюча". У 1923/24 навучальным годзе па выніках залікаў з тэхнікумаў рэспублікі былі адлічаны 540 чалавек (11 % ад агульнага ліку студэнтаў), 234 — з першага курсу (каля 20% студэнтаў першага курсу) [161, арк. 214]. Так, з Віцебскага электрамеханічнага тэхнікума пасля першага семестра ў 1923/24 навучальным годзе было адлічана 18 чалавек, што склала каля 10 % ад усёй колькасці навучэнцаў [119, арк. 253]. Праведзеныя ў 1923/24 навучальным годзе залікі

паказалі, што лік студэнтаў тэхнікумаў рэспублікі, якія атрымалі па іх выніках добрыя і здавальняючыя адзнакі, вагаўся ад 46 да 67 % у залежнасці ад навучальнай установы [161, арк. 164; 84, арк. 1; 121, арк. 34].

Рашэннем бюро ЦК КП(б)Б у ліпені 1924 г. для агульнага кіраўніцтва прыёмам у ВНУ, рабфакі, тэхнікумы і прафесійныя школы была створана Цэнтральная прыёмная камісія пры Галоўпрафадукацыі БССР. Пры прыёме ў тэхнікумы БССР у жніўні 1924 г. абітурыентам прапанавалася здаваць два пісьмовыя экзамены. Так, згодна са справаздачай Магілёўскага педтэхнікума аб наборы слухачоў, у 1924 г. на першы курс было залічана 35 чалавек, з іх — 11 чалавек, вытрымаўшых экзамены, астатнія 24 чалавекі былі прыняты па рэкамендацыях партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый. З 42 чалавек, залічаных у 1924 г. у Бабруйскі педагагічны тэхнікум, 27 вытрымала іспыты і 15 чалавек было прынята без іспытаў [59, арк. 5]. Па звестках аб выніках прыёмаў у розныя тэхнікумы рэспублікі ў 1924-1925 гг., лік паступіўшых праз паспяховую здачу экзаменаў раўняўся 61 % ад агульнага ліку залічаных [121, арк. 77]. Нягледзячы на даволі значны працэнт рэкамендаваных кампартыяй, камсамолам, прафсаюзамі і НКА, якія прымаліся без іспытаў, правядзенне ўступных экзаменаў спрыяла паляпшэнню адбору больш падрыхтаванага кантынгенту студэнтаў. З 1924 г. ва ўсіх тэхнікумах БССР неабходнай умовай пры паступленні стала наяўнасць у абітурыента пасведчання аб заканчэнні сямігадовай школы.

Вынікам зробленых захадаў для паступаючых стала павышэнне паспяховасці студэнтаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у наступныя гады. Так, акадэмічная паспяховасць навучэнцаў I курса Магілёўскага індустрыяльнага тэхнікума ў 1924/25 навучальным годзе была на 31 % большая, чым за аналагічны перыяд мінулага навучальнага года. У Мінскім педтэхнікуме гэты паказчык у параўнанні з мінулым годам узрос на 18 % [58, арк. 179]. Увогуле, па няпоўных звестках за 1924/25 навучальны год колькасць студэнтаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія атрымалі добрыя і здавальняючыя ацэнкі была на 16 % большай, чым у 1923/24 навучальным годзе [91, арк. 6].

Пры разглядзе пытання арганізацыі навучання ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах асобнае месца займаюць іх вучэбныя планы. Змест вучэбных планаў першай паловы 20-х гг. складаўся з трох цыклаў прадметаў: агульнаадукацыйных, агульнаспецыяльных і спецыяльных. Агульнаадукацыйныя прадметы ў гэты перыяд займалі ад 30 да 37 % ад усяго вучэбнага часу. Такое становішча, было ў першую чаргу звязана з нізкім адукацыйным узроўнем паступаючых і неабходнасцю паўтарэння шэрага названых дысцыплін. Колькасць агульнаспецыяльных прадметаў у сярэднім па

тэхнікумах усіх тыпаў рэспублікі раўнялася 37-38 %. Спецыяльным жа прадметам у вучэбных планах было адведзена 25-30 % часу. Гісторыя і грамадазнаўства ў навучальных планах складалі ад 3 да 4 % часу навучання [112, арк. 15].

Пры складанні вучэбных планаў тэхнікумаў шмат увагі надавалася выкладанню прадметаў грамадазнаўчага цыкла. Згодна з пастановай СНК РСФРС ад 4 сакавіка 1921 г., ва ўсіх навучальных установах краіны ўводзіўся мінімум па вывучэнні грамадскіх навук. У яго ўваходзіла вывучэнне курсаў гістарычнага матэрыялізму, класавай барацьбы, капіталізму і пралетарскай рэвалюцыі, Кастрычніцкай рэвалюцыі і яе прычын. Варта адзначыць, што з пералічаных прадметаў у тэхнікумах БССР у першай палове 20-х гг. XX ст. вывучаліся гістарычны матэрыялізм, класавая барацьба, эканамічная геаграфія і палітэканомія. З 1924/25 навучальнага года ў вучэбных планах тэхнікумаў адбыліся змены. У іх быў павялічаны грамадска-гістарычны цыкл прадметаў. Колькасць гадзін адзначаных дысцыплін у вучэбных планах павялічылася ў параўнанні з 1920-1924 гг. у 3-4 разы і займала 8-15 % ад усяго вучэбнага часу [128, арк. 64].

У педагагічных тэхнікумах была павялічана колькасць гадзін на выкладанне спецыяльных педагагічных дысцыплін. Змены закранулі і вучэбныя планы індустрыяльных тэхнікумаў. У вучэбных планах палітэхнікумаў было ўзмоцнена выкладанне курса эканомікі адпаведнай галіны прамысловасці. Адначасова павялічвалася практыка (да 101 гадзіны ў месяц). Цыкл агульнаадукацыйных прадметаў у 1924-1928 гг. вагаўся ад 19 да 28 % ад усёй колькасці прадметаў у залежнасці ад спецыфікі тэхнікума. Агульнаспецыяльныя прадметы складалі 28-45 %, а спецыяльныя дысцыпліны — 34-44 % усіх прадметаў адпаведна [119, арк. 126]. У названы перыяд лік прадметаў тэхнікумаў папоўніўся за кошт увядзення ў склад вучэбных праграм гадзін па фізічнай культуры. Студэнты павінны былі наведваць заняткі па фізічнай культурай 2 разы на тыдзень.

Для ўсталявання адзінства паміж рознымі ступенямі школ і шырокага прыцягнення рабоча-сялянскай моладзі ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы НКА БССР у 1927 г. дазволіў правядзенне безіспытнага прыёму асоб, закончыўшых у 1926/27 навучальным годзе сямігодкі і прафшколы. Пры гэтым, скончыўшым прафшколы давалася права першачарговасці пры залічэнні ў тэхнікумы. У выніку адзначаных змен павялічылася колькасць навучэнцаў, прынятых без іспытаў у параўнанні з мінулым годам.

У канцы 20-х гг. XX ст. адбыліся змяненні ў вучэбных планах сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Гэта было ў першую чаргу звязана з рашэннямі ліпеньскага (1928) і лістападаўскага (1929) Пленумаў ЦК ВКП(б).

Яны прызналі неадпаведнасць паміж тэмпамі падрыхтоўкі спецыялістаў і тэмпамі развіцця прамысловасці і прынялі рашэнне аб паскарэнні падрыхтоўкі спецыялістаў у навучальных установах. Для выканання гэтых задач была створана камісія, якая распрацавала спецыяльныя мерапрыемствы па вырашэнні дадзенай праблемы. НКА СССР зацвердзіла гэтыя прапановы ў снежні 1929 г. Згодна з новымі правіламі, ва ўсіх індустрыяльных тэхнікумах уводзілася бесперапынная вытворчая практыка студэнтаў на прадпрыемствах. Так, студэнты Мінскага політэхнічнага тэхнікума праходзілі практыку на тарфяной станцыі “Цна” і на сталічным заводзе “Энергія”, а студэнты Віцебскага электрамеханічнага — у на Віцебскім фанерным заводзе [121, арк. 130].

Нараўне з паскарэннем падрыхтоўкі спецыялістаў шмат увагі надавалася ідэалагічнаму выхаванню студэнтаў. Лік гадзін грамадазнаўчых дысцыплін быў павялічаны ў тэхнікумах рэспублікі на 14-16 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін. У тэхнікумах было ўведзена вывучэнне палітычнай эканоміі, гісторыі класавай барацьбы, гісторыі Усерасійскай Камуністычнай партыі бальшавікоў, асноў ленінізму, Канстытуцыі СССР і БССР. На ўроках грамадазнаўства прапрацоўваліся рашэнні партыйных і савецкіх з’ездаў, палітыка савецкай дзяржавы, пастановы кангрэсаў Камінтэрна. Так, у Мінскім палітэхнікуме ў 1929/30 навучальным годзе грамадазнаўчыя прадметы складалі каля 15 % ад вучэбнага плана [3, с. 10-11]. У Гомельскім тэхнікуме лясной прамысловасці на грамадазнаўчыя цыклы адводзілася 14 % вучэбных гадзін [84, арк. 19].

Сярод форм працы ў тэхнікумах першай паловы 20-х гг. XX ст. пераважалі лекцыі і семінарскія заняткі. Але з другой паловы 20-х гг. ішоў інтэнсіўны працэс высвятлення гэтых апрабаваных і ўсталяваных форм вучэбнай працы, якія замяняліся практычнымі і лабараторнымі заняткамі, брыгаднай прапрацоўкай вучэбнага матэрыялу і метадам праектаў. Перыяд 1924-1926 гг. можна назваць пераходным у сэнсе метадаў працы ў тэхнікумах. У гэты час у навучальных установах існавалі як лекцыйна-семінарскія, так лабараторныя і брыгадныя (калектыўныя) метады навучання. Такія сумесныя метады да красавіка 1926 г. ужываліся ў працы большасці педагагічных тэхнікумаў. Але ў 1926/27 навучальным годзе большая частка тэхнікумаў адрапартавала НКА рэспублікі аб поўным пераводзе навучання ў іх на так званы Дальтон-план. Гэта сістэма арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы будавалася ка прынцыпе індывідуальнага навучання. Тым не менш Дальтон-план, які выкарыстоўваўся ў тэхнікумах БССР у 20-я гг., адрозніваўся ад класічнага амерыканскага і ў айчыннай гістарычнай літаратуры быў больш вядомы як брыгадна-лабараторны. Паводле яго, вучні аб’ядноўваліся ў брыгады па 4-6 чалавек, якія ўзначальваліся брыгадзірамі з іх асяроддзя. Брыгады

атрымлівалі заданні, разлічаныя на тэрмін ад двух тыдняў да аднаго месяца. У заданнях указваліся паслядоўнасць працы, неабходная літаратура, прыводзіліся заданні і практыкаванні, ставіліся кантрольныя пытанні. Настаўнік не растлумачваў новы матэрыял і мог толькі кансультаваць студэнтаў у выпадку ўзнікаючых у працэсе

працы цяжкасцей. Пасля выканання ўсіх заданняў праводзіліся выніковыя заняткі, на якіх кожная брыгада давала справаздачу аб зробленай працы. У красавіку 1926 г. усе педтэхнікумы, адпаведна рашэнню штатнай камісіі пры НКА, пераходзілі на вядзенне сваіх заняткаў толькі па брыгадна-лабараторным метадзе [119, арк. 19].

Трэба зазначаць, што колькасць дзённых тэхнікумаў у рэспубліцы ў 20-я гг. XX ст. з кожным годам павялічвалася. Так, калі ў 1926/27 навучальным годзе працаваў 31 тэхнікум, то ў 1927/28 – 30, а ў 1928/29 – 28. Павялічвалася і колькасць студэнтаў, якія ў іх навучаліся: у 1926/27 навучальным годзе іх налічвалася 5518 чалавек, у 1927/28 - 6049, а ў 1928/29 - 6191. У 30-я гг. XX ст. сітуацыя змяняецца. Іх колькасць перастае расці ў геаметрычнай прагрэсіі, яна вагаецца ў залежнасці ад палітычнай і эканамічнай сітуацыі. Так, у 1934/35 навучальным годзе працаваў 31, у 1935/36 - 80, 1936/37 – 75. Праўда, нягледзячы на тое, што колькасць тэхнікумаў скарачалася, колькасць навучэнцаў у іх працягвала ўзрастаць: у 1934/35 навучальным годзе ў тэхнікумах вучылася 16742 студэнтаў, у 1935/36 іх колькасць узрасла да 20926, а ў 1936/37 да 27842 чалавек [46, с. 286].

Вялікае значанне для пашырэння работы вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установ мела пастанова ЦВК СССР ад 19 верасня 1932 г. “Аб вучэбных праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах”. Гэтай пастановай адводзілася не менш за 70 % вучэбнага часу ў тэхнікумах, не ўлічваючы вытворчай практыкі, на агульнанавуковыя, агульнатэхнічныя і спецыяльныя прадметы. Ліквідавалася шматпрадметнасць у вучэбных планах і дыферэнцыраваліся тэрміны навучання ў залежнасці ад задач навучальнай установы. Вытворчая практыка студэнтаў на прадпрыемствах і ў галіне сельскай гаспадаркі, як і раней, разглядалася як складаючая частка вучэбнага працэсу [83, арк. 32].

Трэба зазначыць, што не ўсе студэнты тэхнікумаў атрымоўвалі стыпендыі. Так, у 1927 г. сярод 772 студэнтаў 5 сельскагаспадарчых тэхнікумах толькі 461 ці 55,2 % ад усіх студэнтаў дадзеных тэхнікумаў а трымоўвалі стыпендыю. Акрамя таго, на дзяржаўным забеспячэнні знаходзіліся 95,1 % стыпендыятаў, астатнія студэнты забяспечваліся стыпендыяй з мясцовага бюджэту і бюджэтаў іншых арганізацый. У індустрыяльна-тэхнічным тэхнікуме ў 1927 г. навучалася 246 вучняў, з якіх 164 ці 66,7 % атрымоўвалі стыпендыі,

праўда, разлічаныя, на 147 асоб. Са 198 студэнтаў будаўнічага тэхнікума 123 асобы ці 62,1 % атрымоўвалі стыпендыі, разлічаныя на 101 студэнта. У транспартным тэхнікуме з 260 асоб 136 студэнтаў былі забяспечаныя стыпендыяй, пры тым, што дзяржбюджэт забяспечваў толькі 47,8 % стыпендыятаў, астатнія знаходзіліся на ўтрыманні мясцовым. У сацыяльна-эканамічным тэхнікуме ў 1927 г. навучалася 152 чалавекі, 111 з якіх ці 73% атрымоўвалі стыпендыі, якія на 89,1% былі забяспечаныя дзяржбюджэтам, а на 10,9 – прафсаюзамі. З 237 студэнтаў 2 медыцынскіх тэхнікумаў 151 асоба ці 63,7 % студэнцтва былі забяспечыныя стыпендыямі, разлічанымі на 141 студэнта. У 15 педагагічных тэхнікумах атрымлівалі адукацыю 2869 студэнтаў, 1899 ці 66,2 % з якіх былі забяспечаныя стыпендыямі, якія, у сваю чаргу, былі разлічаныя на 1621 асобу. У 2 мастацкіх тэхнікумах, у якіх навучалася 405 студэнтаў, 187 ці 46,2 % атрымоўвалі стыпендыі, разлічаныя на 174 чалавекі [158, с. 164]. Такім чынам, урад, імкнучыся забяспечыць стыпендыямі большую колькасць навучэнцаў, размяркоўваў сродкі, якія былі разлічаныя на пэўную колькасць асоб, большай колькасці студэнтаў, што ўплывала на канчатковую суму стыпендыі, якая памяншалася. Разам з тым, стыпендыямі не была забяспечаная большасць вучнёўства тэхнікумаў, так, на 1927 г. 66,6 % усіх навучэнцаў тэхнікумаў былі забяспечаныя стыпендыямі.

Акрамя таго, не ўсе студэнты былі забяспечаныя месцамі ў інтэрнатах. Так, напрыклад, у 1927 г. у 5 сельскагаспадарчых тэхнікумах навучалася 772 чалавекі, аднак месцы ў інтэрнаце атрымалі толькі 378 студэнтаў ці 49 % навучэнцаў. У індустрыяльна-тэхнічным тэхнікуме навучалася 246 студэнтаў, з іх 110 асоб ці 44,7 % былі заселеныя ў інтэрнаты. У будаўнічым тэхнікуме, у якім навучалася 198 асоб, 111 з іх ці 56,1 % атрымалі месцы ў інтэрнатах. З 260 студэнтаў транспартнага тэхнікума 142 навучэнца былі заселеныя ў інтэрнат, а са 152 асоб, што вучыліся ў сацыяльна-эканамічным тэхнікуме, 45 студэнтаў (29,6 %) атрымалі месцы ў інтэрнатах. У 2 медыцынскіх тэхнікумах на 1927 г. атрымоўвалі адукацыю 276 студэнтаў, з якіх 101 чалавеку ці 36,6 % прадставілі месца ў інтэрнаце. У 14 педагагічных тэхнікумах навучалася каля 2677 асоб, з якіх 1878 (ці 70,2 %) атрымалі месцы ў інтэрнатах, хаця разлічаныя яны былі на 1723 студэнта. У 2 мастацкіх тэхнікумах у 1927 г. навучалася 405 студэнтаў, з якіх 136 асоб ці 33, 6 % былі заселеныя ў інтэрнаты, разлічыныя на 110 чалавек [158, с. 165].

Нягледзячы на імкненне савецкай улады скасаваць плату за навучанне, некаторыя вучні тэхнікумаў працягвалі аплочваць сваю адукацыю. Так, напрыклад, з 294 вучняў, што навучаюцца ў транспартных тэхнікумах, не плацяць 275. З 19 студэнтаў, якія аплочваюць сваю адукацыю, да 19 руб. у год плацяць 9 асоб, ад 20 да 29 руб. – 6, ад 30 да 49 руб. – 2, ад 50 да 74 руб. – 2. З

405 студэнтаў, што вучацца ў мастацкіх тэхнікумах, нічога не плацяць 345 асоб. За сваё навучанне 60 студэнтаў плацяць наступныя грашовыя сродкі: да 19 руб. у год – 20, ад 20 да 29 руб. – 10, ад 30 да 49 руб. – 12, ад 50 да 74 руб. – 11, ад 75 да 99 руб. – 5, ад 100 да 199 руб. – 2 [158, с. 218].

Такім чынам, на працягу 20-30-х гг. XX ст. адбываўся актыўны працэс пошуку шляхоў арганізацыі навучання ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. У названы перыяд адбываліся частыя змены зместу вучэбных планаў, формаў і метадаў працы, правіл прыёму і кантролю ведаў навучэнцаў. Зразумела, што гэта не магло лепшым чынам адбівацца на якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Пабудова навучання ў тэнікумах адбывалася на фоне эканамічных і фінансавых цяжкасцяў першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. Уплывалі на навучальны працэс падзеі, што адбываліся ў беларускім грамадстве. Тым не менш неабходна адзначыць, што галоўная задача, якая стаяла перад тэхнікумамі, — падрыхтаваць за 3—4 гады спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі — была выканана. Аднак колькасці выпускнікоў тэхнікумаў нават у 1930-я гг. не хапала, каб забяспечыць патрэбы народнай гаспадаркі і прамысловасці ў кваліфікаваных кадрах.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Савецкая ўлада рэфармаванне сістэмы народнай асветы пачала з разбурэння старых парадкаў і ўсталявання новых. Адной з першапачатковых задач было стварэнне новай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, якая павінна была ліквідаваць царскую школу і пабудаваць новую ў адпаведнасці з патрабаваннямі і ідэалагічнымі прынцыпамі бальшавіцкай улады: усё навучанне і выхаванне павінна было падпарадкоўвацца прапагандзе ідэй сацыялізму і Камуністычнай партыі. У сувязі з палітыкай беларусізацыі, сістэма адукацыі функцыянавала як нацыянальная па мове і зместу працы, але час яе правядзення быў абмежаваны, бо ўжо ў 30-я гг. ХХ ст. пачаўся наступ на беларускамоўныя школы і нацыянальную адукацыю ў цэлым, якая павінна была ператварыцца ў савецкую. У той жа час адбывалася ідэалагізацыя ўсіх сфер грамадства, што значна ўплывала і на ўсю сістэму адукацыі, бо яна была непасрэдным выхавальнікам новага савецкага чалавека.

Сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі БССР падзялялася на 3 часткі: агульнаадукацыйную, дадатковую і палітасветную, што было звязана з тагачаснымі патрэбамі савецкай улады. Першая складаючая частка ствралася для дзяцей і моладзі, якія паступова, з пачатковай школы, атрымлівалі агульную і прафесіянальную адукацыю ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Стварэнне другой часткі сістэмы адукацыі было звязана з вялікай колькасцю непісьменных і малапісьменных дарослых у 20-я гг. ХХ ст., з неабходнасцю надання вытворчай кваліфікацыі беспрацоўным, павышэння кваліфікацыі існуючых кадраў без адрыву ад вытворчасці, а таксама падрыхтоўкі ў максімальна сціслы тэрмін новых кадраў. Апошняя частка адукацыйнай сістэмы была цесна пераплеценая з першымі двума, бо выконвала функцыю палітызацыі і ідэалагізацыі ўсіх сфер тагачаснага грамадства. Палітасветная сістэма ўключала ў сябе не толькі ўстановы, якія займаліся перавыхаваннем, але і рыхтавала кадры прафесіянальных агітатараў прапагандыстаў, кіраўнічыя кадры па партыйнай лініі.

Трэба зазначыць, што асноўным накірункам пераўтварэнняў у галіне савецкай асветы была ліквідацыя саслоўнага прынцыпу адукацыі і стварэнне працоўнай бескаштоўнай адукацыйнай сістэмы. Аднак, у сваёй большасці гэтыя задачы не былі рэалізаваныя ў 20-30-я гг. ХХ ст. Паміж асобнымі звеннямі адукацыйнай сістэмы існаваў разрыў, працавалі тупіковыя навучальныя ўстановы. Для значнай часткі насельніцтва адукацыя была платная, прынцыпы сацыяльнага адбору і сістэма ільгот для рабоча-сялянскіх колаў зачынялі дарогу да прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі прадстаўнікам іншых сацыяльных груп.

Акрамя таго, у 1920-1930-я гг. надзвычай складанымі былі адносіны савецкай улады да вырашэння кадравай праблемы. Калі першапачаткова ставілася задача перападрыхтоўкі “старых” педагагічных кадраў, то з сярэдзіны 20-х гг. ХХ ст. асноўны ціск робіцца на стварэнне новых кадраў усіх узроўняў з рабочых і сялянаў, а ў 30-я гг. ХХ ст. распачынаецца пераследаванне дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі, а таксама тых прадстаўнікоў адукацыйнай сістэмы, якія ва ўмовах распаўсюджвання палітыкі беларусізацыі выхоўвалі дзяцей і моладзь у беларускім нацыянальным духу, за што пасля былі абвінавачаныя ў т. зв. “нацдэмаўшчыне”. Яшчэ адным адмоўным фактам ва ўмовах стварэння новых педагагічных устаноў стала зніжэнне ўзроўню ведаў настаўнікаў, якія часам праслухоўвалі толькі кароткатэрміновыя курсы, таксама большасці з іх не хапала вопыту працы ў школах. Былі цяжкасці і з матэрыяльным забеспячэннем як настаўнікаў, так і дзяцей. Не хапала памяшканняў, падручнікаў, канцылярскіх прыналежнасцяў, а таксама не хапала і прафесійных настаўнікаў.

